
НАША НІВА

Беларуская газэта *Вільня №2, 1994*

ГОМЕЛЬ «...Блукаючы па Гомлі, я згадваю Дублін. Быццам гэты горад створаны адмыслова для напісаньня сваіх «Гомельцаў»... Горад, у чым жыдоўскім асяродку нараджаліся лепшыя на Беларусі расейскамоўныя паэты, а варта было ўзьнікнуць асяродку беларускаму, як адтуль зараз жа выйшаў А.Сыс...». Загадкам старога ды цяперашняга Гомля Рэдакцыя мяркуе прысьвяціць чарговы нумар «НН»

ФРАНЦУСКІ НУМАР





КАМЕНЬ, ЯКІ РАСЬЦЕ

Альбэр Камю



Машына цяжка крутанулася й вывернула на гразкую ад дажджу лятэрытавую дарогу. На ўзбочыне фары раптам выхапілі са змроку — спачатку з аднаго, потым з другога боку дарогі — дзьве драўляныя хаты, крытыя бляхай. Побач з другою, справа, скрозь рэдкі туман угадвалася збудаваная з грубых бэлек вежа. Зь яе вяршыні йшоў мэталічны трос. Нябачны ў месцы злучэньня, ён пачынаў зіхацець, трапляючы ў сьвятло фараў, і зноў зьнікаў за адхонам, які перарэзваў шлях. Машына тармазнула й спынілася за некалькі мэтраў ад хат.

Чалавек, які ўзьнік справа ад шафёра, зь відочным высілкам праціснуўся ў дзьверцы й, устаўшы на ногі, крыху захістаўся ўсім сваім магутным целам асілка. Нібы адчуваючы свой цяжар, ён стомлена стаяў у змроку побач з машынай і, здавалася, прыслухоўваўся да халастога вуркатаньня рухавіка. Потым рушыў да адхону і ўвайшоў у акрэсьлены фарамі сьветлы трохкутнік. Ён спыніўся на вяршыні схілу, і яго шырачэзная сьпіна адбілася на фоне ночы. Праз хвіліну ён азірнуўся. Над прыборным шчытком яму ўсьміхаўся падсьвечаны зьнізу чорны шафёраў твар. Чалавек падаў знак, і шафёр заглушыў матор. Адразу па-над дарогай і лесам апусьцілася вялікая, сьвежая цішыня. І скрозь гэтую цішыню пачаў далятаць шолах вады. Мужчына глядзеў на раку пад адхонам, пазначаную толькі шырокім рухам чорнае цемры, пасыпанай бліскучай луской. Яшчэ болей густы й застылы змрок удалечыні, напэўна, быў другім берагам. Добра прыгледзеўшыся, там, праўда, можна было заўважыць кволы жоўты агеньчык, як ад далёкай газьніцы.

Мужчына павярнуўся да машыны й трасянуў галавой. Шафёр пагасіў фары, зноў запаліў, і пачаў імі міргаць праз аднолькавыя інтэрвалы. Чалавек на адхоне зьнікаў і зьяўляўся зноў, здаючыся ўсё болей магутным і болей высокім пры кожным новым уваскрашэньні. Раптам ліхтар на тым беразе, узьняты нечай нябачнай рукой, некалькі разоў узьляцеў у паветра. Па апошнім знаку ліхтаршчыка шафёр канчаткова патушыў фары, і ноч адразу праглынула машыну й чалавека. Калі фары згасьлі, рака зрабілася амаль бачная, цяпер раз-пораз можна было заўважыць яе доўгія вадзяныя мускулы, што перакочваліся адзін за адным. Абапал дарогі чарнеў змрочны лясны гушчар, які ўздымаўся ў самае нёба й, здавалася, падступаў зусім блізка. Дробная імжа, што гадзінай раней прамачыла дарогу, яшчэ вісела ў паветры, робячы яшчэ цяжэйшымі цішыню й нерухомасьць, якія панавалі над гэтым вялікім прагалам сярод некранутага лесу. У чорным небе мутна дрыжалі зоркі.

Але вось з таго берагу даляцела бразгатаньне ланцугоў і ледзьве чутны плёхкат. Трос над хатаю праваруч ад чалавека напяўся, па ім з глухім скрогатам пабегла дрыготка, і ў тую ж хвіліну па-над ракою разьліўся шырокі й прыцішаны шум патрывожанае вады. Скрогат паступова зрабіўся раўнейшы, шум вады памацнеў, пачуўся выразьней, і ліхтар паволі пачаў расьці. Цяпер вакол яго можна было заўважыць цьмянае жоўтае кола. Яно патроху шырэла, потым пачало меншаць зноў, а ліхтар усё блішчаў скрозь смугу, высьвечваючы ўжо над сабой і з бакоў нешта накшталт павеці з сухога пальмавага лісьця, якую з чатырох бакоў падпіралі тоўстыя бамбукавыя жардзіны. Гэтае грубае збудаваньне, зь нейкімі няпэўнымі ценямі, што рухаліся вакол, паволі набліжалася да берагу. Калі яно было ўжо амаль на сярэдзіне ракі, у жаўцявым сьвятле выразна акрэсьліліся тры невысокія, амаль чорныя, голыя да пояса чалавечыя постаці ў востраверхіх капелюшах. Людзі стаялі нерухома, ледзь расставіўшы ногі й крыху нахіліўшыся, ураўнаважваючы магутнае цячэньне ракі, што напінала сваімі нябачнымі водамі ў бок вялікаму нязграбнаму плыту, які

Працяг на старонцы 4

Дзёньнік прыватнага чалавека



Гэты верш застаўся на маім пісьмовым стале ў рэдакцыі на Жыгімонта 12/2 ад чалавека, які пакінуў Вільню назаўсёды. Аматарскі, нязграбны, шкалярскі вершык прагучаў адзіным эпілёгам шматвяковага йснаваньня нацыі разам зь Вільняй.

На вулках места ўжо не сустрэнеш менчукоў, якія прыехалі на дзянёк — пасядзець у бібліятэцы ці ва ўтульнай кавярні, ці паблукаць паміж Замкавай ды Завальнай. Ня ведаю, ці надоўга, але слова прамоўленае, фінальны акорд прагучаў, непрыступнай заслонай паўстала мяжа. Чалавек зь Беларусі будзе цяпер блукаць па Вільні пераважна ў кнігах, адзначаючы для сябе галоўныя адрасы нацыянальнай гісторыі — першай беларускай кнігі й першай газэты, першай партыі й першай гімназіі...

Некалі тут пісалі свае аматарскія, недасканалыя, шкалярскія вершы паэты першай велічыні: Купала, Багдановіч, Гарун... Гэта былі вершы вітаньня, а не разьвітаньня. Але пісалі яны таксама «примитивно», як сказаў бы адзін літаратурны патрыярх, «непісьменнай прастацкай гутаркай», — як сказаў бы другі. I выходзіла ў іх жывое, бо без разьліку ці то на званьне, ці на грошы, ці нават на ўсенародны ўзлым. Ня мелі яны крапівоўскіх моўных нарматываў, а разам зь імі — досьведу гладкапісаньня, крывадушнасьці ды іншых прафэсійных якасьцяў кваліфікаваных паэтаў. Цяпер так пішуць, бывае, хіба пачаткоўцы — пакуль не пачуюцца сапраўднымі беларускімі паэтамі, упэўненымі ў мове, літаратуры й сабе.

Пасьля нашаніўцаў Вільню віталі Арсеньнева, Жылка, Танк. Усе яны прыяжджалі сюды. Каб тут адбыцца. Гэты — выяжджае. Ён разьвітваецца назаўсёды.

Вось чаму мы ня сталі аддаваць гэты верш рэдакцыйнаму праўшчыку. Хай застанецца такі — «прастацкі» і нашаніўскі. Адзіны водгук нацыі на разьвітаньне з калыскай свайго нацыянальнага жыцьця.

З 1 сакавіка прыехаць сюды можна як у Бэрлін, Парыж ці Рым. Хіба што тэарэтычна Вільня бліжэй — 180 км ад Менску. Але ў палітыкаў свае рэзоны. Ім трэба гэтая мяжа. Хоць толкам і яны ня скажуць — навошта. Мабыць, проста так — каб было. Ці таму, што ніколі не было (дзіўная лёгіка ў палітыкаў). Народам мяжа ня трэба, але сёньня яны й самі толкам ня ведаюць, чаго ім *ня трэба*. Культурам патрэбнае бязьмежжа, але што яны могуць, калі ўсё ўрэшце вырашаюць палітыкі!

Імя аўтара гэтага верша я не называю — міліцыянты СНГ шукаюць яго цяпер на тэрыторыі ад Буга да Курыл. Сьледам за сваім вершам ён і сам ператварыўся ў мэтафару жывога беларускага духу, які колькі сябе помніць — вечны андэграўнд. Нараджаецца зь нічога, бунтуе маладыя арганізмы, прымушае іх пісаць вершы і, нарэшце, па легалізацыі носьбіта, зноў кудысьці зьнікае. Назаўсёды...

РАЗЬВІТАНЬНЕ ЗЬ ВІЛЬНЯЙ

Такія месты проста так не пакідаюць,
Зь іх адыходзяць з Богам хто, а хто з баямі
За іх, галовы і паэмы ім складаюць,
Мне ж толькі гонар разьвітацца выпадае.

Да пабачэньня, гаспадыня пані Вільня,
Я разумею Вас ужо без перакладу,
Я шмат казаў, і вось мы не дагаварылі,
Do zobaczenia. До свиданья. Viso gero.

Бягу з падмосткаў антыкварных тратуараў
За домам дом, за храмам храм здаю бяз бою,
Ўздоўж дэкарацыяў усечасовага тэатру,
Дзе не сыграў ні акупанта, ні героя.

Да пабачэньня, вельмі стары стары горад,
Людзей вялікіх і падзей маўклівы сьведка,
Не аднаго ты памятаеш Бога,
I Бог вайны цябе прыгадываў нярэдка.

Я ўжо ня зблытаюсь у пошуках сьвятыні,
Якой маліцца ў час падзякі ці навалы,
Мне верыць нельга, але верце, будзе скінут
Мой капялюш за сотні вёрст ад Вострай Брамы.

Да пабачэньня, праважаць мяне ня трэба,
Мне ўжо ня зьбіцца ў лябірынце тых завулкаў,
Але на ўсё жыцьцё застанецца патрэба
Той шлях прайсьці у адваротным накірунку

P.S.

Хай не хапаў я зорак зь віленскага неба
I пры ад'езьдзе маю не геройскі выгляд,
Але на старасьць ёсьць для выхваленьняў тэма,
Што і ў маім жыцьці быў «віленскі пэрыяд».

* * *

Яшчэ слаба ўсьведамляючы гэта, Беларусь спакваля ўваходзіць у новыя часы свайго йснаваньня — часы замглёнай гістарычнай пэрспэктывы, расплывістых крытэрыяў і няясных мэтаў. Дармовая, нічым не аплочаная, ня выпакутаваная незалежнасьць аддаецца гэтак жа лёгка й безаплатна, як і далася. Гэтаму спадарожнічае хіба што некаторае замяшаньне ў шэрагах незалежнікаў, некаторае непаразуменьне. Так бомж, якому раптам дазволілі пажыць у камфортных апартамэнтах, пакідае іх са шкадаваньнем, зь непаразуменьнем увачччу, але й без супраціву. Ён расстаецца зь дзівам і таму не пытаецца, чаму яго зноў выкідаюць на вуліцу.

Дзіва незалежнасьці й праўда незалежнасьці — розныя рэчы. Можна, вядома, верыць, што дзіва нейкім чынам ператворыцца, перарасьце, перайначыцца ў праўду. Многім такая вера замяняе самую дзейнасьць. Але, як кажуць, спадзявайся на лепшае, а разьлічвай на горшае. Спадзеў — рамантычны, а разьлік — гэта ўжо прагматыка.

Нельга сказаць, што беларускія незалежніцкія сілы разьлічваюць магчымасьці свайго новага падпольля. Але нельга сказаць таксама, што разьвіцьцё падзеяў у Менску ды Маскве ўсяляе хоць нейкую надзею на штосьці іншае. Вядома, каму хочацца думаць пра тое, што Беларусь яшчэ не атрымала сваю сапраўдную незалежнасьць, і пра тое, колькі сапраўдная будзе каштаваць!

I ўсё ж паспрабуем разьлічваць на горшае, на тое, што заўтра незалежніцкія сілы, чыя дзейнасьць сёньня — «ва ўмовах незалежнасьці» — так часта выглядае на недарэчнае палітыканства (незалежнічаюць, панімаеш, у незалежнай краіне!), — што заўтра яны вернуцца да свайго падспуднага чыну. Разьлік мусіць палягаць на тым, каб сёньня зрабіць тое, што заўтра зрабіць будзе цяжэй або немагчыма.

Першае, што ў такой сытуацыі кідаецца ў вочы — гэта ўсё большая раздробленасьць беларускіх незалежнікаў. Яны ўваходзяць у паласу замглёнай гістарычнай пэрспэктывы паасобку, у лепшым выпадку — папартыйна. Хутчэй за ўсё й яднацца ім давядзецца ў часы расплывістых крытэрыяў, што запатрабуе неверагодных высілкаў, энэргіі й часу, пакуль з мары-незалежнасьці, якая ўжо сёньня ня лучыць нікога, ня вырабіцца незалежнасьць-мэта.

Адзінай канстантаю, якая зможа злучыць незалежніцкія шыхты, стаць перадумоваю іхняга яднаньня, полем су-польнасьці зьяўляецца беларуская мова, дакладней адзіны правапіс. Калі й заўтра сотні ўлёткаў, падпісных лістоў, газэтаў, часопісаў, кніжак, радыё- й тэлепраграмаў ды іншага ўсяго, што прадстаўляе незалежніцкія сілы, будзе як і сёньня друкавацца дваццацьцю правапісамі, канстанты не атрымаецца. Хто ведае, якая доля няўдачы за ўсю гісторыю беларускага незалежніцтва кожнага разу прыпадала на адсутнасьць адзінага правапісу?

Той правапіс, які прапануе сёньня невядома кім абраная ці прызначаная камісія, ня будзе прыняты цэлай групай незалежніцкіх выданьняў, у т.л. і «Нашай Нівай». I рэч тут ня ў мяккіх знаках, а ў элемэнтарным недаверы да складу кабінэтнай камісіі, якая заўсёды будзе працаваць на афіцыёз — сёньня «сувэрэнны», заўтра «прарасейскі», пасьлязаўтра яшчэ пра-які-небудзь. Гэтая камісія — толькі шырма тае працы, якую за шырмай ня робіць ніхто.

У гэткіх умовах мы мусім падумаць пра нараду незалежніцкіх сілаў, якая адбудзецца ў Менску й зьбярэ прадстаўнікоў усіх сапраўды незалежніцкіх выданьняў і мовазнаўцаў. Мы мусім мець на руках выніковы дакумэнт гэтае нарады, які й будзем выконваць. У моўнай справе нам спатрэбілася тое, што ў палітыцы называюць «урадам народнага даверу». Ня так густы й кампрамісы, як узаемны давер ёсьць галоўнай падставаю дзеля выкананьня прынятага дакумэнту ўсімі, дзеля будучага яднаньня ўсіх незалежнікаў.

Але гэта трэба зрабіць сёньня. Бо заўтра час для названае канфэрэнцыі можа быць ужо неспрыяльны.

Тапаграфіі

ВАЎЧЫНЫЯ СЬЦЕЖКІ

Сяржук Вітушка

Часта дзеля вандровак выбіраеш наўмысна самыя глухія куты. Бывае даводзіцца прадзірацца да мэты амаль што ваўчынымі сьцежкамі. Затое ў такіх мясьцінах заўсёды натрапіш на якіясь рэліктавыя цікавосткі.

Калі дапытлівы чытач не палянуецца й зірне на мапу, то непадалёк ад Вільні паміж Вяльлёю й чыгункай на Менск пабачыць зялёную пляму амаль не засьмечаную кропкамі населеных пунктаў. Гэта — рэшткі колішняй Лаварыскай пушчы, мясьціна зь ляснымі чашчобамі й ляндшафтамі незвычайнай прыгажосьці. Тамтэйшыя жыхары яшчэ й дагэтуль кажуць на гэтыя лясныя абшары — пушчавы лес. Цывілізацыя нейкім дзіўным чынам яшчэ не пасьпела разбурыць дзікае маляўнічасьці гэтага куточка. Так сталася можа быць таму, што праз гэтыя лясы пралягае мяжа паміж Літвою й Беларусяй. Сталічнаму начальству, відаць, не было асаблівае справы да гэтых правінцыйных узьмежкаў. Вось і атрымаўся запаведнік. Тут, сярод дзіўных старадаўніх лясоў людзі яшчэ баяць дзіўныя гісторыі. Пару такіх я запісаў ад дзядука Міхала Данюша зь вёскі Кланішкі Астравецкага раёну.



«Паехаў я тамака ў лес, там, аж пад Катлоўку. Асіны там былі напілаваныя, так хацеў кавалак асіны прывязьці на начоўкі. Як напалі ваўкі, як напалі ваўкі! А ёш тваю... Холадна было, у санях дыван быў, так я ўкруціўся, каб ваўкі мяне ня зьнюхалі. А кабылка мая, белая такая была, так зьелі ваўкі кабылку начыста, толькі косьці тамака. Адзін воўк суне галаву ў хамут, суне галаву ў хамут, так я таргануў за лейцы — укілзаў гэтага ваўка й тады, брат, палкай, палкай ваўку. А гэтыя ваўкі, можа зь дзесяць іх там было, з тылу даганяюць, даганяюць, а я гэтаму палкай, палкай, і тады, брат, паехаў. Ну як лес кончыўся засталіся тыя ваўкі ў лесе. Так я толькі на гэтым адным ехаў і ехаў. Як толькі лес які побач, так ён і кіруецца да лесу, а я таргану яго. I так дарогай ехаў, ехаў, да Вароны скіраваў, там на Быстрыцу. Прыехаў у Быстрыцу, як справіў крык: «Людзі, ратуйце!» Наляцела людзей ваўка глядзець, што гэта за воўк такі. Ну й забілі гэтага ваўка. Скуру зьдзёрлі, прадалі, водкі выпілі, ну й разыйшліся...

А другі раз таксама гісторыя была. Ішоў я ў Быстрыцу, роў там такі ёсьць. Я іду праз гэты роў — гляджу воўк ляжыць. Так я абжэргаў яго, а ён гоц! Так я за вушы цап, так во сьціснуў яго за вушы, а вушы вялікія ў ваўка. Тады нагамі пад бакі, нагамі пад бакі яму. Ён як скочыў гэты воўк, а ёш тваю! Я яго за вуха тармашу, не пускаю ў бок, прама, дарожкай толькі каб ляцеў. Ляцеў, ляцеў ён, праз рэчку — чабух, чабух, не глыбока так было. Прыляцеў у Быстрыцу... Забілі таго ваўка, таксама забілі».

У гэтых жа мясьцінах пачуў я яшчэ адну падобную гісторыю. Гэтым разам ужо пра кабету. Зайшла, маўляў, тая ў хлеў, а там воўк залезшы быў. Ён як сігане ўцякаць, але, небарака, ублытаўся бабе ў спадніцу й павёз яе...

Зьдзівіўся я спачатку гэтым мясьцінам, людзям ды іхным гісторыям — жывуць сабе ў пушчах, на ваўках гойсаюць. а потым падумаў. А можа гэта наш народны цырк ці нацыянальны спорт. Трэба будзе яшчэ раз паехаць у той пушчавы лес на ваўчыныя сьцежкі — можа й мне пашэньціць пракаціцца.

ШТО ПІШУЦЬ?

Чым далей назіраю за беларушчынай, тым больш яна мне нагадвае эспэранта — і па мэнтальнасьці сваіх носьбітаў, і па месцы ў грамадзтве, і па ігнараваньні яе праз моўны імпэрыялізм, па адносінах да яе з боку дзяржавы («сваёй»), нават па тыражах. Апошняе, што мяне ўцьвердзіла ў гэтым перакананьні — гэта калядны нумар «Нашай Нівы» — цытата-motto пра магістральнасьць інтэлектуальнага эстэтычнага кірунку, якая сьведчыць пра магчымасьці культуры й заняпад нацыі. «Што да віртуозаў філялёгіі, дык для іх ня так істотна — жывая гэта мова ці мёртвая, ці містыфікаваная. Плебэйскія культуры набываюць вышэйшы кшталт, калі паміраюць». Вось так і сустрэліся — мова сто гадоў паміраючая й мова сто гадоў як нарадзіўшаяся.

Падабенства назіраецца і ў лексыцы, і ў артаграфіі. Цяжка нават сказаць, ці гэта ваганьне, сутаргі, ці разьвіцьцё. Вось прыклад з этнанімікі — Летува/Літва, летувіс/літовец. Добра, што хаця «НН» ня робіць прарыву ў бок Жамойці, добра арыентуючыся што Жамойць ад Вільні таксама далёка, як Менск, нават далей.

І апошняя спроба выглядаць больш па-зўрапейску праз лацінку і набліжэньне да фанэтыкі люду праз скасаваньне літары G, нават у іншамоўных абрэвіятурах (КНВ — ну, гэта КГБ).

Падобнае адбывалася і ў эспэранта — яшчэ да першых народзін «Нашай Нівы», калі рэфарматары спрабавалі наблізіць яе [мову эспэранта. — рэд.] да чалавечых эўрапейскіх моваў, ліквідуючы нейкія артаграфічныя адметнасьці. Вынік гэтай рэформы — мова ido (што азначае дзіцё), лёс якой якбы прароцтва для беларушчыны. Між іншым, тады выкінулі літару й гук x (ch), а ўвялі літару x (ks). Блізка гэтай X (CH) і спроба «Нашай Нівы» ўцьвярдзіць лацінскую H замест G — калі ў мове люду няма такога гуку, дык ня трэба й літары. Хутка, ой хутка забыўся балцкі субстрат — ці гэта не канчатковая капітуляцыя перад русыфікацыяй — форма якбы нацыянальная, але зьмест ужо не тутэйшы. Калі скасавалі літару, пачалі пісаць бяз розьніцы, нават у тых імёнах, дзе ў часы Скарыны старанна захоўвалі розьніцу праз спалучэньне КГ у словах Гедымін, Гервяты, Гедройць. «Наша Ніва» ўдасканаліла Тарашкевіча й напісала Hiedymin, Hierviaty, Hiedrojć. Крайнасьці збліжаюцца: як па-расейску бяз розьніцы, так і ў беларускай лацінцы — hihijena, hieahrafija, hiealohija, Anhlija, Arhientyna, Hrecyja, Hvinieja, Hruzija, Hienuja, Hlazha, Hiermanija, Hrenada, raka Hanh, kurort Hahra, hihant, Maksim Horki, halera, але chalera.

Цікава, ці не перанясуць конкурс аб дзяржаўным гімне ў гімназію — hymnazyja, hymnastyka, himan ці hymen, hinekalohija...

І ўсё ж спатычка — на гаэльскай мове — трэба было пісаць haelskaja, а надрукавана — gaelskaja. Калі не палічыліся з балцкім гукам, напароліся на кельцкі. Старадаўняй гаэльскай фанэмы не разьбіць, не спыніць, не стрымаць.

Новавіленец

Вельмі Паважаная Рэдакцыя «Н.Н.»

Вашу газэту чытаю зь вялікім задаваленьнем і радуе мяне тое, што правапіс «Н.Н.» гэткі, які я вучыўся у Нямеччыне у 1946 годзе. Гэты правапіс лёгка чытаецца і дае нашай мове мілагучнасьць і праўдзівую вымову нашых слоў. Прачытваючы газэту «Н.Н.», я заўважыў хіб, якія Вам можа і не заўважальны ёсьць, бо можа мала сутыкаецеся зь нямецкай ці ангельскай мовай. На мой погляд тут што было перакладзена на польскую мову, а з польскае на беларускую, або расейскі пераклад зь нямецкай пазьней на беларускую. Вось у газэце «Н.Н.» пад загалоўкам (Гера Хельмута) заміж Гэра Гэльмута загаловак апавяданьня «Няхай жывуць Гановэрскія вароны». Калі у арыгінале ёсьць напісана Hier Chielmut дык згаджаюся але калі ёсьць Herr Helmut дык навошта рабіць нейкае дзівоцтва або у іншым апавяданьні з ангельскай мовы Richard Hill у беларускай мове мусела б быць Рыхард або як вымаўляецца (Рычард) Гіл. У ангельскай мове няма літары X, а як гэта яна у беларускай мове з ангельскага перакладу Н знайшлася ў «Н.Н.» Каб выказаць гук у ангельскай мове пішуць KH для прыкладу Харкаў — Kharkov Архангельск — Arkhangel'sk. Вось CH у ангельскай мове вымаўляецца як Ч, К, Ш [...] Нямецкае слова Herr хай расеяц кажа Гер (gier) ці Хер (chier) але беларус абавязкова мусіць пісаць Гэр (Her), каб не казалі што гэта прышло у беларускую мову праз польскую ці расейскую. Я заўважыў што расейцы ня маюць літары H (Г), дык заменьваюць літарай X або зусім абміноўваюць літару як Hispania — Іспанія haleluja (алілуя) hosanna (осанна) Ганна (Анна) гатэл (отэль) гэтак і у польскай X як H Halina (Халіна) Hrabia (Храбя) honor (хонор) halota (халота). Але беларус павінен вымаўляць Г (H) так як у слове гэты, (hryb) і.г.д. [...] я хочу каб беларусы не ужывалі дрэннай навычкі, дрэннай вымовы чужых слоў [...]

З пашанай К.Верабей, Farmingdale, N.Y., ЗША

Ода радасьці

Алесь Пpускі

Савецкая прэтэнзія на горад — вось што згубіла гістарычную традыцыю беларускіх гарадоў ды мястэчак. Прэтэнзія, пазбаўленая духоўнасьці, пустая й спусташальная. Прэтэнзія, якая дзіўным чынам вырасла за межамі памяці.

Разам з гістарычнай традыцыяй сваіх гарадоў людзі страцілі духоўнае й мастацкае ўвасабленьне свайго шляху, тую ахоўную «пячатку», што сьведчыла сьвету аб іх радавітасьці. Ня ўбачыўшы нас як народ, сьвет не аддаў нам пашаны. Мы ж, не атрымаўшы яе, згубілі веру ў сваё існаваньне.

Супраць саветызацыі мы аказаліся найслабейшымі сярод іншых. Мы так і не пасьпелі скласьціся ў нацыю. Мы не пасьпелі спазнаць сябе й сваё — сваю глыбінную радасьць.

Наша незапатрабаваная энэргія радасьці была гвалтам уплеценая ў чужую «ідэю». Нам сказалі, што «ідэя» — наша, і мы паверылі. Не пасьпеўшы спазнаць сябе (радасна), мы здрадзілі сабе, пайшлі ў наступ супраць сваёй духоўнай асновы...

«Дзяржаўнасьць», якою нас атулілі, ня высьпела духоўна, гэта была дэкарацыя, на тле якой мы гулялі сваю «дзяржаўную» ролю.

Не асьвечаны сваім Богам, люд наш рушыў у гарады зь сялянскай «шчырасьцю» і незапатрабаванай энэргіяй, выказваючы бязьмежную гатоўнасьць сказаць «сваё» нясьпелае слова, свой прысуд чужой для яго (бо неспасьцігнутай) гісторыі.

Інстытуты гэтае «нашае дзяржавы» складаліся на голым месцы, бо тыя, хто перад рэвалюцыяй выношвалі парасткі свае глыбіннае радасьці ўсьвядомленае нацыі, былі расьціснутыя машынаю тэрору. Іх месцы разам з чужынцамі займалі людзі, якія ня мелі ані свае глебы, ані свае рэлігіі. Адзіным і вырашальным разуменьнем горада для іх быў «дом» пастаўлены на «дом» ды як мага шырэйшы палігон паміж імі, дзе так вольна было чырвоным сьцягам, уплеценым у разбуральную стыхію стваральнае камуністычнае «радасьці». Вось тут мы не адставалі ад іншых — наадварот, як дзікіх, незацугляных сьвядомасьцю коней, нас несла навыперадкі. Ці не таму да сёньня жыве ў нас псыхалёгія «лепшых стартавых магчымасьцяў» у новай (зноў ня намі прыдуманай) перабудове? Сёньняшні «абозны» стан нашых дэмакратычных пераўтварэньняў — вынік усё таго ж хранічнага непрарастаньня сваёй ідэі.

«Дом на дом» і палігон... Гэтая няхітрая мэтадалёгія, разбурыўшы вялікія гарады нашы (як ня нашы), хутка была занесеная ў дзівосныя беларускія мястэчкі, дзе мясцовы «пан» ад КПБ сьцьвярджаў сваю спусташальную прэтэнзію на раённую сталіцу...

Спустошаны 1000-гадовы Віцебск, зьнявечаны Магілёў, абрабаваны дзяржаўны некалі Полацак, прыніжаныя Наваградак, Нясьвіж, Быхаў, Мазыр, Ружаны, Бабруйск... стаптаныя ўшчэнт Орша, Шклоў, Крычаў..., і нарэшце «ўзвышаны» імпэрскім кляймом Менск — вось вынік шматгадовай сьцяганоснай «радасьці», якою залітыя сьвятыя месцы нашае вялікае й патаптанае гісторыі.

І вось, блукаючы ў здабытай адзіноце пэрспэктывамі бездухоўнай геамэтрыі нашых гарадоў, мы (на 3/4 гараджане) на сваёй зямлі ўрэшце зразумелі, што горада ў кожнага з нас быццам і няма.

Схіляючыся перад чужымі здабыткамі цывілізацыі, мы імкнемся (як у казку) у чужыя гарады, дзе, спатоліўшы смагу па прыгажосьці й наглытаўшыся ўволю чужое радавітасьці, мы хутка і з раней невядомым сумам адчуваем, што там мы чужыя, а вярнуўшыся дадому разумеем, што, акрамя ўбогага жытла ў мікрараёне, дому ў нас і няма...

Няма радасьці яднаньня, няма крылаў за сьпінаю, няма надзеі й веры ў сябе, але ёсьць бездапаможная гатоўнасьць аддаць апошняе — фіктыўную свабоду.

Так, ёсьць недзе неўскія берагі ці берагі «Нярыс», але ці ёсьць выратавальныя берагі Сьвіслачы ў Менску? Усё тут створанае мэханічна — ні аўтарства, ні легенды, ні каменя на ўспамін...

Мо сапраўды прыйшоў час зьбіраць каменьне? Не ў адзіноце, як спрабуем зрабіць сёньня, калі камень да каменя застаецца амаль чужы, а ўсім бы разам. Не мэханічна — з усёй бы шчырасьцяй душы. Але зьбіраючы — не забыцца б пра лёс Сызыфа...

Астралёгія Драздовіча

А.Б.

На рагу Траецкага прадмесьця, як ісьці ад Сьвіслачы, каля лаўкі з посудам зьявіўся новы помнік — Язэпу Драздовічу.

Дзядзька Язэп непрапарцыйна малы на тле двухпавярховай камяніцы, баявіта крочыць наперад.

Мастацкіх галерэяў на Траецкім поўна, і падаецца часам, што ён борза ўцякае адсюль, дзе пахне рэстарацыямі й прастытуткамі, музэем і мастацтвам, заскочыўшы перад гэтым здуру ў майстэрню да вялікага кабетафіла Лёшы Кузьміча.

Сам помнічак бронзавы і, відаць, добра-такі мазоліць вочы камэрсантам ад каляровых мэталаў.

Разам з адкрыцьцём помніка хацелі адчыніць на Траецкім у музэі Максіма Багдановіча выставу твораў Язэпа Драздовіча, ды штосьці не атрымалася, а шкада.

Здарылася зь дзядзькам Язэпам ужо колькі гісторыяў.

Спачатку з адпаліраванага пастамэнту паадвальваліся бронзавыя літары, бо наіўны аўтар пасадзіў іх на эпаксыдку. Некалькі разоў ён зьмяняў зьніклыя літары на іншыя, ужо з падфарбаванага алюмінія, урэшце плюнуў і зьняў усё. Так і крочыць цяпер дзядзька Язэп бяз подпісу, як жывы!

Урэшце, можа гэта й добра. Людзі хоць пытаюцца, а хто гэта такі?

А яшчэ аднаго разу я бачыў, як нейкая спагадлівая ці вясёлая душа павязала яму на шыю вельмі фактурны, падобны на даматканы, шалік. Акурат упісаўся, як бы там і быў.

Пішучы пра помнік Язэпу Драздовічу, згадваю яшчэ адзін, блізкі да гэтага сваёй камэрнасьцю й памерамі — помнічак-каплічку з Максімам Багдановічам, што стаіць каля Беларускай Хаткі.

Вось так і здаецца, што пройдзе зараз дзядзька Язэп праз сьвіслацкі мост на Нямізе, а там зьверне на Маскоўскую — і налева. Падыйдзе да Максіма, які стаіць рахмана прыцісьнуўшы рукі, і скажа: «Здароў, Максім!»

Але досыць пра помнікі. Пагаворым лепей пра нявыдрукаваныя рукапісы.

Дасюль у Луцкевіцкім архіве, у Вільні, ляжаць сотні старонак Драздовічавых рукапісаў-развагаў аб жыцьці на іншых плянэтах. А ягоныя шматлікія малюнкі й карціны на касьмічную тэму зьяўляюцца, па-сутнасьці ілюстрацыямі, адбіцьцём у жывапісе й графіцы таго, што ён натаваў на паперы. Калі захочам калі-небудзь даведацца пра цэлае — мусім выдрукаваць іх таксама.

А гэты невялікі аркушык, які зьмешчаны тут — цікавая памятка часу. Не адзін мусіць дзядзька Язэп спадзяваўся, што праз якую пару-тройку гадоў настане «трыумф нацыянальна-незалежніцкай ідэі». Ды гісторыя пайшла сваім шляхам, можна сказаць, яна прагрукатала па беларускіх скобах, а «трыумфу» і дасюль яшчэ не відно. Але і ў тым і ёсьць сутнасьць беларускага адраджэнскага руху, што ён ня вынішчаны й здольны працаваць нават пры ўсялякай адсутнасьці пэрспэктываў, як кажуць, да апошняга набою. Так як рабіў гэта дзядзька Язэп.

БУДУЧЫНА БЕЛАРУСІ

З прарakаваньняў беларускага Яснавіда Пушчавіка-Гарадоліча на 3-е дзесяцілецьце XX веку.

Год супакойных выжыданьняў.

1923 — Год беднасьці і часовага заняпаду. Год перацярпліваньняў крыўдаў ад несправядлівасьцяў завісьлівых чужаземцаў.

1924 — Год трывожлівасьці і няпэўнасьці. Год здрадніцкіх падходаў і лжывых запабегаў. Год прадбачаньняў і падгатовак. Год патужлівага настрою і незадаволеньняў.

1925 г. — Год стыхійнага беларускага руху. Год перапоўненага келіху цярплівасьці. Год змаганьня са злом культурна-нацыянальнага ўціску і кабалой крыўдзіцеляў.

1926 г. — Год аканчальнай пабеды пакрыўджаных над крыўдзіцелямі і трыумф нацыянальна-незалежніцкай ідэі. Год аб'яднаньня і салідарнасьці ўваскрэслых і ўваскрасаемых народаў.

1927 г. — Год часовага эканамічнага застою. Год палітыканства і міжнародных непаразуменьняў.

Загадка: 1925 - 1926 - 1927 г.

а/ У гэтых гадах на зямлі беларускай адбудзецца адна буйная палітычная падзея і вечнаю сьведкаю гэтай падзеі будзе адна з вялікіх рэк цякучых на захад сонца.

б/ У гэтыя гады на некаторы нядоўгі час Беларусь акажацца хатай вялікадушнага прыпынку для ўцекачоў — былых ейных ворагаў, пацярпеўшых ад сваіх, праз хатнюю калатніну.

1928 г. — Год зямельнай перабудоўлі.

1929 г. — Год начатку разьвіцьця беларускага джэнтэльменства.

Загадка 1929 году. У гэтым годзе памрэць адзін з найвялікшых беларускіх пісьменьніцкіх талентаў, а для будучыні ў гэтым годзе радзіцца вялікі беларускі нацыянальны дзеяч.

ЛЯСНОЕ

Паўліна Качаткова

І загадка стала перад загадкай.
Мы ізноў тут няпрычым.
Мы разумеем: лес — раздольле,
І зь дзікай таямніцай сьпім.

Янка Юхнавец

РАНАК

— Час перад сенакосам — найлепшы час, — гаворыць гаспадар хутару. Які жах — час перад сенакосам! Трава высокая, густая, у ёй раскашуюць земляныя жабы, ніводнаму філятовому званочку яшчэ не адсеклі галавы. Падумаеш пра ўсё гэта й міжволі ўзгадаеш сваю хваробу, якая зёлкамі ня лекуецца.

— Мне таксама даспадобы час перад сенакосам, — адказваю я, — але, здаецца, летась трава тут была вышэйшая...

Роўна год таму тут, на хутары я згубіла каханага. Згубіла назаўсёды — ён ператварыўся ў зьвярка і ўцёк у лес. Звярок быў белы й пухнаты. Вось і ўсё.

ДЗЕНЬ

Праз год мы вярнуліся на хутар, каб адзначыць вясельле нашай сяброўкі. Пакуль я тут адна — трэба падрыхтавацца да прыезду гасьцей. Яны думалі — буду баяцца. Чаго? Што тут страшнага? Ведала аднаго хлопца, ён пісаў цудоўныя вершы пра каханьне й свабоду, боль і нянавісьць. Я бачыла, як ён праваліўся ў лінеўную каналізацыю... Гэта ўсе ведаюць! Што з таго?

Думаю, майму каханаму добра ў лесе. Ён заўсёды пачуваўся няўтульна сярод людзей, было ў ягонай істоце штосьці цяжкое й панурае... Ваду, каб мыць падлогу, цягаю вёдрамі ад стаўка — «чароўнага возера». Іду зь вядром па лесе й думаю, што амаль нічога апошнім часам не чытаю. Затое памяць палепшала, калі ўжо што прачытала — не забуду. Напрыклад: «Істота з абліччам чалавека, пазбаўленая ўсялякай духоўнасьці й маралі... Вы ня хочаце ведаць і чуць пра яго? З жахам уяўляеце, што ваша дачка можа сустрэцца з такім? Не заплюшчвайце вочы! Ён ёсьць!» Гэта з артыкула пра маладую беларускую літаратуру. Я згодная з аўтарам: нашмат больш прыемна напаткаць чалавека ў абліччы лясной істоты. І бацькі ня будуць у жаху.

Букетам палявых званочкаў у цёмна -зялёнай пляшцы з-пад алжырскага віна ўпрыгожваю пакой для маладых. Пляшку адмыла ад пылу ў стаўку. Ня ведаю, можа там сапраўды чароўная вада? А пляшка засталася зь мінулага году. Помню, як набывалі алжырскае ў мястэчку, у краме каля жыдоўскіх могілак.

Выношу з хаты й раскладаю на траве матрацы — хай прасохнуць, пакуль сонца...

Вось так.

ЧАС ЗЬМЯРКАНЬНЯ

Змрок паўзе да хаты зь лесу. Уяўляю: у гэты час мой каханы выходзіць на лясную сьцежку, прыслухоўваецца, прынюхваецца й выпраўляецца ў начныя паходы. Праз вакно бачу нашых сяброў, яны праходзяць адзін за адным у густой, высокай траве. Прыехалі. Нарэшце. Зараз пачнецца сьвята. Сьвята на хутары.

Усё будзе добра.

НОЧ

Што там ляснула?

Гэта мае сябры Сава з Казлом саскочылі з шафы. Шафа — ня печка, на ёй ня кожны спаць можа. А што рабіць, калі месца ўсім не хапае? На стале дагарае зялёная сьвечка. Хочацца паліць, ды няма чаго. Казёл паказвае на мяне пальцам:

— Паглядзі, я яе зь дзявятае клясы ведаў. Тады яна здавалася мне анёлам.

— Я й цяпер анёл.

— А дзе твае крылы? — пытаецца Сава. Совы ведаюць: у каго павінны быць крылы, у каго — не. Разьбіраюцца.

— Пачакайце, зараз прадэманструю, — я выходжу з хаты.

Хто ня быў хворы — ня ведае...

Хвароба, як неадчэпны сьцень.

Цёмна, зусім цёмна. Крапіва каля ганку — увасабленьне мужнасьці, уся зьмятая й прытаптаная. А на забытым у траве матрацы сядзіць зьвярок — брудны й калматы. Выйшаў зь лесу. Цяпер сядзіць на матрацы й мыецца: цярэ лапкамі пысу, вушкі, абтрасае поўсьць. Так хутка-хуценька чысьціцца, нават не зірне на мяне... Ні разу.

Час перад сенакосам — цудоўны час, той час, калі спаўняюцца жаданьні.



КАМЕНЬ, ЯКІ РАСЬЦЕ

Працяг са старонкі

нарэшце таксама, апошні, вынырнуў зь цемры й водаў. Калі паром падыйшоў бліжэй, мужчына, што стаяў на беразе, заўважыў на дальнім яго канцы, за павецьцю, яшчэ двух высокіх нэграў, якія таксама былі ў шырокіх саламяных капелюшах і ў штанах зь цёмна-шэрага палатна. Стоячы амаль плячо ў плячо, нэгры ўсімі мускуламі налягалі на шасты, якія паволі занураліся ў раку за плытом, а яны, гэткім жа роўным, запаволеным рухам, нахіляліся над вадой, колькі ставала раўнавагі. Тры мулаты наперадзе нерухома й моўчкі глядзелі, як да іх набліжаецца бераг, ні разу не падняўшы вачэй на таго, хто іх там чакаў. Раптам паром уцяўся аб край прычала, што выдаваўся ў раку й толькі цяпер трапіў у сьвятло ліхтара, які загойдаўся ад удару. Магутныя нэгры зьнерухомелі, задраўшы ўгору рукі і ўчапіўшыся ў шасты, якія толькі трошкі ўвайшлі ў ваду. Па іх напружаных мускулах прабягала дрыготка, якая нібыта йшла ад самой ракі й яе важкога напору. Тры іншыя перавозчыкі накінулі на слупкі на прычале доўгія ланцугі, саскочылі з парому й насунулі на яго нешта накшталт груба скалочанага апускнога моста, які пакрыў плыт сьпераду роўным пахілым шчытом.

Пакуль шафёр запускаў рухавік, мужчына вярнуўся да машыны й сеў. Машына паволі рушыла да адхону, задралася капотам у неба, потым нырнула ўніз і пачала спускацца. Паціху пасоўваючыся на тармазах, яна крыху коўзалася па гразі, спынялася, кратала зноў і нарэшце, пад перастук хісткіх дошак, узьехала на прычал. Падрулiўшы да краю, на якім, па-ранейшаму моўчкі, з абодвух бакоў выстраіліся мулаты, яна мякка накацiла на плыт. Як толькі пярэднія колы дакрануліся да яго, плыт нырнуў носам у ваду, але амаль адразу ўсплыў зноў, прымаючы ўвесь цяжар аўтамабіля. Тады шафёр адагнаў машыну на карму й паставіў каля квадратнай павеці, пад якою сьвяціў ліхтар. Мулаты адразу адкінулі памост на прычал і, спрытна пераскочыўшы на паром, тым жа рухам адштурхнулі яго ад багністага берага. Рака ўздыбілася пад плытом, узьняла яго на сваіх водах і паволі панесла на доўгім повадзе, змацаваным з жалезнаю штангай, якая таксама цяпер паплыла ў небе ўздоўж мэталічнага троса. Два чорныя асілкі нарэшце пасланілі напружанасьць у руках і палабралі шасты. Мужчына з шафёрам выйшлі з машыны й нерухома сталі на краю плыта тварам супраць цячэньня. Пакуль ішла пасадка, ніхто не прамовіў ні слова, і цяпер усе па-ранейшаму нерухома й моўчкі яшчэ заставаліся на сваіх месцах, апроч аднаго высокага нэгра, які скручваў сабе цыгарку з грубай паперы. Чалавек глядзеў на прагал вялікага бразыльскага лесу, зь якога ўзнікала й кацiла да іх рака. У гэтым месцы яна была шырынёю ў некалькі сотнeнь мэтраў, яе каламутныя, цьмяныя воды напіналі на бок парому й, вызваліўшыся з двух канцоў, зноў расьцякаліся магутнаю роўнаю плыньню, якая ймкнула скрозь змрочны лес насустрач мору й ночы. Затхлы водар вады й набрынялага вільгацьцю неба лунаў у паветры. Пад паромам цяжка плёхкалася вада, і раз-пораз зь берагоў даляталі гучныя поклічы рагатых рапух і крыкі невядомых птушак. Асілак падыйшоў і спыніўся каля шафёра. Худы й маленькі, той стаяў, абапершыся аб бамбукавую жардзіну і ўсунуўшы кулакі ў кішэні свайго некалі сіняга камбінэзону, зацярушанага цяпер шчыльным рудым пылам, які ім давялося глытаць увесь дзень. З усьмешкаю, застылай на маршчакаватым, хоць яшчэ й маладым твары, ён глядзеў невідушчым позіркам на паліняліая зоркі, якія плавалі ў адсырэлым небе.

Птушыныя крыкі пачуліся нарэшце выразьней, да іх прымяшалася нейкае дзіўнае сакатаньне, і, амаль у тую ж хвіліну, трос зарыпеў. Два высокія нэгры занурылі ў раку шасты й сьляпымі рухамі пачалі намацваць дно. Чалавек азірнуўся на бераг, які яны нядаўна пакінулі. Цяпер ён ужо схаваўся за цемрай і водамі, бязьмежны й дзікі, як цэлы кантынэнт вялікага дрэўнага царства, што шырыўся на тысячы кілямэтраў вакол. Паміж зусім недалёкім адсюль акіянам і гэтым морам расьлін невялікая жменька людзей на плыце пасярод дзікай ракі здавалася зусім згубленаю. І калі паром ударыўся аб прычал на другім беразе, было такое ўражаньне, нібыта яны, пасьля доўгіх дзён трывожнага плаваньня, раптам, на поўных ветразях, наляцелі на невядомы, прыхаваны моракам востраў.

Калі яны ступілі на цьвёрды грунт, нарэшце пачуліся чалавечыя галасы. Шафёр ужо разьлічыўся, і людзі, нечакана вясёлымі ў гэтай цяжкай начы галасамі, разьвіталіся па-партугальску з машынай, у якой ужо быў запушчаны рухавік.

— Яны казалі, да Ігуапы шэсьцьдзесят кілямэтраў. Тры гадзіны едзеш, і ўсё. Сакрат рады, — паведаміў шафёр.

Чалавек шчыра засьмяяўся густым і цёплым сьмехам, які стасаваўся зь ягонай камплекцыяй.

— І я, Сакраце, я таксама рады. Дарога вельмі цяжкая.

— Вельмі цяжкая, пане д'Ара. І ты вельмі цяжкі, — і шафёр таксама засьмяяўся нястрымным сьмехам.

Машына пакрысе набрала хуткасьці й кацiла паміж дзьвюма высокімі сьценамі дрэваў, шчыльна аплеценых разбуялай расьліннасьцю, ахутаная волкім, саладжавым паветрам. Лясны змрок безупынна расьсякалі сьвятлівыя мушкі, і раз-пораз у ветравую шыбу ўразаліся нейкія дзіўныя птушкі з чырвонымі вачыма. Часам з начной глыбіні далятаў гучны незнаёмы рык, і шафёр, зірнуўшы на свайго суседа, камічна закочваў вочы.

Дарога круцiла ўлева і ўправа, перасякала рачулкі па хісткіх дашчаных мастках. Праз гадзіну туман пачаў прыкметна гусьцець. Зацярушыла дробная імжа, расьсейваючы сьвятло фараў. Д'Ара, нягледзячы на траску на выбоінах, драмаў. Ён быў ужо ня ў гэтым

ГАЛАСЫ З ПУСТОГА ПАКОЮ

Сьвятлана Алексіевіч. Зачараваныя сьмерцю. — Менск: Беларусь, 1993

«Я безнадзейна ўлюбёная ў рэчаіснасьць», — прызналася ў прадмове да сваёй кнігі Сьвятлана Алексіевіч. Гэтаму можна верыць. Жанар «мастацкае дакумэнталістыкі», у якім столькі часу працуе аўтарка, проста немагчымы без асаблівых — глыбокіх ды інтымных — адносінаў з тым, што завецца «жыцьцём». Услухоўвацца ў жыцьцё, трымацца за жыцьцё, любіць, разумець, занатоўваць жыцьцё — усё гэта можа быць яшчэ больш моцным наркотыкам, чым такія рэчы як мара, уяўленьне, сон, фантазія.

Але ў апошнім праекце — «Зачараваныя сьмерцю» — звыклая й накатаная мэханіка жанру раптам дала збой. Прычым не па віне аўтаркі, а па віне жыцьця. Жыцьцё, рэчаіснасьць, да якой так хілілася, якой так давярала Сьвятлана Алексіевіч, раптам увайшла ў зону катастрофаў, у зону высокай энэргіі распаду. Савецкая рэчаіснасьць, нібы Атлянтыда, апускаецца на дно гісторыі. Побач паўстае нешта новае, і ўжо цяжка зразумець, дзе ўяўленае, а дзе сапраўднае, рэчаіснае.

Гэта хіба што першая кніга Сьвятланы Алексіевіч, якую нецікава чытаць. Прадмет аўтарскага дасьледаваньня — «людзі ідэі, што вырасьлі ў гэтай культуры й ня вынесьлі яе крушэньня» — гаворыць не сваімі галасамі. Да таго ж з ужо пустога пакою. Нават перад сьмерцю яны ня могуць намацаць сваю сапраўдную экзыстэнцыю й бясконца пракручваюць адну й тую ж кружэлку: мы верылі, нас падманулі. Аніхто ня кажа: мы думалі, мы любілі, мы спрабавалі.

А напрыканцы кнігі мне раптам стала крыўдна за... сьмерць. Сьмерць — гэта ня тое, што нарадзе. Гэта хутчэй дзьверы, што заўсёды побач. Гэта досьвед, што цябе вызваляе, дорыць табе сапраўднасьць. Пра гэта ведаюць філёзафы й паэты — яны й адно яны па-сапраўднаму «зачараваныя сьмерцю».

А камунізм ня ведае сьмерці.

Ён ведае толькі забойствa.

Так што *«сьмерць — наш чалавек»*.

Стывэн Д.

НЕКАТОРЫЯ ВАРТАСЬЦІ ВЕРШАЎ БЫЛОГА ВАРТАЎНІКА

Ігар Бабкоў. Solus Rex. — Менск: Мастацкая літаратура, 1992.

Зусім нядаўна, на парозе руйнаваньня савецкай імпэрыі, вобраз вартаўніка быў ледзь ня тоесны постаці філёзафа. Мусіць таму кожны брамнік, ліфцёр, ахоўнік, прыбіральшчык, наглядчык лічыў сябе каралём. Але, між іншым, зазначу, што ў беларускай гутарцы лацінскае *Rex* бліжэй да вартаўнічае будкі, чым да каралеўскіх палацаў і калідораў Дому ўраду, і гэта важна, бо, прамовіўшы на тутэйшых тэрыторыях *Rex*, пачуеш брэх.

Часы, як і належыць часам, мяняюцца; былы вартаўнік Ігар Бабкоў вярнуўся ва ўнівэрсытэцкую філязофію, толькі вярнуўся ён не з вартаўнічага будана, а са Скарынаўскага навукова-дасьледнага цэнтру, і ў руках ён трымаў ужо не вартаўнічую стрэльбу, а мяккую, танюткую, чарнаскурую кніжачку вершаў, імпрэсій ды калёквіюмаў. Чорная кніжачка, размаляваная экспрэсіўнай рукой Кашкурэвіча наймалодшага, нагадала мне паўразбітыя помнікі з Кальварыйскіх могілак у Менску, і не выпадкова, бо матыў сьмерці асноўны, хрыбетны, восевы ў кнізе Бабкова...

Ягоныя кветкі заўсёды красуюць увосень, цьмяна-барвовымі фарбамі плёну і адчаю, крыху падсьветленыя пашарэлымі бялілами сьмерці ("Бадлер").

Жалезныя боты вандроўніка і засяроджаная падрыхтаванасьць да сьмерці ("Акутагава").

... рукі твае — халаднейшыя за нішто / Пасьцеляць сьмерць нібы песьню... ("Фуга цёмнага часу").

Вобраз сьмерці працяў першую Ігараву кнігу наскрозь, як сталёвы шампур працінае кавалкі нежывое плоці, як стрэл вартаўніка працінае цішу ахоўнай тэрыторыі...

... звыкайся / быць мерцьвяком / звыкайся / сьляпымі вачніцамі зеўрыць... ("Solus Rex").

Нечакана, прынамсі для беларускай кніжкі, прагучала формула: ВЕРА, НАДЗЕЯ, СКОН ("Фрагмэнты"), — пасьля такой звыклай, узаконенай папяроднікамі, надзейнай, як падмурак: Вера, Надзея, Любоў! Але за чорным ёсьць белае, за ІНЬ ёсьць ЯН, і аўтар «Самотнага Караля», ведаючы пра адзінства й барацьбу, назірае праз сваё «я» *«сьветлы тапельцаў рай»* у лепшым сваім вершы...

Лотаці жоўты сон / Сьветлы тапельцаў рай / Веяў, вуснаў Эдэм / На залатое дно

Вось ён Рай — прытулак каханкаў. Хто з нас, закаханых, не хацеў бы памерці зь любаю ў адзін дзень, каб душы зьліліся ў вечным палёце над Кальварыйскімі шатамі такога жывога памідорнага й гарбузовага колеру. Ёсьць каханьне, ёсьць верш, ёсьць сьмерць...

... толькі тут мы дома / Сярод пахаваных магіл ды забытых багоў... ("За небакраем Эўропы").

Раптоўна робіцца прыкра ад мноства дробных і незабытых багоў, што запоўнілі *тэрыторыю ночы* мяккацелай кніжачкі. Крыўдна, спадар Бабкоў, са шматгадовым вопытам вартаўніка трэба лепш ахоўваць абсягі першай кнігі паэта. А то панапускалі...

... Божухна мой, няўгледжаны, злы, шэравокі... ("Дзень, нібы дрэва, лістотай сваёй ападае...").

... І Мойры, выткаўшы сьляпога лёсу ніць... ("Лістота шорхая віруе ў цішыні...").

Трэба, вядома, нітка лёсу, а ня *лёсу ніць*, але ня ў тым сутнасьць, я пра іншае — пра колькасьць багоў...

... І ў душы — агнёў паганскіх цяпло ("Выспа, людзкі паратунак, неакрэсьлены тут тваё межы...").

Нішто не гаворыць тут / аб распнутым Хрысьце / сьвет дасканалы... ("Нішто не гаворыць тут...").

Іх шмат, як у міталягічным слоўніку. Багі Бабкова топчуцца адзін аднаму па нагах, быццам і не Багі яны, а тралейбусныя пасажыры, што едуць у спачывальныя раёны Чыжоўкі й Серабранкі.

Бабкоў — паэт зь нявызначаным веравызнаньнем, без партыйнага білету й без партыйнай мянушкі. Жартам ён можа сказаць, што будыст ці дзэн будыст, але гэта ж жарт. Ён ведае: я нішто перад Вечнасьцю, але ў такім разе й вечнасьць для мяне Нішто.

Таму лёгка даравацьяму расхрыстаны паРазанаўску сынтакс і нятрапныя скарачэньні «у». Таму варта адзначыць такі сьвежы ў нас унівэрсытызм Эліёта, што сьвеціцца праз радок: *«... пакрочым невымоўнасьцю, нямотай на плошчу St.-Michel...»* І варта падкрэсьліць прозьвішча Паунд у вершы "Зіма", і трэба ўбачыць сонечна-сымбалічную свастыку на апошняй старонцы вокладкі.

P.S. Засталося сказаць, што вельмі лёгка пісаць рэцэнзіі на кнігі, якія амаль ніхто не чытаў з-за іх мізэрнага тыражу. Зрэшты, 300 асобнікаў, вядома, болей, чым 3.

P.P.S. У маім паэтычным жыцьці былі два вялікія расчараваньні... Першае: калі зразумеў, зь якімі каля-паэтамі давядзецца працаваць усё жыцьцё. Другое: калі ўбачыў, што наступнікі ня лепшыя за папярэднікаў. Дзякуй Богу, ні першае, ні другое расчараваньне ніякім чынам не зьнітаваныя з кнігай Ігара Бабкова *«Solus Rex»*.

Адольф

ПЛЯЦ НЯВОЛІ

Ніл Гілевіч. Выбар; Сяргей Законьнікаў. Беларускае сэрца. — Менск: Беларусь, 1993. Сэрыя «Плошча Свабоды»

У дадзеным выпадку найбольшую цікавасьць выклікае не публіцыстыка Н.Гілевіча й С.Законьнікава, а лёс выдавецкай сэрыі «Плошча Свабоды». Яна была задуманая колькі гадоў таму ў якасьці «гарачага мікрафону», праз які дэмакратычная інтэлігенцыя магла б непасрэдна ўплываць на чытачоў і ўвогуле на грамадзкую думку. Апошнія кніжкі пераўтвараюць гэты праект у іншы, які мог бы называцца «Архіў Беларускага Адраджэньня».

У чым рэч? Ці гэта проста няўдзячны лёс самой публіцыстыкі як жанру, у якім тэксты старэюць ды губляюць сваю актуальнасьць з катастрафічнай хуткасьцю, — альбо якасьць «аўтарскага» бачаньня, якое нездольнае намацаць ды выявіць стрыжнявыя праблемы грамадзтва? Адказы могуць быць розныя, але факт застаецца фактам, — годная й пэрспэктыўная задума вызваленьня беларускае думкі ў 1993 годзе знайшла сябе на руінах.

Зрэшты, на руінах знаходзіць сябе й само беларускае мысьленьне. Ягоная ідэалягічна-публіцыстычная дамінанта так і не сфармавалася. *Беларускі шлях* ды *беларускі парадак* пакуль застаюцца аб'ектам паэтычных мэдытацыяў ды мэтафізычных прадчуваньняў, якія пакуль немагчыма ўцямна перакласьці на мову ясных і празрыстых ідэалягічных формулаў. Адсюль — беларуская публіцыстыка больш чэрпае з рыторыкі, чым з разуменьня таго, што адбываецца. Аграмадная прастора — паміж рэальнымі палітыкамі, якім няма часу пісаць публіцыстыку — і сапраўднымі паэтамі, якія аніколі ня здолеюць пераступіць межы жанру — уся гэтая прастора запоўненая сёньня тэкстамі другога гатунку.

Дадатак: кароткая інструкцыя рэдактару сэрыі В.Ц.Вольскаму.

1. Арыентавацца не на намэнклятуру прозьвішчаў, а на якасьць тэкстаў. «Імя» набываецца, а якасьць тэксту — гэта назаўсёды.

2. Уяўляць аўдыторыю. Публіцыстыка правальваецца, калі яна пачынае пераконваць «даўно перакананых».

3. Не друкаваць у 1993 годзе прамовы Ніла Гілевіча 1967 году.

4. Жыве Беларусь.

Алесь Гудбай

вільготным лесе, а зноў кацілі па дарогах Сэры, на якіх яны правялі ўвесь дзень ад самага ранку, калі выехалі з Сан-Паўла. Над грунтовымі дарогамі безупынку падымаліся хмары рудога пылу, смак якога й цяпер яшчэ адчуваўся ў роце; пыл асядаў на зямлю, пакрываючы зьлева й справа, колькі хапала вачэй, усю рэдкую стэпавую расьліннасьць. Цяжкае сонца, паліняльня, парэзаныя ярамі горы й, уздоўж дарог, згаладалыя зэбу зь нязьменнымі сваімі спадарожнікамі, змардаванымі ад пералётаў грыфамі-урубу: доўгаедоўгае плаваньне па чырвонай пустальні... Ён уздрыгнуў. Машына стаяла. Яны апынуліся ў Японіі: абапал дарогі стаялі хаткі, аздобленыя тонкай разьбой, і за іх вокнамі мільгалі постаці ў кімано. Шафёр гаманіў зь японцам у брудным камбінэзоне й саламяным бразыльскім капелюшы. Неўзабаве машына рушыла далей.

— Ён кажа, усяго кілямэтраў сорак.

— Дзе гэта мы былі? У Токіё?

— Не, у Рэгістра. У нас усе японцы прыяжджаюць сюды.

— Чаму?

— Хто іх ведае. Яны ж жоўтыя, ведаеш, пане д'Ара.

Лес крыху пасьвятлеў, і дарога пайшла лягчэй, хоць была яшчэ сьлізкая. Машыну заносіла на пяску. Праз вакенцы ўлятаў волкі, цёплы і трошкі гаркавы ветрык.

— Адчуваеш? — задаволена прамовіў шафёр. — Гэта мора. Хутка Ігуана.

— Калі хопіць бэнзыну, — азваўся д'Ара. І зноў ціхамірна заснуў.

На сьвітанку д'Ара, седзячы ў ложку, зьдзіўлена аглядаў залу, у якой толькі што прачнуўся. Яе высокія сьцены да сярэдзіны былі нядаўна вымазаныя бураю глінкай. Вышэй, белая фарба, пакладзеная ў вельмі аддаленыя часы, зьвісала жоўтымі лахманамі да самае столі. Адзін насупраць аднаго тут стаялі два шэрагі па шэсьць ложкаў. І толькі на адным, у самым канцы ягонага шэрагу, пасьцель таксама была разабраная, але нікога ў ім не было. Раптам зьлева пачуўся шум, і, азірнуўшыся да дзьвярэй, д'Ара ўбачыў Сакрата, які, сьмеючыся, стаяў, трымаючы ў кожнай руцэ па бутэльцы зь мінэральнай вадой.

— Шчасьлівы ўспамін! — сказаў ён.

Д'Ара схамянуўся, вяртаючыся да рэальнасьці. Сапраўды, шпіталь, у якім іх прытуліў на ноч мэр, называўся «Шчасьлівы ўспамін».

— Пэўна, успамін,— пацьвердзіў Сакрат.— Яны казалі мне: спачатку будаваць шпіталь, потым будаваць вадаправод. А пакуль, шчасьлівы ўспамін. На вось — калючай вады табе памыцца.

Сьмеючыся й нешта напяваючы, ён пайшоў прэч, з выгляду зусім ня стомлены тым жудасным чханьнем, што скаланала яго ўсю ноч і не давала д'Ара зьмежыць вачэй.

Д'Ара ўжо канчаткова прачнуўся. Ён глядзеў на невялічкі двор за кратаванымі вокнамі. Чырвоная глеба была ўся прамоклая ад дажджу, што й цяпер яшчэ церушыў, паліваючы высокія кусты альясу. Праз двор прайшла нейкая кабета, кончыкамі пальцаў трымаючы над галавой жоўтую хустку. Д'Ара хацеў быў прылегчы зноў, але тут жа падняўся й спусьціў ногі з ложка, які прагнуўся й зарыпеў пад яго цяжарам. У тую ж хвіліну вярнуўся Сакрат.

— Там па цябе, пане д'Ара, — сказаў ён. — Мэр чакае на двары.

І ўбачыўшы ўражаньне, якое зрабілі на д'Ара ягоныя словы, дадаў:

— Не хвалюйся, гэты ніколі не сьпяшаецца.

Пагаліўшыся зь мінэральнай валой, д'Ара выйшаў на ганак, дзе пад невялічкім дашкам яго чакаў мэр. Ростам і выглядам, што давалі яму акуляры ў залатой аправе, мэр нагадваў паслужлівую ласку. Здавалася, ён быў цалкам засяроджаны змрочным сузіраньнем дажджу, але, як толькі ўбачыў д'Ара, увесь засьвяціўся прыязнай усьмешкай. Напружыўшыся ўсім целам, ён пасьпешліва ступіў насустрач і пастараўся абхапіць сваімі маленькімі ручкамі магутны торс «пана інжэнэра». Якраз у гэты момант, насупраць, за невысокай агароджай, якою былі абнесены двор, прытармазіў і, праехаўшы па раскіслай гліне, неяк наўскасяк спыніўся аўтамабіль.

— Судзьдзя! — паведаміў мэр.

Як і мэр, судзьдзя быў апрануты ў гарнітур цёмна-сіняга колеру, але быў ці, прынамсі, здаваўся нашмат маладзейшым, дзякуючы зграбнай фігуры й сьвежаму твару зьдзіўленага падлетка. Элегантна абмінаючы лужыны, ён ужо шыбаваў праз двор і, яшчэ за некалькі крокаў ад д'Ара выкінуўшы наперад руку, пачаў прывітаць інжэнэра. Ён быў рады прымаць спадара інжэнэра, які сваім прыездам робіць вялікі гонар яго беднаму гораду; ён вельмі ўсьцешаны той неацэннай паслугай, якую пан інжэнэр зробіць Ігуапе, пабудаваўшы невялікую дамбу, якая аберажэ ніжнія кварталы ад пэрыядычных навадненьняў. Загадваць водамі, утаймоўваць рэкі! Ах, якое вялікае рамяство! І безумоўна, бедныя жыхары Ігуапы назаўжды захаваюць у памяці імя пана інжэнэра і яшчэ доўгія гады будуць прамаўляць яго ў сваіх малітвах. Пераможаны такім красамоўствам, д'Ара падзякаваў судзьдзі й не адважыўся папытацца, якое, уласна, ён як судзьдзя можа мець дачыненьне да дамбы. Зрэшты, трэба было сьпяшацца ў клюб, дзе, паводле мэравых словаў, раней, чым выправіцца на агляд ніжніх кварталаў, знакамітыя людзі горада меліся даць у гонар пана інжэнэра ўрачысты прыём. Якія знакамітыя людзі?

Працяг на старонцы 8

«АЛЕ ЛОТАС ПАЎСТАЎ ЯК СЬЦЯНА...»

Анэля Тулупава. Я чакаю цябе. — Менск: Мастацкая літаратура, 1993;

Людміла Паўлікава. Купаньне ў росах. — Менск: Мастацкая літаратура, 1993.

«Сьвядомасьць нацыі, вытокі чалавечага духу — асноўная тэматыка новай кнігі Людмілы Паўлікавай».

«Кніга пра тое, чым жыве чалавечая душа, да чаго яна мкнецца, ад чаго пакутуе» (Анэля Тулупава).

Дыяпазон Пульхнае Жаночае Паэзіі, якую годна прадстаўляюць дзьве вышэйназваныя аўтаркі — бязьмежны. Цяжка сабе ўявіць тэму, якая не магла б быць вычарпаная (альбо наадварот, запоўненая) праз гэтую Амазонку «завершаных» тэкстаў. Тут і філязофскія роздумы: «Ёсьць час, калі мяняецца душа / Адзіная душа ўсяго народа... / Што нам сыпнуць зь Вялікага Каўша / Ці стане нашай хросная Прырода?» (А.Тулупава) і сюррэалістычныя прыпеўкі: «Праўда прытанцоўваючы, / падыйшла да ілжы: / — Дакажы, што ты праўда, / ілжа, дакажы!» (Л.Паўлікава) — і шмат чаго іншага.

Характэрнымі рысамі Пульхнае Жаночае Паэзіі ёсьць прыблізнасьць ды неабавязковасьць мэтафары, адсутнасьць працы са словам, размазваньне паэтычнае эмоцыі па бясконцых прасторах квазіпаэтычных тэкстаў. У адрозьненьне ад мужчынскае імітацыйнае паэзіі, якая звычайна паразітуе на «актуальным» ды «відавочным», жаночая паэзія зьвяртаецца да «адвечна жаночага». Адвечнае, яно й ёсьць адвечнае — зь ім не паспрачаесься. Спрачацца можна з тэкстамі.

Тэксты гэтай кнігі ня ёсьць падзеяй беларускай паэзіі. Яны ёсьць вынікам дасюль бесьперапыннае працы «літканвэера»: пісьменьнік — выдавецтва — кнігагандаль, які даўно працуе «на склад».

Алесь Гудбай

НА ДЗЬВЮХ МОВАХ

Курапаты. Менск—Ню-Ёрк: Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва, 1993. [141 с.]

Прызнаюся, назіраючы за цяжкім і доўгім шляхам, якім рукапіс ішоў да кнігі, я быў пачаў шкадаваць: плён сапраўды гераічнае працы аўтараў зойме сваё сьціплае месца на запыленых паліцах кнігасховішчаў, цікавячы час ад часу толькі гісторыкаў-прафэсіяналаў, бо што ж — калі кніга выйдзе, людзі ўжо й забудуцца, хто такія камуністы, жыцьцё пойдзе наперад і СССР станецца назаўсёды перагорнутай старонкай. Аднак жа рэальнасьць даводзіць, што катэгорыя часу ў Беларусі падпарадкоўваецца зусім іншым, чым у астатнім сьвеце, законам. Час тут можа й спыніцца, а можа й пацячы назад або прынамсі ўбок. Таму з жахам даводзіцца канстатаваць: выдадзеная БІНіМам кніга зусім не спазьнілася й сёньня як ніколі актуальная: камунізм на момант схаваўся й цяпер зноў вылазіць з усіх шчылінаў. Асабліва каштоўнасьці кнізе дадае ангельскі пераклад: пэўна, наведваючы Курапаты, Б.Клінтан ужо дэтальна ведаў што там да чаго. Моцна ўражваюць ілюстрацыі — дзякуючы ім, жах Курапатаў эмацыянальна ўспрымаецца ў адным шэрагу зь іншымі страшнымі «мясарубкамі» нашых часоў — нямецкімі лягерамі сьмерці, або палпотаўскай прачысткай Камбоджы.

Архіварыюс

ЯШЧЭ НЯ ЎСЁ КРЫНІЦАЗНАЎСТВА

Тэзысы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канфэрэнцыі «Архівазнаўства, крыніцазнаўства, гісторыяграфія Беларусі: стан і пэрспэктывы». 1-2 сьнежня 1993 г. Менск, 1993.

Факт падобнай канфэрэнцыі значны для беларускіх гісторыкаў. Нібы адбываецца прарыў у сфэры тэхналёгій. Між тым сама кніжка тэзаў рассыпаецца на мноства асколкаў, і ня ўсе хочацца падымаць зь зямлі. Няхай яны там і ляжаць кучай хлуду, створанага ў сваёй бальшыні былымі супрацоўнікамі Гістпарту. Калі ж Валянцін Грыцкевіч у Санкт-Пецярбурзе распрацоўвае курс беларускага крыніцазнаўства, яго сюды не запрашаюць. Але самыя яскравыя матэрыялы тут заяўляюць пра зўрыстыку, пра пошук. Праўда, яны яшчэ бясконца вераць аўтарам крыніц. Усё ж слова пра крыніцазнаўства сказана. І можна чакаць, што ад вывучэньня асобных бакоў помнікаў адбудзецца пераход да агульнай ацэнкі крыніцы альбо крыніцазнаўчага сынтэзу. Можа, гэта будуць наступная канфэрэнцыя й наступныя тэзы.

Ян Грэчыц

КНІГА СКАРБАЎ

Archäologische Schätze aus Litauen. Begleitband zur gleichnamigen Ausstellung. Duisburg — Regensburg, 1993. 136 S.

У Дуйзбургу й Рэгензбургу на працягу 1992—1993 гг. адбыліся выставы пад назваю «Археалягічныя скарбы Літвы», наладжаныя сумесна зь Літоўскім гісторыка-этнаграфічным музэем у Вільні. Кніжку (паўальбом-паўзборнік) пад назваю, аналягічнай назьве выставы, выдалі немцы.

Калі апісваюцца фантастычныя фібулы балтаў, дык гэта ўсё праходзіць пад годлам «Балты — ранейшыя суседзі германцаў». Палова ж «Скарбу» аддадзеная найкаштоўнейшаму дыямэнту Літвы — Вільні. Закранаецца й XX стагодзьдзе. У аповядзе аб гісторыі Гісторыка-этнаграфічнага музэю называюцца ўсе фонды, зь якіх была сфармаваная калекцыя музэю. Праўда, акрамя Беларускага музэю імя І.Луцкевіча.

Літоўцы інакш чым беларусы шукалі сэрца сваёй краіны. Для іх не была актуальнаю праблема «геаграфічнага цэнтру». Вільня была за межамі Літоўскай рэспублікі. І сёньня сталіца знаходзіцца на паўднёва-ўсходнім ускрайку краіны.

Нягледзячы на ўсю сур'ёзнасьць гэтых праблемаў, чамусьці запамінаеш адну кафлю пач. XVI ст. зь вялікакняскага замку — зайцы смажаць на вогнішчы паляўнічага.

Ян Грэчыц



КНІЖКА МАРАЎ

Субтельний Орест. Україна: історія / Пер. з анг. - 3 вид., перероб. і доп. - Київ: Либідь, 1993. 720 с.: іл.

Тое, што кніжка напісаная канадыйскім прафэсарам, украінцам паводле паходжаньня, прадвызначыла шмат якія яе перавагі. Іх няпроста адчуць тым, чыя гістарычная сьвядомасьць дэфармаваная вучэньнем аб грамадзка-эканамічных фармацыях. Затое звышзадача кнігі — выклад у адным томе тысячагадовай гісторыі Ўкраіны — прадугледжвае пакручасты шлях і небясьпеку схематызму. Не прымаючы марксысцкі дэтэрмінізм як прадвызначанасьць, аўтар ня згодны й з канцэпцыяй вывучэньня гісторыі як найперш працэсу тварэньня дзяржавы. Тым больш для такога ўсходне-эўрапейскага народу як украінцы, чыя гісторыя ведала стагодзьдзі адсутнасьці дзяржавы. Для Арэста Субтэльнага «стрыжань гісторыі» — гэта досьвед, назапашаны пэўнай этнічнай супольнасьцю, якая насяляе зямлю сваіх продкаў.

Дзіўная рэч — у народаў з найбольш блізкімі сёньня афіцыйнымі літаратурнымі мовамі зусім няма ў мінулым узаемадзеяньня. Можна казаць хутчэй пра беларуска-ўкраінскія паралелі. А калі сапраўды параўноўваць, дык ствараецца ўражаньне маскараду. Для ўкраінцаў «слава Кіева», для беларусаў — барацьба Полацка за незалежнасьць. Для ўкраінскіх гетманаў не йснавала альтэрнатывы далучэньня ў XVII ст. да Расеі. Пераяслаўская рада выклікала вайну паміж Рэччу Паспалітай і Масковіяй, а галоўным тэатрам ваенных дзеяньняў стала Беларусь. У выніку другой сусьветнай вайны Ўкраіна павялічыла сваю тэрыторыю за кошт Закарпацкай вобласьці. Потым быў дарунак данайцаў — Крым...

І ўсё ж нейкія тыпалягічныя рысы твораць гэты рэгіён плянэты — Усходнюю Эўропу. Можа быць гэта той досьвед народаў, што пазбаўленыя дзяржаўнасьці?

Нашыя мары й трызьненьні — аб Усходняй Эўропе.

Ян Грэчыц

ПРА БЕЛАРУСЬ

Darski J. Białoruś. Historia, współczesność, konflikty narodowe. — Warszawa: Instytut Polityczny, 1993. — 107 s.

Кніга «Беларусь. Гісторыя, сучаснасьць, нацыянальныя канфлікты» належыць да сэрыі кнігадрукаў, якія выпускаюцца ў Польшчы з мэтай аналізу ўнутры- і зьнешнепалітычных адносінаў паміж дзяржавамі й народамі Сярэдняй і Ўсходняй Эўропы. Акрамя таго, падаюцца кароткія зьвесткі пра пісьменства, культуру, геаграфію, гаспадарку, але ўсё гэта ў той ці іншай сувязі з палітыкай.

Аўтар кнігі Юзаф Дарскі нарадзіўся ў 1952 годзе, закончыў Варшаўскі ўнівэрсытэт, дзе атрымаў адукацыю па спэцыяльнасьці «старажытная гісторыя» й «філялёгія старажытнага Ўсходу». Супрацоўнічаў з польскімі часопісамі, рэдагаваў аддзел у парыскім штомесячніку «Kontakt». З 1986 г. вёў у парыскай «Kultury» «Кроніку ўкраінскую й беларускую», а пазьней і «Кроніку літоўскую». У 1988 годзе падрыхтаваў цыкл «У нашых суседзяў». Звычайна публікуецца на старонках «Uncaptive Minds».

Як вынікае з назвы, кніга падае зьвесткі пра мінуўшчыну Беларусі, а таксама аналізуе палітычную сытуацыю і ўзаемаадносіны нашай краіны з Расеяй, Польшчай, Літвой і Ўкраінай. Зьвернем увагу толькі на некаторыя зьвесткі.

Ва ўступнай інфармацыі нацыянальным сьвятам беларусаў названае 25 сакавіка, дзень абвешчаньня незалежнасьці і ўтварэньня БНР. Што датычыцца жыхароў краіны, то іх 10280000 (1992), у тым ліку 77,9% беларусаў, зь якіх каля 1,6 млн. расейскамоўныя й 6,4 млн. беларускамоўныя; 12,2% (1,342 млн.) расейцаў; 2,9% (291 тыс.) украінцаў; 1,1% (112 тыс.) жыдоў і 7 тыс. літоўцаў (працэнтныя дадзеныя 1989 году). Больш за 2 мільёны беларусаў жывуць на сваіх этнічных тэрыторыях, што знаходзяцца па-за межамі краіны: у Расеі (Браншчына, Смаленшчына, Пскоўшчына), у Латвіі (Дзьвіншчына), у Літве (Віленшчына), у Польшчы (Беласточчына) і на Ўкраіне (у памежных раёнах Палесься і ў буйных гарадах). Зьмешчаны таксама дадзеныя па рэлігійных канфэсіях.

Гістарычныя зьвесткі пачынаюцца з падкрэсьленьня таго факту, што беларускія землі знаходзіліся далёка ад цэнтру Кіеўскай Русі й былі зьвязаныя з балтыйскім рэгіёнам. У той жа час аўтар гаворыць, што беларусамі створаны міт пра Полацкае княства як беларускую дзяржаву, якая адрозьнівалася й была старэйшая за Маскоўскае княства, калі ў рэчаіснасьці ў той пэрыяд яшчэ не было істотнай розьніцы паміж пазьнейшымі беларусамі, украінцамі й расейцамі...

Не пакінута ў баку й пытаньне пра мову. Падкрэсьліваецца, што руская, г.зн. старабеларуская мова, была дзяржаўнай і выконвала гэтую ролю ажно да канца 17 ст. Хоць спачатку карысталіся кірыліцаю, хутка да патрэбаў быў прыстасаваны лацінскі альфабэт. Такім чынам, існавалі дзьве сыстэмы.

Слабасьць беларускага нацыянальнага руху, на думку Ю.Дарскага, вынікае з трох прычынаў: 1. яго (рух) узначальвалі дзеячы, што выходзілі з каталіцтва, у той час, як народ заставаўся праваслаўным, і гэта стварала пэўныя бар'еры; 2. у беларусаў не было больш-менш наглядный вольнасьці, як, напрыклад, у літоўцаў у Прусіі або ўкраінцаў у Галіцыі, адкуль яны б маглі распаўсюджваць нацыянальную культуру; 3. сама Беларусь была занядбаным і ізаляваным краем у адрозьненьне ад латвійска-эстонскіх губэрняў у Лівоніі.

У кнізе зьмястоўна прадстаўленыя часы БНР, а ўвогуле перабег гістарычных падзеяў сканчаецца напрыканцы вайны. Тады, калі Беларуская Цэнтральная Рада з дапамогай нямецкай Службы Бясьпекі правяла II Усебеларускі Кангрэс, які абвясьціў разрыў усялякіх сувязяў з Расеяй і СССР, але ў той жа час не сказаў пра незалежнасьць Беларусі...

Характарыстыка сучаснай палітычнай сытуацыі падаецца з пункту гледжаньня апазыцыі, і таму часам ствараецца ўражаньне падпольна выдадзенай літаратуры.

Аўтар кнігі бачыць дзьве галоўныя прычыны так званага дзьвюхмоўя: эміграцыйная палітыка была накіраваная на выезд беларусаў з Бацькаўшчыны і засяленьне на іх месца расейцаў; сыстэматычная русыфікацыя школьніцтва й культурнага жыцьця. Здаецца, робіць выснову Ю.Дарскі, што канфлікт паміж расейскамоўнымі жыхарамі краіны, якія паступова страчваюць сваё прывілеяванае становішча (пераважна ў навуцы й народнай гаспадарцы), і беларускамоўным людам непазьбежны.

Ва ўзаемаадносінах з Польшчай, Літвой і Ўкраінай праблемы зьвязаныя з тэрытарыяльна-этнічным падзелам у цяперашніх межах. Але, здаецца, усё гэта яшчэ доўгі час будзе непарушнае. І галоўная прычына такой «стабільнасьці» — у нізкім узроўні нацыянальнай сьвядомасьці беларусаў.

У канцы кнігі зьмешчаны бібліяграфічны даведнік, адрасы й тэлефоны асобных выданьняў, партый і палітычных рухаў, прафсаюзаў, а таксама некаторых дзеячоў апазыцыі.

Уладзімер П.Люкевіч

ФРАЗІАЛАГІЧАСКІЙ СЛАВАР

Лепешаў І.Я. Фразэалягічны слоўнік беларускай мовы: У двух тамах. — Менск: «Беларуская энцыкляпэдыя» імя Петруся Броўкі, 1993. — 1197 с.

Калі б нейкі замежны філёляг, які ня ведае незайздроснай спэцыфікі гістарычнага, палітычнага, культурнага, моўнага жыцьця беларусаў, прыехаў сёньня ў Менск з мэтаю скласьці «Фразэалягічны слоўнік беларусаў», дык, паблукаўшы сярод менчукоў, ён склаў бы «Фразеологический словарь русского языка», адметнай рысаю якога была б спрошчанасьць, звульгарызаванасьць, наяўнасьць рэдкіх беларускіх словаў. Калі б той самы філёляг не выяжджаючы на Беларусь, замовіў стос кніжак беларускіх савецкіх пісьменьнікаў, што выходзілі ў паваенны час, дык, папрацаваўшы з тым стосам, ён зноў жа склаў бы той самы «Фразэалягічны слоўнік рускай мовы» у перакладзе на «сучасную» беларускую савецкую мову. Калі ў гэты збор дадаць колькі сотняў фразэмаў усіх часоў і народаў, у тым ліку паўсотні беларускіх, дык атрымаецца слоўнік, які спадар Лепешаў назваў чамусьці «Фразэалягічным слоўнікам беларускай мовы».

Магчыма, гэты ёмісты, ажно на шэсьць тысячаў фразэалягізмаў, двухтомнік і цікавы мовазнаўцам як досьлед сучаснага заняпаднага фразэалягічнага думаньня беларускіх савецкіх пісьменнікаў, але ўжо ніяк ня можа быць «карысны настаўнікам і студэнтам, выкладчыкам навучальных установаў і навуковым работнікам, пісьменьнікам і журналістам, усім, хто цікавіцца беларускай мовай», як пра тое абвешчана ў анатацыі. Сучаснае беларускае жыцьцё вымагае іншага Слоўніка — «Слоўніка праўдзівых беларускіх фразэалягізмаў», а раўналежна можна даць і расейскія адпаведнікі, каб па-сапраўднаму дапамагчы ўсім памянёным у анатацыі. Няўжо пра гэтую надзённую патрэбу (ці як тое па-беларуску?) ня ведаў складальнік «Фразеалагічнага слоўніка» — тутэйшы, у адрозьненьне ад прыдуманага мною, мовазнавец?

Школьнік

Іда Чырвань

З жыцьця літаратурнага пэрсанажа

Юрка Васілеўскі

Двойчы мільганула ў гісторыі літаратурнае імя Іда Чырвань. Аўтарка колькіх беларускамоўных вершаў, яна ня стала паэткай нават сярэдняга ўзроўню. У гісторыі літаратуры ёй выпала іншая роля.


Дачка начальніка Слуцкай тэлефоннай станцыі З.Кобрык, яна ж паэтка-пачаткоўка Іда Чырвань, сталася «музаю» першага шлюбу Кузьмы Чорнага. Мэмуары жонкі паэта Язэпа Пушчы Станіславы Плашчынскай ("Полымя", №6, 1992) асьвятлілі гісторыю кароткага саюзу Чорны — Чырвань. Спадзеючыся завалодаць Язэпам Пушчам, Іда прывабіла ягонага сябра празаіка Кузьму Чорнага. Так спазнала яна «гораду шум», рэстарацыі, іншыя бавы салёнага жыцьця менскіх літаратараў. Урэшце, «непрыгожыя знаёмствы» (азначэньне Ст.Плашчынскай) жонкі ледзь не давялі папулярнага празаіка да самагубства. Ратуючы творцу й сябра, Пушча, Дубоўка ды іншыя літаратары маральна дапамаглі Чорнаму адважыцца скасаваць шлюб.

Аніводная творчая біяграфія аніводным словам не згадала сямейную крызу выдатнага празаіка. Крытыка не заакцэнтавала й ня вытлумачыла спэцыфіку інтымных матываў у зборніку яго апавяданьняў «Пачуцьці» (Менск, 1926). Тым часам, у перажываньнях некаторых літаратурных герояў зборніка ёсьць важкая доля аўтаравага асабістага. З гэтага гледзішча вартае разгляду апавяданьне «Парфір Кіяцкі (Малюнак людзкіх адчуваньняў)». Ці ня зь Іды Чырвань напісаў Чорны накладзеную на вобраз Кіяцкага рэмінісцэнцыю: «сытая, прывабная жанчына, будзіўшая ў ім заўсёды дагэтуль вострыя жаданьні, здавальненьне якіх заганяла некуды далей усе іншыя смуткі і радасьці»? Кіяцкі (і К.Чорны) у фінале пакінуў свой дом і сваю абраньніцу.

«Парфіра Кіяцкага ведаюць ва ўсіх глухіх піўных. Асабліва яго там ведаюць тоўстыя буфэтчыкі і заўсёды падвыпіўшыя гарманісты. Ён мала з кім гаворыць, стараецца не адказваць на пытаньні. Амаль заўсёды маўчыць. Толькі раз, калі яму нехта сказаў аб тым, што жонка яго жыве з загадчыкам канторы, ён філязафічна паглядзеў на гаварыўшага і прачытаў нешта накшталт лекцыі аб сьмеху і сьлёзах. Зь яго гэтых, не зьвязных між сабою, слоў ніхто нічога не зразумеў. Не разумеў іх і ён сам. І калі разумеў што, дык гэта пункт думак, зь якіх яны стараліся выйсьці...»

Сярод дакумэнтаў Магілёўскае філіі літаратурнага аб'еднаньня «Маладняк» захоўваецца аўтабіяграфія Іды Чырвань. Пішучы пра сябе ўвесну 1926 году, яна паспрабавала апраўдацца што да Кузьмы Чорнага. На гэтай даце і абрываецца сьлед паэткі й жанчыны Іды Чырвань.

Кінутая Кіяцкім жонка, паводле К.Чорнага, «перш многа плакала і нудзела, але цераз некалькі месяцаў сышлася з загадчыкам нейкай канторы, маладым і вясёлым чалавекам, і знайшла сабе ў гэтым поўную ўцеху».





Характарыстыка Іды Чырвань

Радзілася ў 1906 годзе ў сям'е паштова-тэлеграфнага чыноўніка ў горадзе Магілеве. Калі мне было 6 гадоў я пачула, што маю сястру (якая была на год старэй за мяне) аддаюць вучыцца ў школу. Я зрабіла гвалт каб аддалі і мяне. У школе мяне ня прымалі казалі малая яшчэ, але я не зьвяртала на гэта ўвагі і хадзіла на лекцыі. Гэтак і засталася ў школе, якую скончыла ў 9 гадоў. Пасьля школы паступіла вучыцца далей.

Яшчэ ледзьве разбірая буквы я захапілася чытаньнем. Чытала ўсё, што пападалася пад рукі. Не заўсёды магла зразумець прачытаннае, але ніколі не прасіла растлумачыць, а рабіла са ўсяго свае вывады. Некаторыя з гэтых дзіцячых вывадаў замацавалісь і пасьля занялі значнае мейсца ў будове маіх сучасных сьветапоглядаў. Праўда ёсьць і шкоднае ад гэтага, але я адчуваю, што тыя погляды у якіх трымаюцца гэтыя дзіцячыя вывады не ламае жыцьцё.

Калі мне йшоў адзінадцаты год я задалася мэтай прачытаць усе творы Льва Талстога; сачыненьне якога поўнасьцю было ў бацькавай бібліотэке.

Я чула як бацька абзываўся аб ім з сур'ёзнай пашанай і бралася яго чытаць з нейкім таемным страхам.

З дзяцінства я ніколі не кідала вызначанай сабе мэты, а праца якую я сабе задала была надта цяжкай для адзінадцацігадовай галавы і па гэтаму прачытаўшы творы Талстога я кінулась у бок лёгкай літаратуры і прачытала бязьлікавую колькасьць раманаў не разьбіраючысь у іх якасьці.

Дзякуючы нэрвовай зморанасьці і напружанасьці зьмест гэтых раманаў не затрымліваўся ў маей галаве.

Грунтоўна праходзіла расейскіх класікаў у школе.

З беларускай літаратурай пазнаёмілася ў 1924 годзе на Агульна адукацыйных курсах, але мяне не здавальняў тэй кавалачак беларусазнаўства які праходзіўся ў нас на курсах і я займалася ім сама.

Пісаць пачала ў 1924 годзе з маленькіх лірычных вершаў на расейскай мове, якія я хавала і нікому не паказвала. Раней яшчэ дзяцёнкам я часта накідывала малюнкі з свайго жыцьця перакладая іх на гумарыстычны тон.

Але як вершы дык і заметкі як дзіцячую забаву я спаліла калі уезжала ў Слуцак у 1925 годзе.

Бачучы неўважлівыя адносіны вучняў курсаў да беларусазнаўства я напісала верш які дзяўчата папаўшы паказалі настаўніку, а тэй накіраваў яго ў вусную газэту курсаў. Пасьля чаго я часта туды давала свае творы. Потым я напісала другі верш лірычны які я ўжо сама паказала настаўніку. Настаўнік накіраваў мяне ў філію «Маладняка» у тэй час яна ў Магілеве толькі яшчэ складалася. Я пачала хадзіць на сходы філіі, але ў філію мяне не залічылі дзеля таго, што я была яшчэ досыць слабой, як з боку мовы, так і з боку зьместу, які брала для сваіх вершаў.

Вясной 1925 года варункі жыцьця прымусілі мяне паехаць у Слуцак, дзе служыў мой бацька. Там так сама зьбіралась філія «Маладняка» у якую я ўступіла сябром 2 жніўня 1925 года.

Мае вершы друкавалісь ў Слуцкай газэце «Вясковы будаўнік». Потым Слуцкая філія выпускала зборнік «Слуцкія песьняры» у які вайшлі мае вершы «Каханьне» і яшчэ.

У Слуцку я пазнаёмілась і сайшлась з вядомым беларускім пісьменьнікам Кузьмой Чорным (Мікалай Раманоўский). 13-га лістапада я уехала з ім у Менск.

Немагу сказаць, што мяне там акрыляла здаровае жыцьцё.

І я б цяпер з вялікай радасьцю і прыемнасьцю выкінула са сваіх успамінаў старонкі гэтага Менскага жыцьця. Але зусім нічога выкінуць нельга але можна адвесьці толькі сваё асабістае прыналежнае яму мейсца.

Узнаўшы бліжэй Кузьмы Чорнага, я спачатку ніяк не магла устанавіць сувязь паміж яго творамі і ім самім, як іх аўтарам. З аднаго боку зморany хваробай чалавек які думае што дні яго пералічаны і ён кожны дзень паўтарае «Каб ты ведала Іда, як я жыць хачу» з другога боку творы і творы новыя і жыцьцёвыя па зьместу.

Але потым мне прышла ў галаву думка чаму гэта ўсе гэроі твораў Кузьмы людзі зморaныя жыцьцём. Не адчуваецца ў іх бадзёрасьці здаровых людзей. Гэта думка правяла сувязь паміж аўтарам і яго творамі.

Вядома блізкасьць такога чалавека адбілась на маім жыцьце і на адносінах да абкружаючых. Я нават пісаць нічога не магла.

У час майго жыцьця ў Менску быў Усебеларускі зьезд пісьменьнікаў. На яго пасяджэньне я хадзіла.

У Кузьмы была многа кніг і я пазнаёмілась там з творамі многіх беларускіх і расейскіх пісьменьнікаў і паэтаў.

Далей жыцьцё склалася так, што мне трэба было паехаць у Магілеў. Тут я прырэгістрыравалась да магілеўскай філіі хадзіла на яе сходы і працягівала працу па галіне знаёмства з новай літаратурай.

З Расейскіх паэтаў мне больш заўсяго падабаюцца твердыя як абрубленные словы Маякоўскага. Усюду брыжжушчый лірызм Есеніна (праўда прыходзіцца згадзіцца з тым, што ён не заўсёды здаровы). З празаікаў Пільняк за асабістае абмалёвываньне прырбды.

З беларускіх пісьменьнікаў прозы Зарэцкага і Бабарэкі за псіхолёгічную вытрыманнасьць гэроеў. Вершы Пушчы за мілагучны лірызм, вершы Дудара за бадзёры уздым і сьмелы погляд уперад. Па адукацыі я скончыла сярэднюю ўстанову ў прошлым годзе, у гэтым годзе умовы склаліся так, што мне ні было магчымасьці паступіць вучыцца далей, але аб далейшай адукацыі я ня кінула думак і рыхтуюся да паступленьня ў вышэйшую установу осенью ў 1926 годзе.

Сама я пішу выключна вершы пераважна лірычныя, але маю мэтай узяцца і за прозу і напісаць некалькі разсказаў з сучаснага жыцьця. Дзеля гэтага я занялась самаадукацыей і прахаджу навейшую і старую літаратуру, а так сама і народную творчасьць.

Іда Чырвань (З.Кобрык)

Прыпіска Бюро філіі: «Сувязь з філіяй трымала ўвесь час. Актыўнасьць слабая. Няглыбокі зьмест творчасьці пры нізкай фармальнай апрацоўцы. Падрыхтоўка да літаратурнай працы і агульнае разьвіцьцё — сярэдняе. Назіраецца цяга к папаўненьню тэарэтычных ведаў».

(БЦДАМЛІМ, ф.225, воп.1, спр.9 арк.69-72)

Іда Чырвань

ЗАКАХАЛАСЯ

Закахалася бурай, грымотай
Што бліскоча і б'е пяруном.
Закахалася сонцам, асокай
працай вольнай яе песьняром.

Закахалася вёскі саломай,
каласамі ячменю, аўса.
Прывітаньне ім шлю я з пакланам:
ў шапаценьні я іхнім расла.

Закахалася гораду шумам,
яго хваляй жыцьця — таўхатнёй.
Захапляе мяне гэты гоман,
Акунуся ў яго з галавой.

Закахалася сьветам ад сонца,
Зіхаценьнем праменьняў ад зор.
Сэрца поўна каханьнем бясконцым —
і складаюцца песьні ў узор.

Слуцкія песьняры. — Менск, 1926.

Французскі погляд на Эўропу зь Вільні

Гутарка супрацоўніка «НН» Сяргея Шупы з культурным аташэ францускага пасольства ў Вільні Фрэдэрыкам Жюжо

С.Ш.: Ці Вы адчуваеце сябе тут як у Эўропе?

Ф.Ж.: Так, абсалютна. Паводле архітэктуры... Горад Вільня — выразна цэнтральнаэўрапейскі горад. Гісторыя сьведчыць пра гэтую супольнасьць, тую самую, у якой Гішпанія, Францыя і далей — прынамсі да балтыйскіх краінаў. У штодзённым жыцьці, ці дакладней, у дачыненьнях зь літоўцамі, мы разумеем адны адных, мы маем аднолькавы лад мысьленьня, агульныя гістарычныя, культурныя й літаратурныя пункты судачыненьня, і ў прыватнасьці паміж літоўцамі й французамі існуе эмацыйная прыязнасьць, я б нават сказаў сяброўства, натуральнае разуменьне, што базуюцца на гэтым супольным культурным асяродзьдзі, на нашай эўрапейскай спадчыне. Вядома ж, усё гэта можна дэталізаваць...

С.Ш.: Дзе ўсё ж праходзіць мяжа? Дзе канчаецца Эўропа?

Ф.Ж.: У Вільні была арганізаваная канфэрэнцыя «Эстэтыка й штодзённае жыцьцё ў Эўропе», і самымі бліскучымі прамоўцамі, што бралі ў ёй удзел, былі Крыстоф Паміян, паляк з паходжаньня, які выкладае ў Францыі, і Антон Ліма, чэх, які таксама жыве ў Францыі. Кожны зь іх даў сваю дэфініцыю Эўропы. Асабліва мне запомніліся некалькі заўвагаў Крыстофа Паміяна, дзе ён сказаў, што ёсьць Эўропа мінарэтаў і Эўропа званіцаў, ёсьць Эўропа капусная й Эўропа бульбяная... Эўропа поўная разнастайнасьцяў. Існуе цэлы шэраг мерапрыемстваў, мэта якіх — зрабіць з Эўропы пэўную еднасьць... Напрыклад, у галіне кінэматаграфіі, нядаўна мы падпісалі кантракт, які завецца «Эўропа-Сінэма», зь дзьвюма кіназаламі Вільні, першымі залямі ў Цэнтральнай і Усходняй Эўропе, што будуць інтэграваныя ў сетку, якая ўжо цяпер злучае каля шасьцідзесяці кіназалаў у Заходняй Эўропе. Гэта аднак ня значыць, што мы імкнемся да уніфармізацыі, стандартызацыі, гэткай, як на амэрыканскай тэрыторыі, дзе Амэрыка паўсюль бароніць тую самую культуру й тыя самыя каштоўнасьці — ад Вашынгтону да Нью-Ёрку, хоць трэба вылучаць адрозьненьні. Існуе значна большая уніфармізацыя ўнутры амэрыканскай тэрыторыі, чым унутры эўрапейскай, чыя гісторыя значна больш складаная, дзе значна ярчэй выяўляецца партыкулярызм. Аднак я лічу, што сёньня адбываецца працэс, у якім ёсьць адначасовыя імкненьні падкрэсьліць гэты партыкулярызм, нават унутры нацыяў, краінаў, падкрэсьліць рэгіянальныя партыкулярызм, і разам з тым паказаць гэтую еднасьць. Дык вось, цяпер сказаць, дзе пачынаецца або канчаецца Эўропа, — гэта залежыць ад канкрэтнай галіны, ад уяўленьняў кожнага і ад дэфініцыяў, якія пры гэтым выкарыстоўваюцца.

С.Ш.: Улічыўшы ўсё сказанае вышэй, што можна сказаць пра Беларусь? Калі глядзець на яе зь Вільні, з Эўропы...

Ф.Ж.: Наколькі я мог зразумець, тоеснасьць Беларусі акрэсьліць значна цяжэй, чым тоеснасьць такой краіны, як Літва. У Літве 80% жыхарства гаворыць па-літоўску, нават болей, бо сярод польскае й расейскае грамады таксама шмат хто гаворыць па-літоўску. У Беларусі гавораць па-расейску, а па-беларуску гавораць вельмі мала. І вось гэты фактар еднасьці й сцьвярджэньня сваёй культурнай тоеснасьці ўскладняе выдзяленьне сябе як культурнае нацыі ў дачыненьні да сваіх суседзяў. Апрыёрна я магу сказаць, што ў мяне склалася ўражаньне, нібыта Беларусь хутчэй складае частку... больш прыцягваецца гіганцкім магнітным полем Расеі, чым Літвы — я не жыву ў Літве з пачуцьцём, што існуюць надзвычай разьвітыя сувязі паміж Літвой і Беларусяй, як яны могуць існаваць... як існуе супольнасьць пацьверджаных інтарэсаў, хоць і даволі слаба разьвітая, паміж Літвой і Латвіяй, напрыклад.

С.Ш.: Існуе канкурэнцыя паміж францускай культурай і іншымі вялікімі культурамі хрысьціянскага сьвету, прыкладам, ангельскай або англасаксонскай — ці Вы бачыце істотную розьніцу паміж ангельскай і гэткай жа англамоўнай амэрыканскай культурай? — дзе месца культуры францускай у межах гэтае канкурэнцыі? У чым палягае супрацьстаяньне гэтых культураў? Чаму супрацьстаўляе сябе француская культура і якая яе місія ў гэтым сьвеце? Рэч у тым, што культурная дзейнасьць францускае амбасады значна шырэйшая, чым амбасады якой іншай краіны тут. Іншых амаль не цікавяць праблемы культуры, прыкладам італійская ня мае нават пасады культурнага аташэ...

Ф.Ж.: Усім відавочна, што ангельская мова й англасаксонская культура вельмі пашыраныя ў сьвеце, гэта адчуваюць на сабе й французы, гэта адчуваецца і ў Францыі — людзі значна больш ходзяць на амэрыканскія фільмы, чым на францускія, француская тэлевізія багата нагружаная амэрыканскімі перадачамі, і сам францускі лад жыцьця вельмі часта зазнае англасаксонскі культурны ўплыў — цікуў у музыцы, цікуў вопратцы. Толькі што мы гаварылі пра эўрапейскі партыкулярызм, і вось я думаю, што Францыя ўсё ж захавала яскрава выяўлены партыкулярызм. Францыя была на працягу мінулых стагодзьдзяў вялікаю дзяржавай, ва ўсялякім выпадку яна дамінавала ў сьвеце як культурная дзяржава. Магчыма, сёньня гэта выяўляецца ўжо не ў такой ступені, аднак была захаваная пэўная традыцыя пашырэньня францускай культуры й мовы, і цяпер назіраецца імкненьне падтрымаць франкамоўнасьць, і калі Францыя надалей гэта робіць, дык таму, што яна заўважае ў розных краінах сьвету, якія мелі дачыненьне да францускай культуры й мовы, патрэбу з боку гэтых краінаў. Гэта датычыць добрай паловы краінаў Афрыкі, Квэбэку, Бэльгіі — буйнейшых франкамоўных краінаў, гэта датычыць таксама й Сярэдняга Ўсходу, увогуле ўсіх колішніх францускіх калёніяў. Калёніі не абавязкова значылі запрыгоньваньне, былі таксама й пераважны кантакт з францускай культурай, а таксама тое, што завецца навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва, якое йснавала ў іншай форме ў каляніяльныя часы. Так што францускае панаваньне пакінула па сабе на культурным узроўні вельмі пазытыўныя аспэкты. Таму гэта зусім не апантаны экспансіянізм з боку Францыі, а вельмі часта выразная патрэба, што высьпявае ўнутры саміх гэтых краінаў. Парыж быў культурнай сталіцаю заходняга сьвету. Цяпер Францыя, надзеленая гэтай культурнай гісторыяй ды тым, што яна была прысутная ў шматлікіх краінах сьвету, імкнецца мабілізаваць сродкі таго, што завецца «культурнай дыпляматыяй». Гэтага нельга сказаць пра ўсе эўрапейскія краіны. Усе эўрапейскія краіны таксама ня маюць такой цэнтралізаванай сыстэмы адміністрацыйнага й дзяржаўнага функцыянаваньня, як Францыя. Вага адміністрацыі ў Францыі й яе сіла, яе зладжанасьць, яе цэнтралізаванасьць, яе цяжар таксама — гэта традыцыя, якая захавалася з часоў Напалеона, ад часоў інтэграцыі францускіх правінцыяў у францускую нацыю. Прыкладам, Нямеччына або Італія маюць зусім іншую гісторыю й сыстэму адміністрацыі, вага земляў у Нямеччыне значна больш істотная, і супрацоўніцтва паасобных земляў рэгулюецца непасрэдна імі, а не абавязкова ў Боне, тым часам як асноўная частка францускіх кантактаў праходзіць праз Парыж і праз амбасады. Гэта яшчэ адна прычына, якая тлумачыць Вашае сьцьверджаньне. У Італіі органы ўлады значна больш падзеленыя геаграфічна, чым у Францыі.

С.Ш.: Якім Вы бачыце лёс францускае мовы й культуры ў гэтым сьвеце, які ўсё больш інтэгруецца й робіцца аднастайным? Што будзе праз стагодзьдзе?

Ф.Ж.: Думаю, што калі Францыя будзе працягваць сваю палітыку падтрымкі францускае мовы, няма ніякіх прычын баяцца, што гэтая культурная сыстэма зьнікне. Француская мова прысутная ў сьвеце ўжо некалькі стагодзьдзяў, можна сабе ўявіць, што яна будзе йснаваць і яшчэ праз стагодзьдзе. Гэта будзе залежаць і ад гісторыі Эўропы — ці Эўропа будзе мець дастаткова мудрасьці, каб захаваць свой партыкулярызм і не ўніфармізаваць усё. Уніфармізацыя Эўропы мела б сур'ёзныя наступствы, бо тады было б страчанае багацьце, што вынікае з разнастайнасьці Эўропы. Думаю, што лёс францускае мовы ў сьвеце зьвязаны зь лёсам Францыі ў Эўропе і зь яе «выпраменьваньнем».

С.Ш.: А калі ўзяць партыкулярызм на ўзроўні этнічных меншасьцяў, прыкладам у Францыі?

Ф.Ж.: Цяпер у Францыі якраз адбываецца адраджэньне рэгіёнаў, рэгіянальных культур, якія пацярпелі цяжкія страты... Сёньня, калі шкода ўжо спрычыненая, усё ж прадпрымаюцца спробы адрадзіць іхныя культуры. У той самы час, калі пачалі шмат гаварыць пра Эўропу супольнасьцяў, у Францыі пачаліся размовы пра дэцэнтралізацыю, і некаторыя дзяржаўныя органы, вялікія прадпрыемствы й навучальныя ўстановы былі перанесеныя з Парыжу ў правінцыйныя гарады, каб ажывіць пэўныя рэгіёны. Разам з тым у рэгіёнах была ўсьведамленая небясьпека празьмернае цэнтралізацыі Францыі, улічваючы ўніфармізацыю Эўропы, у супрацьвагу гэтаму, праз дух пярэчаньня, праз натуральную раўнавагу, гэта надало вагі гэтаму ўсьведамленьню, гэтай дзейнасьці ў падтрымцы тоеснасьці рэгіянальных культураў.

С.Ш.: Ці верыце Вы ў будучыню Эўропы?

Ф.Ж.: Я думаю, што будучыня Эўропы вельмі складаная, але цяпер вельмі захапляльная, бо Эўропа мае багаты патэнцыял. Адбываюцца, вядома ж, і сумныя рэчы, як у Югаславіі, і гэта нагадвае адзначыць гісторыю Эўропы 80—90-х гадоў. З другога боку ёсьць шмат іншых надзвычай пазытыўных фактараў, якія нясуць з сабою шмат спадзяваньняў што да эўрапейскай супольнасьці, у якую я веру.

КАМЕНЬ, ЯКІ РАСЬЦЕ

Працяг са старонкі 5

— Ну, — сказаў мэр, — я, як мэр горада, спадар Кавалья, што перад вамі, потым — капітан порту, ну, і яшчэ некалькі, менш важных. Зрэшты, вам ня трэба будзе выдаткоўваць на іх шмат увагі: яны не гавораць па-француску.

Д'Ара паклікаў Сакрата й папярэдзіў, што вернецца каля паўдня.

— Добра, — сказаў Сакрат. — Я пайду ў Сквэр з фантанам.

— У Сквэр?

— Так, тут усе ведаюць. Ня трэба баяцца, пане д'Ара.

Шпіталь, як, выходзячы, заўважыў д'Ара, стаяў на самым ускрайку лесу, цяжкія шаты якога навісалі над дахамі. На ўсю гэтую масу расьлін безупынку ападала суцэльнае імжыстае покрыва, якое раскошасты лес бясшумна ўбіраў у сябе, як велізарная губка. Горад — каля сотні дамоў, крытых паліняльнай дахоўкай,— туліўся паміж лесам і ракою, далёкі подых якой далятаў да шпіталя. Машына рушыла па раскіслых вуліцах і неўзабаве выехала на даволі шырокі чатырохкутны пляц, заліты вялікімі й маленькімі лужынамі, паміж якімі, у чырвонай глеістай глебе, відненіся адбіткі аўтамабільных шын, жалезных абадоў і капытоў. Па пэрымэтры пляц абступалі нізенькія рознакаляровыя домікі з тынкаванымі сьценамі, а за імі высіліся дзьве круглыя блакітна-белыя вежы касьцёла ў каляніяльным стылю. Па-над усім гэтым голым убранствам лунаў водар солі, што далятаў ад [illegible]. На сярэдзіне пляцу тапталіся [illegible] наскрозь прамоклых постацяў, а [illegible] дамоў, млява жэстыкулюючы, тоўкся пярэсты натоўп гаўчо, японцаў, мяшаных індэйцаў і згрэбна апранутых «знакамітых людзей», чорныя гарнітуры якіх выглядалі тут экзатычна. Прапускаючы аўтамабіль, натоўп нетаропка расступіўся ўбакі й правёў яго позіркам. А калі машына перад адным дамком нарэшце спынілася, вакол яе адразу вырасла маўклівая сьцяна мокрых гаўчо.

Клюб месьціўся на другім паверсе і ўяўляў сабою нешта накшталт невялічкага бара з бамбукавым прылаўкам і круглымі аднаногімі столікамі з бляшанымі стальніцамі. «Знакамітых людзей» было шмат. Мэр, узьняўшы шклянку з трысьняговай гарэлкай, прамовіў тост за прыезд пана інжынэра й шчасьце ва ўсім сьвеце, і ўсе выпілі ў гонар д'Ара. Але калі д'Ара, папіваючы, прымасьціўся каля вакна, да яго раптам падыйшоў здаравушчы ўамбіза ў каротказ наезьніцкіх нагавіцах і скураных гамашах і, крыху пагойдваючыся, залапатаў нешта не зусім зразумелае, з чаго інжынэр улавіў толькі адно слова: «пашпарт». Без асаблівай упэўненасьці ён дастаў дакумэнт, і бамбіза, схапіўшы яго зь вялікаю прагнасьцю, пачаў гартаць, усім выглядам паказваючы сваю яўную незадаволенасьць. Потым ён нешта залапатаў зноў, трасучы кніжачкай перад носам у інжынэра, але той глядзеў на свайго гнеўнага суразмоўніка абсалютна спакойна. У гэтую хвіліну да іх падыйшоў судзьдзя й, ветліва ўсьміхаючыся, запытаўся, пра што йдзе гаворка. П'яноға пэўную хвіліну аглядаў крохкую фігуру таго, хто асьмеліўся яго перапыніць, і потым, пахіснуўшыся яшчэ небясьпечней, затрос пашпартам перад вачыма ўжо новага суразмоўніка. Д'Ара тым часам мірна прысеў каля століка й пачаў чакаць, чым усё скончыцца.

Дыялёг пераходзіў на даволі павышаны тон, і раптам судзьдзя выбухнуў такім аглушальным голасам, якога ад яго абсалютна немагчыма было чакаць. Бамбіза адразу змоўк і адступіў з выглядам дзіцяці, якое засьпелі на дрэнным учынку. Пасьля грымотнай судзьдзёвай тырады ён бокам-бокам, як пакараны свавольнік, скіраваў да дзьвярэй і зьнік за парогам.

Судзьдзя, голасам, да якога зноў вярнулася мілагучнасьць, пачаў тлумачыць д'Ара, што гэты грубіян — а гэта, як высьветлілася, быў начальнік паліцыі — меў нахабства сьцьвярджаць, нібыта ў пашпарце нечага не хапае, але за сваю выхадку ён будзе пакараны. Потым Кавалья павярнуўся да «знакамітых», што ўжо абступілі яго з усіх бакоў, і, здаецца, пра нешта пачаў з імі раіцца. Пасьля кароткай размовы судзьдзя ўрачыстым тонам папрасіў у д'Ара прабачэньня, запэўніў, што, безумоўна, нічым, апроч ап'яненьня, нельга растлумачыць такое поўнае забыцьцё пачуцьцяў удзячнасьці й павагі, якія мусяць адчуваць да яго ўсе жыхары Ігуапы, і ўрэшце прапанаваў пану інжынэру зрабіць ім вялікую ласку й самастойна абраць пакараньне, якое варта было б прызначыць гэтаму гораліцыянту. Д'Ара запэўніў, што ня хоча ніякага пакараньня, і ўвогуле — гэта зусім ня варты ўвагі выпадак, а лепей было б хутчэй пайсьці да ракі. Тады слова ўзяў мэр, ён зь вельмі кранальнаю дабрынёю пачаў тлумачыць, што пакараньне ўсё-такі абсалютна неабходнае й вінаваты ўжо зараз будзе адпраўлены пад арышт, а яны ўсе тым часам пакорліва будуць чакаць, калі іх высокі госьць ласкава захоча вырашыць яго лёс. Ніякія пярэчаньні ня здолелі зламаць яго расквечанай усьмешкаю строгасьці, і д'Ара вымушаны быў паабяцаць, што падумае. З тым усе й выправіліся ў ніжнія кварталы.

Рака ўжо шырока разьліла свае воды па нізкіх, сьлізкіх берагах. Яны пакінулі ззаду апошнія дамы Ігуапы й былі цяпер паміж ракою й высокім стромым адхонам, да якога туліліся хаціны з саману й гальля. Перад імі ад самага краю насыпной гаці зноў рэзка паўставаў густы лес, такі самы, як на другім беразе. Але воды прагал паміж дрэвамі хутка пашыраўся, пераўтвараючыся ў адну суцэльную, ня вельмі выразную лінію, дзе жаўцізна трошкі шарэла: там пачыналася мора. Д'Ара моўчкі рушыў да адхона, на якім паводкамі рознае вышыні былі пакінутыя яшчэ сьвежыя сьляды. Гразкая сьцежка вяла ўгару — да хацін, перад якімі, маўкліва пазіраючы на прыйшлых, стаялі нэгры. Некаторыя адасобіліся парачкамі й трымалі адно аднаго за рукі, а на самым краю гаці, перад дарослымі, шырока вылупіўшы вочкі, выстраіліся шнурочкам зусім кволыя нэгрыцяняты з раздзьмутымі жыватамі й танюткімі ножкамі.

Дайшоўшы да хацін, д'Ара жэстам паклікаў начальніка порту. Гэта быў тоўсты ўсьмешлівы нэгар у беласьнежнай уніформе. Д'Ара папытаўся ў яго па-гішпанску, ці можна зайсьці ў якую-небудзь хаціну. Начальнік быў у гэтым абсалютна ўпэўнены й лічыў нават, што гэта цудоўная думка: пан інжынэр пабачыць там нямала цікавага. Ён павярнуўся да

Шарль Бадлер

ДА ЧЫТАЧА

Прывыкла ў нас душа і цела без агіды
Прымаць паскудзтва, грэх, дурноту і крутню.
Мы сыцім без згрызот нам любую гайню,
Як тыя жабракі, што кормяць вошы й гніды.

Выносьлівы наш грэх, а каяньне, як рыба,
Што гіне без вады, — і кожны з нас бяжыць
У радасьці назад, у твань, з надзеяй змыць
Няшчырымі сьлязьмі заганы нашы й хібы.

Вучоны Трысмэгіст загойвае памалу
На ложы зла й граху ачмураны наш дух,
Аж выпарыў нашчэнт з нас гэты хімік-зух
Усе да аднаго каштоўныя мэталы.

Так, гэта Д'ябал нас трымае пад апекай!
І звабай гідкае ўсё пляміць назнарок;
Глядзім бяз жаху мы ў прапахлы серай змрок,
Штодня спускаемся на крок бліжэй да Пекла.

Бы ўбогі рэспут той, што зьвялую пахвіну
Старой гетэры сьсе й цалуе ўнасалодзь,
Гэтак і мы сабе шукаем слодыч, хоць
Яна ўжо выціснутым стала апэльсінам.

Нібы мільён глістоў, у мозгах карагодзіць
Зданьнё са сьвіты Сатаны, і неўпрыкмець
У нашы лёгкія з уздыхам кожным Сьмерць
Ракою цёмнаю са стогнам уваходзіць.

Калі яшчэ штылет, пажар, яд, юр жывёльны
Ня вышылі на тле нікчэмных лёсаў свой
Злавесны сылюэт, дык гэтаму віной
Нямогласьць нашых душ, ні да чаго ня здольных.

Аднак сярод гіен, шакалаў, павіянаў,
Грыфонаў, павукоў, гадзюк, нетапыроў,
Жахлівых монстраў, што выцьцём халодзяць кроў,
У збрыджаным наскрозь зьвярынцы ўсіх заганаў,—

Ёсьць горшая з пачвар, найбрыдшая зь мярзотных!
Хоць лішні жэст і крык не на яе капыл,
Ды ўсю зямлю яна раструшчыла б на пыл
І позіхам адным зглынула б сьвет ахвотна;

Завуць яе Нуда! — пакурвае цыгару
Нясьпешліва й глядзіць на эшафот праз дым
Сьлязьлівым вокам. Ты, чытач, мой пабрацім,
Ты знаеш гэтую галянтную пачвару!

Пераклаў Алег Мінкін,
падрадковікі Севярына Квяткоўскага



Малюнак Дзяніса Раманюка

нэграў і доўга нешта ім гаварыў, паказваючы то на д'Ара, то на раку. Тыя слухалі моўчкі. Але калі начальнік змоўк, ніхто не варухнуўся. Ён загаварыў зноў, ужо болей нецярплівым голасам, і нарэшце зьвярнуўся асабіста да аднаго мужчыны, які ў адказ закруціў галавой. Тады начальнік прамовіў колькі кароткіх словаў загадным тонам. Мужчына адыйшоў ад сваёй групкі, павярнуўся тварам да д'Ара й жэстам паказаў, кудою йсці. Гэта быў чалавек даволі сталага веку, яго кароткія кудзеры былі ўжо кранутыя сівізной, ён меў тонкі, зморaны твар, але яшчэ маладое цела з дужымі плячыма й мускуламі, якія ўгадваліся пад палатнянымі нагавіцамі й падранай кашуляй. Яны пайшлі па новым, болей адложыстым адхоне, і сьледам за імі пацягнуліся начальнік порту і ўвесь нэгрыцянскі натоўп. Гліняныя, бляшаныя, трысьняговыя хаты, што стаялі вакол, так слаба трымаліся за зямлю, што ўнізе з усіх бакоў іх давялося абкласьці камянямі. Насустрач ім трапілася жанчына, якая, сьлізгаючы босымі нагамі па гразкай сьцяжыне, несла ўніз поўны бляшаны бідон з вадой, трымаючы яго на галаве. Потым яны апынуліся на невялічкай пляцоўцы, абгароджанай з трох бакоў хацінамі. Мужчына ступіў да адной, штурхануў бамбукавыя дзьверы, што трымаліся на прывязках, зробленых з тонкіх ліянаў, і, прапускаючы інжынэра, моўчкі адыйшоў убок, пазіраючы на яго абсалютна халоднымі вачыма. У хаце д'Ара спачатку ня ўбачыў нічога апроч кволага вогнішча, раскладзенага на зямлі якраз пасярэдзіне пакоя. Потым у дальнім куце, углыбіні, ён разгледзеў мядзяны ложак з голай правіслаю сеткай, а ў другім — столік з нагрувашчаным на ім гліняным посудам, і паміж імі — нешта накшталт козлаў зь вялікаю храмаграфіяй, зь якой глядзела выява Сьв. Юр'і. Болей тут не было нічога, апроч кучы ануч, справа каля ўваходу, і некалькіх рознакаляровых набедраных павязак, што сушыліся над агнём пад стольлю. Д'Ара стаяў, удыхаючы пахі вогнішча й галечы, што падымаліся ад зямлі й даўка падступалі да горла. Раптам начальнік порту пляснуў у яго за сьпінай у далоні, і, азірнуўшыся, інжынэр убачыў, як у дзьвярной пройме супраць сьвятла ўзьнікла зграбная постаць маладой нэгрыцянкі, якая нешта яму працягнула. Ён узяў шклянку й рэзкім глытком выпіў густую трысьняговую гарэлку, што ў ёй аказалася. Дзяўчына зноў працягнула паднос, прыняла пустую шклянку й адным рухам зьнікла за дзьвярыма. Гэты рух быў такі мяккі й цёплы, што ў д'Ара раптам узьнікла жаданьне яе затрымаць.

Але выйшаўшы сьледам, ён ня здолеў яе пазнаць у натоўпе нэграў і «знакамітых людзей», што абступалі хаціну. Тады ён падзякаваў старому, які адно моўчкі нахіліў галаву, і ўсе рушылі. Начальнік порту йшоў сьледам за інжынэрам і зноў нешта тлумачыў яму, пытаючыся, калі Францускай кампанія ў Рыё магла б распачаць работы й ці можна паставіць дамбу да пачатку вялікіх дажджоў. Д'Ара гэтага ня ведаў, але, па шчырасьці, ня думаў, каб гэта было магчыма. Пад неадчувальным дажджом яны спускаліся да ракі, ад якой патыхала сьвежасьцю. Д'Ара прыслухоўваўся да прасторнага, шырокага пошуму, які безупынна акружаў яго з той самай хвіліны, як ён прыехаў сюды, і ня мог зразумець, ці гэта шолах вады ці дрэваў. Апынуўшыся зноўку на беразе, ён паглядзеў удалечыню, на пярэстую лінію мора, тысячы кілямэтраў самотных водаў, за якімі ляжала Афрыка, а яшчэ трошкі далей — Эўропа, зь якой ён прыехаў.

— Капітан, — спытаў ён у начальніка порту, — чым жывуць гэтыя людзі, у якіх мы былі?

— Працуюць, калі бываюць патрэбныя, — сказаў капітан. — Мы тут бедныя!

— А гэтыя, відаць, найбяднейшыя?

— Гэтыя — найбяднейшыя.

Судзьдзя, які якраз падыйшоў да іх, крыху сьлізгаючы па гразі ў сваіх тонкіх чаравіках, паведаміў, што ўсе гэтыя людзі ўжо вельмі палюбілі пана інжынэра за тое, што ён дасьць ім працу.

— А ўвогуле, — сказаў ён, — ведаеце, яны цэлымі днямі сьпяваюць ды танчаць.

І тут жа, безь ніякага пераходу, ён спытаў у д'Ара, ці падумаў ён пра пакараньне.

— Якое пакараньне?

— Ну, нашаму начальніку паліцыі.

— Трэба яго адпусьціць.

Судзьдзя сказаў, што гэта немагчыма і што пакараньне павінна быць. Але д'Ара ўжо йшоў да горада.

Упрыгожаны гронкамі незнаёмых кветак, што зьбягалі ўздоўж ліянаў паміж бананавымі дрэвамі й пандусамі, невялікі Сквэр з фантанам, насычаны цёплай імжой, здаваўся казачным і ласкавым. Сьцяжынкі на скрыжаваньнях былі пазначаныя вільготнымі крушнямі, і ў гэты час тут гуляў вялікі пярэсты натоўп. Мэтысы, мулаты, гаўчо, ціха перагаворваючыся, нетаропкай ступою хадзілі па бамбукавых прысадах, якія вялі туды, дзе кусты й зарасьнік паступова гусьцелі, ператвараючыся ў суцэльную непралазную нетру. Там, адразу, безь ніякага пераходу, пачынаўся лес.

Д'Ара шукаў у натоўпе Сакрата, але той зьнянацку наляцеў на яго ззаду.

— Сьвята, — сьмеючыся крыкнуў Сакрат і, абапёршыся на высокія інжынэравы плечы, падскочыў на месцы.

— Якое сьвята?

— Хэ! — зьдзівіўся Сакрат, ужо стаўшы да д'Ара тварам.— Ты ня ведаеш? Сьвята пана Ісуса. Кожны год усе з малатком ідуць да пячоры.

І Сакрат паказаў не на пячору, а на купку людзей, якія, нібыта нечага чакаючы, стаялі ў закутку Сквэра.

— Разумееш! Аднойчы была статуя пана Ісуса, яна прыплыла з мора, уверх па рацэ. Яе знайшлі рыбакі. Такая прыгожая! Такая прыгожая! Тады яны яе тут памылі, у пячоры. А цяпер у пячоры пачаў расьці камень. І кожны год — сьвята. З малатком адбіваеш, адбіваеш кавалачкі — асьвянцоныя, на шчасьце. А потым ён — вось, заўсёды расьце, а ты заўсёды адбіваеш. Гэта такі цуд.

Яны падыйшлі да пячоры, нізкі ўваход у якую ўгадваўся над галовамі людзей,

Працяг на старонцы 10



O.W. Milosz

Оскар Уладзіслаў Любіч-Мілаш (1877-1939)

Оскара Мілаша беларуская культура праспала.

Калі ён, парыскі паэт, вандроўнік-касмапаліт, расейскі грамадзянін, сын жыдоўкі, народжаны ў польскай мове, ліхотамі Першае Сусьветнае вайны быў загнаны ў крэсла французскага службоўца, ён востра адчуў сваю Бяздомнасьць. І тады, напружыўшы памяць і падсьведамасьць, з старых паданьняў і родавых успамінаў, з прывідаў і туманоў зямлі маленства, зь сьненьняў няведамага бога ён стварае сваю Краіну Мараў — яе тапаграфія, так добра нам знаёмая, была падрабязна апісаная Баршчэўскім і Кіркорам, Ластоўскім і Драздовічам...

Каб знайсьці свой Дом, засталося зрабіць адзін крок — атаясаміць гэтую Краіну Мараў з канкрэтнай плямай на карце й вярнуцца, хоць бы толькі духам, ва ўлоньне рэальнае Бацькаўшчыны. Мілаш робіць гэты крок — і... трапляе зь Літвы ў Летуву.

Што з таго, што той самы набор міталягемаў з папраўкай на мову й геаграфію спараджае зусім іншую краіну...

Беларусь у часы пакутлівых пошукаў Мілаша, толькі прачнуўшыся, ледзь прадзірала вочы, няўцямна пазіраючы на сьвет, у густым геапалітычным сутоньні яе недабудаваны Дом яшчэ ня быў відзён нават зблізку — што ўжо там казаць пра далёкі Парыж.

Беларусь шмат страціла ад Мілашавага выбару — калі б яна займела ў ягонай асобе хоць бы гэткага ж апантанага прапагандыста, якім ён стаўся для Літвы! (А ён, нягледзячы на расчараваньні й сумлевы, быў верны свайму выбару да сьмерці, за што Літва й дагэтуль сплочвае яму шчыры доўг удзячнасьці.)

Страціў і сам Мілаш, бо так і ня здолеў атаясаміць сябе лінгвістычна з Абраным Краем, як ня здолеў і пашырыць яго межы настолькі, каб ён абняў у сабе й родную Мілашаву Чарэю, якая, пэўна, і была для яго Найсапраўднейшай Літвою, да якой дадалася ўся астатняя.

КАМЕНЬ, ЯКІ РАСЬЦЕ

Працяг са старонкі 9

якія нечага чакалі. Усярэдзіне, у прыцемку, пранізаным дрыготкімі агеньчыкамі сьвечак, на кукішках, стукаючы малатком, сядзеў нейкі сылюэт. Нарэшце чалавек устаў і, выставіўшы ўсім на паказ разгорнутую далонь, выйшаў: гэта быў худы гаўчо з доўгімі вусамі; ён нёс маленькі кавалачак мокрага сланцу, але тут жа асьцярожна схаваў яго ў кулаку й рушыў прэч. Тады, нахіліўшыся, у пячору ўвайшоў другі чалавек.

Д'Ара азірнуўся. Вакол, не зьвяртаючы на яго ўвагі й не адчуваючы ймжыстай смугі, што апускалася з дрэваў, чакалі паломнікі. І ён таксама — чакаў, стоячы тут, перад гэтай пячорай, у гэтым самым вільготным тумане,— чакаў, сам не ведаючы чаго. Але ён чакаў сапраўды, чакаў увесь час, ужо цэлы месяц, з таго самага дня, як прыехаў у гэтую краіну. Ён чакаў у чырвонай сьпёцы вільготных дзён і ў дрыготкім сьвятле дробных зор уначы, нягледзячы на свае абавязкі й пастаўленыя задачы, дамбы, якія трэба было збудаваць, і дарогі, што трэба пракласьці,— нібыта праца, дзеля якой ён прыехаў сюды, была толькі падставай, прычынай, што дазволіць здарыцца чамусь неспадзяванаму, якой-небудзь сустрэчы, пра якую нават ня думаў, але ўвесь час чакаў — тут, на краі сьвету. Ён схамянуўся й, прайшоўшы скрозь невялікі натоўп, у якім ніхто так і не зьвярнуў на яго ніякай увагі, рушыў да выхаду. Трэба было вяртацца да ракі й працаваць.

Але каля брамы ён зноў натрапіў на Сакрата, які самазабыўна й шматслоўна гутарыў зь невысокім каржакаватым таўстуном. З выгляду гэта быў нэгар, але скура ў яго была хутчэй жоўтая. Цалкам агалены чэрап яшчэ больш павялічваў яго прыгожы магутны лоб, а яго твар аздабляла пастрыжаная квадратам густая чорная барада.

— Во, гэта — чэмпіён! — сказаў Сакрат, як бы знаёмячы д'Ара з суразмоўнікам. — Заўтра ён павядзе працэсію.

Чалавек, апрануты ў марацкі гарнітур з грубае саржы й паласаты бела-сіні нацельнік, што выглядаў з-пад матроскае блузы, уважліва разглядаў д'Ара спакойнымі вачыма. А яго поўныя бліскучыя вусны шчыра ўсьміхаліся інжэнэру, паказваючы на зайздрасьць белыя зубы.

— Ён размаўляе па-гішпанску, — сказаў Сакрат і павярнуўся да незнаёмца. — Вось, раскажы пану д'Ара.

І з гэтымі словамі ён рушыў да іншай групы. Незнаёмец перастаў усьміхацца й са шчырай цікаўнасьцю зірнуў на д'Ара.

— Цябе гэта цікавіць, капітане?

— Я не капітан, — сказаў д'Ара.

— Ну, ня ведаю. Ты — сэньёр. Мне так сказаў Сакрат.

— Я — не. Гэта мой дзед быў. І яго бацька таксама. Ну, і ўсе, хто быў да яго бацькі. А цяпер сэньёраў у нашых краінах няма.

— Ага! — сказаў нэгар, засьмяяўшыся. — Ясна, цяпер усе сэньёры.

— Не, усё ня так. Цяпер няма ні сэньёраў, ні прасталюдзінаў.

Той задумаўся і ўрэшце рашыўся:

— Што, ніхто не працуе, ніхто не пакутуе?

— Ды не, такіх мільёны.

— Значыць, яны прасталюдзіны.

— Ну, калі так, дык сапраўды, ёсьць і прасталюдзіны. Але за гаспадароў у іх — паліцыянты ці гандляры.

Дабразычлівы твар у мулата спахмурнеў. Потым ён буркнуў:

— Ух-ф! Купі-прадай, га! Паскудства! А ў паліцыі — адны сабакі загадваюць.

І раптам, безь ніякага пераходу, ён зарагатаў.

— А ты — ты хоць не гандлюеш?

— Амаль не. Я раблю масты, дарогі.

— О, гэта добра! А я — за кока на караблі. Калі хочаш, зраблю табе нашую страву з чорнай фасолі.

— Хачу.

Кок ступіў бліжэй да д'Ара і ўзяў яго за руку.

— Слухай, мне падабаецца, як ты гаворыш. І я табе таксама скажу. Можа, і табе спадабаецца.

І ён пацягнуў яго да мокрай драўлянай лавы, што стаяла каля ўваходу пад кустом бамбуку.

— Я быў у моры, непадалёк ад Ігуапы, мы плылі на вялікім нафтаналіўным судне, што ходзіць уздоўж берагу й развозіць паліва ў суседнія порты. І тут у нас пачаўся пажар. Не па маёй віне! Гэ, я ведаю сваю справу! Не! Няшчасны выпадак! Нам удалося спусьціць шлюпкі на ваду. А ўначы пачало штарміць, наш човен накрыла, і я пайшоў на дно. А калі вынырнуў, даўся аб човен галавой. І мяне панесла. А ноч была чорная, хвалі высокія, а я кепска плаваю; і мне было страшна. І тут я раптам убачыў удалечыні агеньчык і зразумеў, што гэта званіца на касьцёле Сьв. Ісуса ў Ігуапе. Тады я сказаў Ісусу, што, калі ён мяне ўратуе, дык я на працэсіі пранясу на галаве камень вагой 50 кіляў. Ты не паверыш, але мора суцішылася, і мая душа — таксама. Я спакойна паплыў і вельмі радаваўся,* і потым дабраўся да берагу. А заўтра я выканаю сваё абяцаньне.

І ён зірнуў на д'Ара раптам падазроным позіркам.

— Ты ж ня будзеш сьмяяцца?

— Не. Калі што паабяцаў — трэба выконваць.

Той пляснуў яго па плячы.

— А цяпер, хадзем да мяне, гэта каля ракі. Я прыгатую табе фасолю.

— Не, — сказаў д'Ара, — я заняты. Калі хочаш, увечары.

— Добра. Але сёньня ў вялікай хаце ўсю ноч танчаць і моляцца. Фэст Сьв. Юр'і.

Д'Ара спытаў, ці пойдзе ён танчыць таксама. Твар у кока раптам спахмурнеў, і вочы, упершыню, забегалі.

— Не, не, я танчыць ня буду. Заўтра трэба несьці камень. А ён цяжкі. Я толькі ўвечары схаджу ўшанаваць сьвятога, а потым хутка вярнуся.

— А звычайна гэта бывае доўга?

— Усю ноч, ды яшчэ трошкі й раніцай.

Ён зірнуў на д'Ара, быццам яму было крыху сорамна.

— Прыходзь на танцы. Потым мяне адтуль забярэш. А так я яшчэ застануся, пачну танчыць — я, напэўна, ня здолею ўтрымацца.

— Ты любіш танчыць?

Вочы ў кока заблішчалі, нібы ён пачуў пра нешта вельмі прыемнае.

— Го! Ды ўжо ж люблю! Там цыгары, сьвятыя, ну, і яшчэ — кабеты. Пра ўсё забываеш, і нішто ўжо ня стрымлівае.

— Там бываюць кабеты? Усе кабеты з гораду?

— Не, з гораду — не, з баракаў.

Да кока вярнулася ўсьмешка.

— Прыходзь. Пры капітане я здолею ўтрымацца. І ты дапаможаш мне выканаць заўтрашняе абяцаньне.

Д'Ара адчуў невялікую прыкрасьць. Што яму было да гэтага бязглуздага абяцаньня? Але зірнуўшы на кока, ён убачыў яго шчыры, усьмешлівы й даверлівы твар, смуглявая скура на якім ажно прамянілася жыцьцём і здароўем.

— Я прыйду, — прамовіў д'Ара. — А цяпер хадзем, я цябе крыху праваджу.

І невядома чаму, у тую ж хвіліну яму зноў убачылася тая дзяўчына, што ў знак гасьціннасьці падавала гарэлку.

Яны выйшлі са Сквэру й рушылі па гразкіх вуліцах. Неўзабаве яны ўжо былі на заезджаным коламі пляцы, зь невысокімі домікамі, дзякуючы якім пляц здаваўся яшчэ болей шырокім. Тынкаваныя сьцены ўжо сачыліся вільгацьцю, хоць дождж не мацнеў. У набрынялым вадою паветры глуха чуўся пошум ракі й дрэваў. Яны ішлі роўнай хадою — болей важкою ў д'Ара, болей мускулістаю ў кока. Час ад часу мулат падымаў галаву і ўсьміхаўся свайму спадарожніку. Яны павярнулі да касьцёла, які ўздымаўся над невысокімі дахамі, і, перасекшы пляц, зноў паглыбіліся ў прыземістыя кварталы з раскіслымі вуліцамі, у якіх цяпер луналі вострыя пахі кухні. З-за дзьвярэй часам высоўваўся цікаўны жаночы твар: трымаючы ў руках талерку ці якую іншую кухонную прыладу, жанчына праводзіла іх вачыма й тут жа зьнікала. Мінуўшы касьцёл, яны рушылі праз стары квартал, забудаваны такімі самымі нізкімі домікамі, і раптам трапілі ў магутны шум нябачнай адсюль ракі, апынуўшыся за барачным кварталам, які д'Ара адразу пазнаў.

— Ну, добра,— сказаў ён коку.— Я з табою разьвітваюся. Да вечара!

— Ну. Значыць, перад касьцёлам.

Але кок не выпускаў інжэнэравай рукі. Ён хацеў нешта сказаць і не насьмельваўся. Але нарэшце рашыўся:

— А табе ніколі не даводзілася клікаць Бога? Даваць яму абяцаньне?

— Даводзілася. Аднойчы, здаецца.

— Калі твой карабель тануў?

— Можна сказаць і так.

Оскар Мілаш

[ЛІТВА]

Краіна гэтая — Літва, чыё імя напаўняе мне думкі й душу. Я хацеў бы вас зь ёй пазнаёміць. Хадземце, я правяду вас у думках у край дзівосаў, сутоньня, мглы й ціхіх шэптаў... Вось мы й тут, на ўскраінах польскіх земляў, ужо паўночных, але яшчэ закаханых у колеры. Адзін мах крыла — і мы праляцім над краінай, дзе ўсе рэчы пазначаныя прыгаслым колерам успамінаў. Нас агортвае пах гарлачыкаў, імшыстая лясная смуга... Гэта Літва, зямля Гедыміна й Ягайлы. Млявае бледнае неба задуменнага краю, што адкрываецца перад намі, хавае ў сабе ўсю сьвежасьць позірку старавечных плямёнаў. Яно ня ведае пышнага смутку сталасьці. Пасьля летаргіі сямёх зімовых месяцаў, яно раптоўна абуджаецца ў нечаканай вясновай прыгажосьці, а ад сярэдзіны верасьня гэтае шчодрае аднаўленьне прыроды, так і ня здолеўшы спарадзіць лета, зноў нагадвае крумкачовымі крыкамі пра доўгую сямімесячную зіму. І тады мядовы водар літоўскага лета зноў саступае месца таму непаўторнаму восеньскаму паху, які — нібы сама душа Літвы. Горка-салодкі пах, нібы ад старога паваленага дрэва, пахаванага пад імхом, нібы ад занядбаных руінаў пасьля залевы ў канцы лета. Цьмянае сьвятло агортвае раўніну, серны змрок кладзецца на лясы, у бледнасьці неадступных думак патанае маўклівы твар сонца. І хоць яшчэ няма сьнегу, сані ўжо замяняюць вазок на раскіслых дарогах. Пах ільну, што гніе ў рэчцы, разьлягаецца над вёскамі. Нарэшце зьяўляецца лістападаўскі сьнег, і вартавыя сабакі зноў заводзяць свае бясконцыя вячэрнія пеpазовы з ваўкамі старога лесу, зьніклага ў тумане.

(Урывак зь лекцыі, Парыж, 29 сакавіка 1919)

[СТАРАСЬВЕЦКІ ДОМ]

Жалезная брама, пагрызеная іржою, магільным стогнам сустракала самотнага й зачараванага госьця, а прысады ніцых вербаў з таямнічым шэптам праводзілі яго да галоўнага ўваходу, дзьверы якога, ужо няведама чаму абмазаныя вапнай, былі ўвянчаныя трыма вялізнымі цьвікамі, калісьці ўбітымі трыкутнікам, пэўна, у крылы нейкага няшчаснага кажана, які даўно ўжо рассыпаўся ў пыл.

Дзьверы, жахлівыя недабеленыя дзьверы племянное грабніцы, вялі ў цёмны калідор, дзе зь першае хвіліны вас пачынаў душыць цьвілы й несуцешны пах заняпаду. Тут незьлічоныя Збароўскія, адныя ў камзолах з бляклымі кунтушамі, другія, пазьнейшыя, убраныя па-французску і ў парыках, аздаблялі згаслымі колерамі сваіх партрэтаў сьцены, завешаныя павуціньнем. У дальняй ад уваходу сьцяне прагал, вызвалены ад дзьвярэй, адкрываў прыгожую пэрспэктыву заляў з даўгімі вокнамі й нізкімі столямі, поўных цішыні й таямніцаў. [...]

Куты ў гэтых цёмных запыленых залях былі занятыя то вялізнымі фаянсавымі пячамі, чыю разяўленую пашчу, пэўна, не насыціў бы й цэлы воз дроваў, то грувасткімі шафамі, чые шкляныя дзьверы, завешаныя лінялымі фіранкамі злучалі пашчэрбленую інкрустацыю падлогаў з патрэсканымі росьпісамі столяў. [...]

Лета, старэючы, гудзе ў вокнах вялікай сіняй гасьцёўні, у шасьцёх высокіх падвойных вокнах, на якіх яшчэ вісяць убогія камякі счарнелай бавоўны, рэшткі старых уцяпленьняў. Гэтыя зьдзічэлыя вокны, якія сонца й дажджы даўніх часоў аздобілі хвораю вясёлкай, глядзяць сваімі вялікімі прысьлеплымі вачыма на велізарны забыты сад, апанаваны дзікім зельлем, смутны й прыгожы, як сон хворага дзіцяці. Часам нейкая пташка пачынае пяшчотна напяваць, пасьля спыняецца, услухоўваецца і, спалоханая тым, што парушыла гэткую наважную цішыню, адлятае далёка-далёка ад гэтага Старасьвецкага Дома й саду ўспамінаў. Часам таксама сьмяротны гадзіньнік у сьценнай нішы выпрабоўвае свой стары сапсаваны мэханізм, і нейкая мэбліна, уздрыгнуўшы ад невядома адкуль пачутага цікату, адказвае сонным карканьнем.

Горка-салодкі пах гнілое садавіны напаўняе дом. Вялікі сіні сьляпень часам прачынаецца, б'ецца аб шыбіну сваім невідушчым тварам, цяжка падае й зноў засынае. І мядовае сьвятло, што разьліваецца па дыванах, нагадвае пра арфістак і пра даўнія твары прыгожых людзей, што, здаецца, заснулі ў сьлззах.

(Урывак зь няскончанага раману «Збароўскія», у кн. O.V.de L. Milosz (1877-1939), Ed. A. Silvaire, 1959)

Працяг на старонцы 12

Д'Ара рэзка вызваліў руку. Ён ужо хацеў быў павярнуцца й рушыць прэч, калі сустрэўся вачыма з кокам. Кокаў позірк яго трошкі зьбянтэжыў, але, усьміхнуўшыся, ён сказаў:

— Цяпер гэта ўжо ня мае значэньня, але, калі хочаш, магу сказаць. Адзін чалавек паміраў па маёй віне. Вось тады я, здаецца, й паклікаў.

— І даў абяцаньне?

— Не. Але хацеў бы.

— Гэта было даўно?

— Незадоўга да прыезду сюды.

Кок запусьціў у бараду абедзьве рукі. Вочы ў яго блішчалі.

— Ты капітан, — нарэшце прамовіў ён. — Мой дом — твой дом. Заўтра ты дапаможаш мне выканаць маё абяцаньне, а гэта ўсё роўна, каб ты яго выканаў сам. Яно дапаможа й табе таксама.

Д'Ара ўсьміхнуўся:

— Ня думаю.

— А ты ганарысты, капітане.

— Я быў ганарысты. Цяпер я самотны. Але ты мне вось што скажы — ці твой Ісус заўсёды адказваў, калі ты яго клікаў?

— Заўсёды? О, не, капітане.

— Ну дык?

Кок засьмяяўся сьвежым дзіцячым сьмехам.

— Дык што, — сказаў ён, — ён жа вольны, праўда?

У клюбе, дзе д'Ара абедаў у кампаніі знакамітасьцяў, мэр паведаміў, што яму абавязкова трэба расьпісацца ў залатой муніцыпальнай кнізе, каб пакінуць сьведчаньне пра тую вялікую падзею, якою ёсьць яго прыезд у Ігуапу. Судзьдзя, у сваю чаргу, разрадзіўся яшчэ дзьвюматрыма новымі тырадамі, у якіх адзначыў, апроч размаітых вартасьцяў і талентаў госьця, яшчэ й тую незвычайную простасьць, зь якою ён прадстаўляе перад імі вялікую дзяржаву, да якой мае гонар належаць. На гэта д'Ара адказаў, што гонар, вядома, гонарам, але ж ёсьць і безумоўная выгада, якую мае яго кампанія, атрымаўшы кантракт на такія буйныя работы. Судзьдзя зноў зачаравана прыхіліўся перад такою інжэнэравай сьціпласьцю й тут жа дадаў:

— Дарэчы, ці не падумалі вы, што нам рабіць з начальнікам паліцыі?

Д'Ара зірнуў на яго з усьмешкай.

— Падумаў.

Ён палічыў бы за знак асабістай да яго прыхільнасьці й выключнае ласкі, калі б ад яго імя гэтаму гора-паліцыянту было даравана прабачэньне й ягонае, д'Ара, пражываньне ў такім, як ён мае шчасьце заўважыць, чароўным горадзе, як Ігуапа, з такімі велікадушнымі жыхарамі, магло пачацца ў клімаце згоды й дружбы. Судзьдзя слухаў з уважлівай усьмешкаю й пахітваў галавой. Пэўны час ён з выглядам знаўцы абдумваў інжэнэраву тыраду, потым растлумачыў яе сэнс прысутным, прымусіўшы іх зачаравацца высакароднасьцю традыцыяў вялікай францускай нацыі, і, павярнуўшыся зноў да д'Ара, абвясьціў, што такое рашэньне яго задавальняе.

— І калі ўжо яно так, — падсумаваў ён, — дык мы ўжо сёньня, бадай, запросім начальніка паліцыі на нашую агульную вячэру.

Але д'Ара паведаміў, што ўвечары ён ужо запрошаны сябрамі ў бараку на сьвяточную цырымонію з танцамі.

— Ага! — прамовіў судзьдзя. — Вось і добра! Я нават рады, што вы туды сходзіце. Самі пераканаецеся, што не любіць наш народ проста немагчыма.

Увечары д'Ара з кокам і ягоным братам сядзелі каля згаслага вогнішча ў той самай хаціне, якую ён ужо наведваў гэтаю раніцай. Кокаў брат, здаецца, зусім не зьдзівіўся, убачыўшы інжэнэра зноў. Ён амаль не гаварыў па-гішпанску й збольшага абмяжоўваўся толькі пахітваньнем галавы. Кок папытаўся ў д'Ара, якія ў Францыі саборы, а потым выдаў доўгую прамову пра суп з чорнай фасолі. Сьвятло ўжо амаль згасла, і хоць д'Ара яшчэ добра бачыў кока й ягонага брата, але ўжо ледзьве ўгадваў згорбленыя ў глыбіні хаты постаці старой кабеты й дзяўчыны, якая гэты раз зноў паднесла яму пачастунак. З-пад адхону чуўся манатонны плёхкат ракі.

Нарэшце кок устаў і прамовіў: «Пара». Яны з гаспадаром таксама ўсталі, але жанчыны не зварухнуліся. Мужчыны выйшлі адны. Д'Ара нерашуча затрымаўся на парозе, потым дагнаў братоў. Ужо цалкам сьцямнела, дождж перастаў. Бледна-чорнае неба здавалася вадкім. І ў гэтай цёмнай, празрыстай вадзяной смузе, што згушчалася па-над даляглядам, пачалі запальвацца зоркі. Амаль адразу яны згасалі й па адной ападалі ў раку, нібыта неба сьцякала кроплямі астатняга свайго сьвятла. Густое паветра пахла вадою й дымам. Зусім блізка чуўся пошум бязьмежнага нерухомага лесу. І раптам здалёк даляцелі гукі бубнаў і сьпевы, спачатку прыглушана, потым усё гучней, яны набліжаліся — і гэтаксама раптоўна аціхлі. Неўзабаве наперадзе ўзьнікла купка маладых нэгрыцянак у белых спадніцах з грубага ядвабу зь нізка апушчанымі таліямі. Зь імі йшоў высачэзны нэгар у шчыгульным чырвоным жакеце й зь нізкаю рознакаляровых іклоў на шыі, а за ім гурбаю, як папала валіў натоўп мужчын у белых піжамах і музыкі з трохкутнікамі й шырокімі й кароткімі бубнамі. Кок сказаў, што трэба йсьці за імі.

Хаціна, да якой яны дабрылі берагам, стаяла за некалькі соцень мэтраў ад барачнага кварталу; яна была вялікая, пустая, але адносна ўтульная, сьцены ўсярэдзіне былі тынкаваныя. Дол быў земляны, крытую саломаю й трысьнягом страху па цэнтры падтрымліваў тоўсты слуп, на сьценах не было ніякага ўбраньня. Углыбіні, на невысокім, усланым пальмавым лісьцем алтары, утырканым сьвечкамі, якія ледзьве асьвятлялі палову залы, стаяла цудоўная храмаграфія, на якой сьв. Юрый, прыняўшы спакусьлівую паставу, брыў зьверхнасьць над вусатым цмокам. Пад алтаром, у нішы, выкладзенай адмысловай пузырчатаю — у выглядзе каменьчыкаў — паперай, паміж сьвечкаю й місай з вадой, месьцілася фарбаваная гліняная фігурка нейкага рагатага бога са злосным тварам і занесенаю рукой, якая сьціскала несувымерна вялікі нож зь серабрыстае фольгі.

Кок адвёў д'Ара ў кут, і яны сталі там, прыхінуўшыся да сьцяны, непадалёк ад уваходу. «Адсюль можна будзе непрыкметна сысьці, нікога не патурбаваўшы», — шапнуў яму кок. У хату сапраўды ўжо набілася поўна народу, мужчын і кабет, якія стаялі, шчыльна прыцісьнуўшыся адно да аднаго. Рабілася горача. Да алтара падыйшлі й з абодвух бакоў яго сталі музыкі. Танцоры й танцоркі падзяліліся на два канцэнтрычныя колы, мужчыны — усярэдзіне. На цэнтар выйшаў нэгар-правадыр у чырвоным жакеце. Д'Ара абаперся сьпінаю аб сьцяну й скрыжаваў на грудзях рукі.

Але раптам, расьсекшы падвойны танок, нэгар-правадыр падыйшоў да іх і з сур'ёзным выглядам прамовіў некалькі словаў коку. «Не скрыжоўвай рук, капітане, — сказаў кок. — Ты заціскаеш сябе й не даеш духу сьвятога спусьціцца». Д'Ара паслухмяна апусьціў рукі.

Ён стаяў, па-ранейшаму прыхінуўшыся сьпінаю да сьцяны, і яму чамусьці здавалася, што яго доўгія, цяжкія рукі й ногі, яго бліскучы ад поту твар надаюць і яму таксама выгляд нейкага небясьпечнага дзікунскага бога. Высокі нэгар паглядзеў на яго й, задаволіўшыся, вярнуўся на месца. Зычным голасам ён тут жа засьпяваў першыя ноты з мэлёдыі, якую ўсе адразу падхапілі пад акампанэмэнт бубнаў. У тую ж хвіліну колы зрушылі зь месца й пачалі кружыцца ў розных напрамках у своеасаблівым грузным, з прытопванем, танцы, які болей нагадваў звычайнае таптаньне, толькі крыху падкрэсьленае лёгкім пагойдваньнем клубоў.

Сьпёка павялічвалася. Але паўзы пакрысе меншалі, перапынкі рабіліся ўсё радзей, і танец паскараўся. Не запавольваючы агульнага рытму й не перастаючы танцаваць, высокі нэгар ізноў расьсек колы й падыйшоў да алтара. Узяўшы шклянку з вадой і запаленую сьвечку, ён вярнуўся на цэнтар і паставіў сьвечку пасярэдзіне хаты. Потым двума канцэнтрычнымі коламі наліў ваду вакол сьвечкі й, выпрастаўшыся, узьняў да столі шалёныя вочы. Напружыўшыся ўсім целам, ён нерухома чакаў. «Зараз прыйдзе сьв. Юрый. Глядзі, глядзі», — выдыхнуў кок, таропячы вочы.

І праўда, танцоры былі цяпер як у трансе. Але на адных нібыта напала здранцьвеньне, іх сьпіны й ногі напружыліся, вочы зьнерухомелі й невыразна ўтаропіліся ў адну кропку. Другія наадварот паскорылі рытм і, выгінаючыся як у курчы, пачалі выкрыкваць нешта незразумелае. Крыкі паступова мацнелі, і, калі зьліліся ў суцэльны агульны вой, правадыр, па-ранейшаму гледзячы ўгору, таксама выпусьціў доўгі лямант, які напрыканцы выдыху завяршыўся нейкай ледзь з'артыкуляванаю фразай, дзе паўтараліся адны й тыя ж словы. «Чуеш,— шапнуў кок,— ён кажа, што ў ім — поле бітвы, якую вядзе бог». Д'Ара быў уражаны пераменай ягонага голасу, ён зірнуў на кока і ўбачыў, што той, нахіліўшыся ўсім целам наперад і сьціснуўшы кулакі, нерухома глядзіць у прастору й, не сыходзячы зь месца, перабірае нагамі, паўтараючы рухі астатніх. Тады ён заўважыў, што й сам пэўны час ужо танчыць усёй сваёй масай, праўда, не перастаўляючы ног.

Працяг на старонцы 12

Оскар Мілаш

Працяг са старонкі 11

[«ПАЧВАРА, НАРОДЖАНАЯ НЯВЕДАМАЮ МАЦІ»]

Велічны парадак, паводле якога адбываецца дзеяньне сусьветнае й зямное прыроды, веда й любоў, выказаныя знакам і моваю любое рэчы, уяўленьне пра тое, дзе ты ёсьць, адкуль прыйшоў і куды йдзеш — гэтая характэрная рыса аблічча сьвету, усе гэтыя цудоўныя знакі даверлівай мудрасьці некалі, у часы майго неспакойнага дзяцінства, упільвалі на мяне так, што я ўяўляў сябе пачварай, якую нарадзіла нейкая невядомая й жахлівая маці, сьляды якой я няспынна шукаў і нідзе ня мог знайсьці. Я адчуваў сябе так нізка ў іерархіі істотаў, што мае кроўныя бацькі, хоць і самі слабыя, неспакойныя й пазбаўленыя сапраўднае велічы, здавалася, спускаліся да мяне ў прамяністым сьвятле, нібы магутныя й шчасьлівыя боствы, якіх ніякая духовая повязь не злучала з маім убогім лёсам. Ня ведаю, які дзіўны праклён абцяжарваў маё цела й душу [...] Уся гэтая гожая рухлівасьць, ад воблака й рэчкі да птушкі ў старых прысадах і мурашкі ў траве, была вольная й бегла туды, куды яе клікала жыцьцё. І адзін толькі я поўз да цудоўнага гораду маіх мараў з павольнасьцю мхоў, карані якіх урастаюць у дрэва й камень. Пазьней, у часы маіх юнацкіх свавольстваў, тое самае зьдзіўленьне й тое самае жаданьне апаноўвала мяне перад натуральнасьцю, спантаннасьцю, падсьвядомым спрытам рухаў чалавечага цела, захопленага танцам, бегам ці боем.

(Таемствы, Поўны Збор Твораў, том VIII)

[«Я БЫЎ ПРЫЗНАЧАНЫ ДЛЯ ПАМЯЦІ»]

Аднойчы я абудзіўся, агаломшаны, да майго сапраўднага лёсу і зразумеў, што я — адна з тых абнядоленых душаў, у якіх палымянае юнацкае ўяўленьне спальвае рэальнасьць цэлага жыцьця. Тым ня менш, страсянуўшы зь сябе здранцьвеньне, я сабраўся з духам як мог, выйшаў на сцэну — і спэктакаль пачаўся. Убогая трагікамэдыя! Што я магу вам сказаць, чаго вы ўжо ня ведалі б самі? І я ў ёй заўсёды быў толькі адным з пабочных і самых безаблічных пэрсанажаў, я й памру, напэўна, так і не пазнаўшы галоўнага героя. Няма нічога цяжэйшага, чым вучыцца галоўнай ролі ў падзеях свайго ўласнага йснаваньня. Ці я кахаў, ці я ненавідзеў? Мне згадваецца, што я часамі сьмяяўся й плакаў; аднак ніколі я не адчуваў, каб пад маёй рукою білася сэрца, змучанае або ўзрадаванае рэальнасьцю. У нейкім сэнсе я жыў толькі дзеля таго, каб было што перажыць. Даваўшы паперы пустыя ўрыўкі ўспамінаў, я ўсьведамляю, што выконваю найважнейшы акт свайго жыцьця. Я быў прызначаны для Памяці.

(Утаемненьне ў Каханьне, Поўны Збор Твораў, том V)

[«Я СКАШТАВАЎ СЬВЯТОГА СУПАКОЮ»]

Чатырнаццатага Сьнежня тысяча дзевяцьсот чатырнаццатага, пад адзінаццатую гадзіну ўвечары, пасярод дасканалага стану чуйнаваньня, адгаварыўшы малітву й паразважаўшы над штодзённым урыўкам Бібліі, я раптам адчуў, ані трохі не зьдзівіўшыся, зусім нечаканую перамену ва ўсім маім целе. Насамперш я заўважыў, што мне была нададзеная невядомая дагэтуль сіла свабодна ўзьняцца ў прасторы; і праз хвіліну я апынуўся каля вяршыні магутнае гары, ахутанай сіняватаю смугою неапісальнае тонкасьці й мяккасьці. [...] І тады дасканалая, абсалютная нерухомасьць скавала сонца й аблокі, выклікаўшы ў мяне невыказнае адчуваньне найвышэйшага спаўненьня, канчатковага супакаеньня, поўнага супыну любога разумовага дзеяньня, надлюдзкага выяўленьня апошняга Рытму. Літара Н дадалася да майго імя; я скаштаваў супакою, так, Сторж, Сторж! я — я! — скаштаваў сьвятога супакою, у маёй галаве больш не засталося ні сьледу трывогі, ні болю, я быў сьвятаром паводле чыну Мэлхісэдэка. На жаль! вечная й вельмі кароткая візія растала; я зноў апынуўся ў сваёй нязноснай кватэры; але магутныя крылы, або дакладней, нябачныя надкрылы, пра бязьмежнасьць якіх я здагадваўся, абмахвалі мяне з цудоўным шолахам, і шэпты, поўныя братэрскай спагады й пераплеценыя з дзіўнымі гукамі лютні, распытвалі мяне на невядамай мове.

(Ars Magna, «Пасланьне да Сторжа», Поўны Збор Твораў, том VII)

Пераклаў з французскае Сяргей Шупа

КАМЕНЬ, ЯКІ РАСЬЦЕ

Працяг са старонкі 11

Але раптам бубны як ашалелі, і велічэзны чырвоны нэгар-д'ябал нібыта зьляцеў з ланцуга. З агнём у вачах, ён разьятрана закруціў рукамі й нагамі, і зьгінаючыся ў каленях, падскокваў і ападаў па чарзе на кожную нагу, увесь час паскараючы тэмп — да таго, што, здавалася, зараз рассыплецца на кавалкі. Але неспадзявана, у самым разгары танцу, пасярод грукату бубнаў, ён зьнерухомеў і з гордым, страшным выглядам агледзеў прысутных. У тое ж імгненьне зь цёмнага кута выбег танцор і стаў перад ім на калені, падаючы кароткую шаблю. Чорны асілак схапіў шаблю й, ня зводзячы вачэй з тых, хто танчыў вакол, шалёна закруціў ёю над галавой. І тут д'Ара ўбачыў, што кок ужо танчыць у агульным натоўпе. Калі ён там апынуўся, інжэнэр не заўважыў.

У напаўным чарнаватым сьвятле з долу падымаўся задушлівы пыл, ён яшчэ болей згушчаў паветра, якое ліпла да скуры. Д'Ара адчуваў, як пакрысе на яго навальваецца стома; дыхаць было ўсё цяжэй. Ён нават не заўважыў, адкуль у танцораў узьніклі вялізныя цыгары, якія цяпер усе курылі, не перапыняючы танцу; хаціну напаўняў дзіўны, крыху п'янлівы водар. Ён убачыў, як міма ў танцы праплывае кок, таксама зацягваючыся цыгарай. «Не куры»,— крыкнуў яму д'Ара. Кок нешта буркнуў і, па-ранейшаму рытмічна пераступаючы, паплыў далей. Няцямнымі, як у баксёра ў накаўне, вачыма ён глядзеў на слуп пасярэдзіне хаты, і па яго патыліцы прабягала дробная, нястрымная дрыготка. А побач, круцячы ўлева і ўправа жывёльным тварам, безупынку гаўкала дзябёлая мурынка. Але ў самым жудасным трансе былі маладыя нэгрыцянкі: яны стаялі, нібыта ўросшы нагамі ў зямлю, і ўсё іх цела, ад галавы да пят, скаланалася ва ўсё болей жудасных курчах, якія мацнелі, падымаючыся да плячэй. Тады іх галовы трэсьліся, ападаючы назад і наперад, літаральна як адарваныя ад абезгаловленага цела. І ў гэтую ж хвіліну ўсе завылі бясколерным калектыўным крыкам, на адной ноце, нямаведама калі пасыпаючы ўдыхаць, нібыта іх целы ператвараліся ў суцэльны клубок мышцаў і нэрваў, нібыта гэты доўгі зьнясільваны выдых абудзіў у кожным голас нейкай істоты, якая раней увесь час спала. І хоць крык яшчэ не аціх, кабеты, адна за адной, пачалі падаць долу. Чорны правадыр укленчваў перад кожнай і хуткім канвульсійным рухам вялікіх чорных мускулістых рук сьціскаў ім скроні. Тады яны ўставалі й, пагойдваючыся, зноў далучаліся да агульнага танцу, пачынаючы зноў крычаць, спачатку ціха, потым усё гучней і хутчэй, пакуль ня падалі зноў, і потым ізноў падымаліся, каб гэта паўтаралася яшчэ й яшчэ — пакуль усеагульны крык не пачаў слабець, перайначваца, і нарэшце распаўся на нешта падобнае да хрыплага клекатаньня, якое скаланала іх, як жахлівая ікаўка. Д'Ара быў ушчэнт зьнясілены, яго мышцы здранцьвелі ад доўгага нерухомага танцу, ён задыхаўся ад уласнай немасьці й раптам адчуў, што пачынае хістацца. Празь сьпякоту, пыл, цыгарны куродым і пах чалавечых целаў дыхаць было зусім немагчыма. Ён пашукаў вачыма кока, але той некуды зьнік. Тады д'Ара сасьлізнуў сьпінаю ўздоўж сьцяны й прысеў на кукішкі, ледзь стрымліваючыся, каб не званітаваць.

Калі ён расплюшчыў вочы, паветра было яшчэ такое ж задушлівае, але шум перастаў. Толькі бубны грымелі несупынным рытмаваным басам, пад які ва ўсіх кутах хаты таўкліся групкі ў белых строях. А ў цэнтры, адкуль ужо зьніклі шклянка й сьвечка, паволі, нібыта ў гіпнозе, танцавалі некалькі маладых нэгрыцянак; яны рухаліся марудна — так, што ўвесь час здавалася, вось-вось адстануць ад такту. З заплюшчанымі вачыма, але выпрастаўшы плечы й галаву, яны лёгка пагойдваліся на дыбачках, узад і ўперад, амаль на адным месцы. У дзьвюх кабет, зь дзябёлымі формамі, твары былі схаваныя пад полагам з пальмавага пакульля. Паміж імі была яшчэ адна — высокая зграбная нэгрыцянка, якую д'Ара раптам пазнаў: гэта была дачка гаспадара той хаты, у якой ён нядаўна быў госьцем. На дзяўчыне быў адмысловы гарнітур: зялёная суканка й аздоблены мушкецёрскімі пёрамі, з загнутым сьпераду брылём капялюшык паляўнічай Дыяны з празрыстай блакітнай тканіны; у руцэ яна трымала жоўта-зялёны лук са стралой, на якую была нанізаная маленькая рознакаляровая птушка. Прыгожая, крыху закінутая назад галоўка дзяўчыны плаўна пагойдвалася над яе далікатным целам, і яе твар прамяніўся роўнаю, бесклапотнаю мэлянхоліяй. У тыя імгненьні, калі музыка заціхала, яна раптам пахіставалася ў сьне, і толькі адноўлены дробат бубнаў падтрымліваў яе сваёю нябачнай рукою; тады яна зноў пачынала выпісваць арабэскі, але музыка спынялася зноў, і яна зноў пачынала хістацца, ледзь утрымліваючы раўнавагу, і тады зь яе грудзей вырываўся дзіўны, паранізьлівы й адначасна напеўны птушыны крык.

Зачараваны гэтым запаволеным танцам, д'Ара ня зводзіў з чорнай Дыяны вачэй, але раптам перад ім аднекуль выплыў кок. Гладкія рысы ягонага твару ўжо цалкам перакрыліся. Лагоднасьць зьнікла зь яго вачэй, і цяпер у іх сьвяцілася толькі нейкая невядомая прагнасьць.

Без былое прыязнасьці, нібыта зьвяртаючыся да незнаёмца, ён сказаў:

— Ужо позна, капітане. Яны будуць танцаваць усю ноч, але яны ня хочуць, каб ты яшчэ заставаўся.

Зь цяжкаю галавой, д'Ара ўстаў і рушыў за кокам, які ўздоўж сьцяны скіраваў да выхаду. На парозе кок адступіў і, прытрымліваючы бабмукавыя дзьверы, прапусьціў інжэнэра наперад. Выйшаўшы, той азірнуўся, але кок застаўся на месцы.

— Хадзем. Табе ўжо хутка трэ' будзе несьці камень.

— Я застаюся,— упарта прамовіў кок.

— А як жа тваё абяцаньне?

Не адказаўшы, кок пачаў паволі зачыняць дзьверы, але д'Ара прытрымаў іх рукой. Пэўны момант яны змагаліся так, але потым д'Ара пацісну плячыма й саступіў. Павярнуўшыся, ён рушыў прэч.

Ноч поўнілі сьвежыя, духмяныя пахі. Па-над лесам у паўднёвым небе слаба пабліскавалі прыглушаныя нябачнай смугою зоркі. Паветра было сырое й цяжкае. Але пасьля атмасфэры ў хаце й яно здавалася незвычайна сьвежым. Спатыкаючыся, як п'яны на калдобістай дарозе, д'Ара пачаў падымацца па коўзкім адхоне да першых хат. Зусім блізка ціха шапацеў лес. Пошум ракі мацнеў, увесь кантынэнт раптам ажываў уначы, і д'Ара разьбірала млосьць. Яму быццам хацелася вывярнуць зь сябе ўсю гэтую краіну, разам з журбою яе неабсяжных прастораў, цьмяным сьвятлом лясоў і начным плёхкатам вялікіх бязьлюдных рэк. Гэта быў занадта вялікі край, у ім зьмяшаліся розная кроў і розныя поры года, сам час абарочваўся тут у валкую кашу. Жыць тут было магчыма толькі ля самай зямлі, і каб да такога жыцьця далучыцца, трэба было легчы й гадамі, доўгімі гадамі, спаць, у гэтай глеістай гразі ці перасохлым пыле. Там, у Эўропе, былі сорам і злосьць. Тут — выгнаньне або самота ў атачэньні млявых, дрыгатлівых шаленцаў, што танцавалі, каб урэшце памерці. Але праз насычаную расьліннымі пахамі сырасьць ночы яму ўсё яшчэ чуўся дзіўны крык параненай птушкі, што зьлятаў з вуснаў заснулае прыгажуні.

Калі д'Ара, з галавою, распалавіненай страшным болем, расплюшчыў вочы пасьля кепскага сну, сырая сьпёка ўжо душыла горад і нерухомы лес. Чагосьці чакаючы, ён пастаяў на крытым ганку шпіталя й пазіраючы на гадзіньнік, які спыніўся, пастараўся ўразумець, які цяпер час. Яго зьдзіўлялі яркі дзень на двары й гэтая цішыня, што ахутвала горад. Амаль чыстае блакітнае неба навісала над цьмянымі дахамі бліжэйшых дамкоў. На доме насупраць, скаваныя сьпёкай, спалі некалькі тутэйшых, брудна-жоўтых грыфаў. Раптам адзін скамянуўся, разявіў дзюбу, усім выглядам паказваючы, што зьбіраецца ўзьляцець, двойчы ляпнуў пыльнымі крыламі па целе, падняўся на некалькі сантымэтраў над дахам і, зноў апаўшы, амаль адразу заснуў.

Інжэнэр рушыў у горад. На цэнтральным пляцы, як і на вуліцах, па якіх ён прайшоў, было бязьлюдна. Удалечыні й па берагах ракі над лесам плыў нізкі туман. Сьпёка ціснула ў самую макаўку, і д'Ара пачаў шукаць зацемку, дзе можна было б схавацца. Тады пад стрэхаю аднаго дому ён заўважыў невысокага чалавечка, які рабіў яму знакі. Падыйшоўшы бліжэй, ён пазнаў Сакрата.

— Што, пане д'Ара, спадабалася цырымонія?

Д'Ара адказаў, што ў хаце было надта горача, і яму больш дадушы былі ноч і вольнае неба.

— Праўда, — сказаў Сакрат, — у цябе там толькі імша. Ніхто не танцуе.

Ён паціраў рукі, скакаў на адной назе й круціўся ваўчком, задыхаючыся ад сьмеху.

— Немагчымыя, яны ўсе немагчымыя.

Потым ён зноў зь цікаўнасьцю зірнуў на д'Ара:

— А ты йдзеш на імшу?

— Не.

— Тады куды?

— Нікуды. Ня ведаю.

Сакрат зноў засьмяяўся.

— Немагчыма! Пан — без царквы, безь нічога.

Д'Ара засьмяяўся таксама.

— Гэта праўда. Сам бачыш, не знайшоў я сабе месца. Таму й зь'ехаў.

— Заставайся ў нас, пане д'Ара, ты мне падабаесься.

— Я можа й хацеў бы, Сакраце, але ж ня ўмею танцаваць.

Іхні сьмех зьвінеў у цішыні бязьлюднага гораду.

— А! — раптам сказаў Сакрат. — Забыў. Цябе хоча бачыць мэр. Ён сьнедае ў клюбе.

Раймон Кёно

ў перакладах Зьміцера Коласа

[...]

Глухая ноч глухія цені
Глухія травы і лясы
Глухія ўдары звону ў сьцэны
Глухія гукі й галасы

Сьляпая ноч сьляпыя совы
Сьляпы ў зямлі сьляпое крот
Сьляпы камень сьляпыя словы
Сьляпы ў сьляпога дрэва плод

Нямая ноч нямыя ветры
Нямы на небе маладзік
Нямыя сьпевы у паветры
Нямыя нівы немы крык

Скалечаны зьвяры і людзі
Скалечаны увесь сусьвет
Скалечаны шарж гэты будзе
Скалечаны лухту вярзе

Але хто чуе? бачыць? кажа?

ЛЬЕ ДОЖДЖ

Лье дождж на пастуха
лье дождж на бараноў
гук чую цягніха
гук чую ваганоў

у далечы далін
дзе шырыцца паша
убачыў я вагін
і ўвесь гуж цягніша

лье дождджык на людзей
і на вагоны лье
прагрэс наш чарадзей
культуру нам нясе

СТРАШНЫ МУР

Страшны мур
страшны шлях
страшны цень
дзе я-люр?
дзе я-лях?
дзе я-лень?

нідзе
ні дзюр
ні дзей
ні дзень

вось гульня
што выдумльня
я ўначыльня

НАКЦЮРН

Калі пратанчыў я ўсю ноч
валынка нацягнула боты
калі я заплаціў за скоч
наган накінуў плашч свой чорны
калі я на таксоўку сеў
ліхтар наставіў свой каўнер
калі Парыж я праляцеў
надзела поўня кабат белы
калі ж я да Нёйі пасьпеў
закінуў ногі я за плечы

ПРЫТУЛАК ЧАСУ

Прытулак часу наша памяць
якая ў будучыню мкне
гісторыю сэкунды ладзяць
перш чым пасласць нас у труне
ў прадоньне дзе прытулак часу
і дзе ўспамін нас не кране

[...]

Штось здэцца дзеецца на сьвеце
Але па сутнасьці нішто
Сабака трапіў пад аўто
Казлы дзесь цешацца як дзеці
Чакаюцца дажджы
Ого



Здымак Паўла Жураўлёва

І безь ніякага папярэджаньня ён рушыў па вуліцы, што вяла да шпіталя.

— Ты куды?— крыкнуў яму д'Ара.

Сакрат гучна храпануў:

— Спаць. Хутка шэсьце.

І пахропваючы, амаль подбегам рушыў далей.

Мэр проста хацеў абвясьціць інжэнэру пра выдзеленае яму ганаровае месца для прагляду працэсіі. Менавіта гэта ён і тлумачыў яму за сьнеданьнем, прапанаваўшы падзяліць вылатную страву зь мяса й рысу, якая здольная была б цудадзейным чынам прымусіць рухацца й паралітыка. Спачатку, як меркавалася, усе зьбяруцца на бальконе ў доме судзьдзі — гэта насупраць касьцёла — і адтуль будуць назіраць за выхадам шэсьця. Потым трэба перайсьці ў мэрыю, на галоўную вуліцу, што вядзе да касьцельнае плошчы, бо менавіта па ёй пакаяльнікі будуць вяртацца. Кампанію д'Ара складуць судзьдзя й начальнік паліцыі, бо сам мэр мусіць прысутнічаць на цырымоніі. Начальнік паліцыі, дарэчы, ужо быў у клюбе й зь нястомнай усьмешкаю ўвесь час круціўся вакол д'Ара, засыпаючы яго ўяўна прыязнымі тырадамі, у якіх інжэнэр, праўду кажучы, не разумеў ні слова. Калі ж д'Ара нарэшце скіраваў да выхаду, начальнік паліцыі кінуўся наперад, адчыніў перад ім дзьверы й трымаў іх, пакуль той ня выйшаў на вуліцу.

Пад жорсткім сонцам яны ўдвух рушылі да дому судзьдзі па ўсё яшчэ пустым горадзе. Навакольную цішыню будзіў толькі гук іхніх крокаў. Але раптам на суседняй вуліцы выбухнула пэтарда, і адразу над усімі дахамі, як цяжкае леташняе лісьце, узьвіліся грыфы з абскубенымі шыямі. У тое ж імгненьне з усіх бакоў заляскалі яшчэ дзясяткі пэтардаў, дзверы адчыніліся, і з дамоў паваліў народ, запаўняючы вузкія вуліцы.

Судзьдзя, упусьціўшы гасьцей, адразу заявіў, што для яго вялікі гонар прымаць д'Ара ў сваім нікчэмным доме, і павёў іх на другі паверх па прыгожай барочнай лесьвіцы, фарбаванай блакітнаю глінкаю. Калі яны падняліся на верхнюю пляцоўку, некалькі дзьвярэй адчынілася, з-за іх высунуліся смуглявыя дзіцячыя галоўкі, якія адразу схаваліся, і з-за дзьвярэй пачуўся прыглушаны сьмех. Прыгожая ў архітэктурным пляне ганаровая зала была абстаўленая толькі рэдкаю плеценай мэбляй і вялікімі птушынымі клеткамі, зь якіх ляцеў аглушальны пошчак. Балькон, на якім яны ўладкаваліся, выходзіў на невялікую касьцельную плошчу, якую пачынаў ужо запаўняць натоўп. Людзі стаялі нерухома й на дзіва ціха пад пякельнаю сьпёкай, якая амаль бачнымі струмянямі сьцякала зь неба.

Вакол насіліся толькі дзеці, раз-пораз спыняючыся й запальваючы пэтарды, якія грукаталі ўжо адна за адной. З балькону касьцёл з тынкаванымі сьценамі, невялікім, фарбаваным блакітнаю фарбай парталам на тузін прыступак і дзьвюма блакітна-залачонымі вежкамі падаваўся меншым.

Раптам недзе ў сярэдзіне касьцёла магутна зароў арган. Увесь натоўп адразу павярнуўся да парталу тварам і расступіўся да краёў плошчы. Мужчыны паздымалі шапкі, кабеты ўкленчылі, а далёкі арган яшчэ доўга выводзіў мэлёдыі, падобныя нечым да маршаў. Потым з-над лесу пачуўся нейкі дзіўны гуд вялікага насякомага, і з-за дрэваў вынырнуў маленечкі самалёцік з празрыстымі крыльцамі й крохкім фюзэляжыкам. Ён зусім не стасаваўся з навакольным сьветам, узрост якога вызначыць было немагчыма. Трошкі зьнізіўшыся, самалёт скіраваў да плошчы, зь ляскатам вялікай бразготкі праляцеў над задранымі да яго галовамі й потым, павярнуўшы, пачаў аддаляцца да вусьця.

Тым часам у цяню каля касьцёла пачалася нейкая валтузьня, якая перацягнула ўвагу. Арган ужо змоўк, і цяпер яго замянілі трубы й бубны, схаваныя недзе пад дашкам парталу. Адзін за адным з касьцёла пачалі выходзіць пакаяльнікі ў чорных стыхарах, яны ставалі шэрагамі на цьвінтары і потым разам рушылі ўніз па прыступках. За імі зьявіліся пакаяльнікі ў белым з чырвона-блакітнымі прапэрсамі, потым — невялічкая групка пераапранутых анёлкамі хлопчыкаў з брацтва дзяцей сьв. Марыі — з сур'ёзнымі смуглявымі тварыкамі, — і нарэшце над галовамі натоўпу, які запаўняў цьвінтарныя сходы, пагойдваючыся, зь цярновым вянком на скрываўленай галаве й трысьняговай галінкай у руках, паплыла фігурка Хрыста, якую на рознакаляровых насілах несьлі потныя знакамітасьці гораду, апранутыя ў строгія цёмныя гарнітуры.

Калі насілы спусьціліся зь цьвінтара, рух трошкі застапарыўся й пакаяльнікі пастараліся навесьці ў сваіх шэрагах хоць нейкае падабенства парадку. У гэтую хвіліну д'Ара ўбачыў кока: той якраз толькі што ўзьнік на цьвінтары. Кок быў голы да пояса, і на яго барадатай галаве, проста на голым чэрапе, абароненым толькі коркаваю пракладкай, ляжала вялізная прастакутная глыбіна. Цьвёрдай хадой ён спусьціўся па касьцельных сходах, утрымліваючы камень у дакладнай раўнавазе абручом сваіх каротках мускулістых рук. Калі ён параўняўся з насілами, працэсія скаланулася й рушыла. І тады з-пад дашка над парталам узьніклі музыкі ў ярких жакетах, якія, высільваючыся, на ўсе шчокі дзьмулі ў свае абвітыя рознакаляровымі стужкамі трубы. Пад паскораны тупат ног пакаяльнікі пайшлі хутчэй, і іх шэрагі пацякл па адной з вуліц, што выходзілі на касьцельную плошчу. Неўзабаве за імі зьніклі й насілы, і цяпер відаць было толькі кока й апошніх музыкаў. Нарэшце, пад грукат пэтардаў натоўп таксама скрануўся зь месца, і калі яго апошнія групкі пакідалі ўжо плошчу, над ёй са страшным шумам прапэлераў зноў узьнік самалёцік. Д'Ара глядзеў толькі на кока, які паволі аддаляўся па вуліцы, і раптам яму здалося, што плечы ў яго пачынаюць угінацца. Але добра разгледзець з такой аддегласьці было немагчыма.

Па пустэльных вуліцах з зачыненымі крамамі й глуха пазамыканымі дзьвярмі д'Ара, судзьдзя й начальнік паліцыі йшлі да мэрыі. Фанфарныя гукі й ляскат пэтардаў пакрысе аддаляліся, і горадам зноў завалодвала цішыня, а разам зь ёю на свае заўсёдныя месца на дахах вярталіся грыфы. Мэрыя стаяла на вузкай, але доўгай вуліцы, якая зьвязвала ўскраінныя кварталы з касьцельнаю плошчай. Цяпер на ёй было абсалютна пуста. З балькону мэрыі, улева і ўправа, колькі хапала вачэй, віднеўся толькі голы асфальт з рэдкімі лужынамі, пакінутымі нядаўнім дажджом. Сонца ўжо крыху апусьцілася й цяпер расьпякала сьляпыя фасады дамоў на другім баку вуліцы.

Яны чакалі доўга, так доўга, што д'Ара, ад бясконцага глядзеньня на сонечныя водблескі на працілеглым муры, пачаў адчуваць, як да яго зноў вяртаюцца галавакружэньне й стома. Бязьлюдная вуліца з пустымі дамамі адначасова й вабіла, і выклікала ў яго млосьць. Яму зноў хацелася ўцячы з гэтай краіны, але ў тую ж хвіліну перад яго вачыма ўзьнікла тая вялізная глыбіна, і яму вельмі хацелася, каб гэтаму выпрабаваньню нарэшце настаў канец. Ён хацеў быў ужо прапанаваць спусьціцца на вуліцу й пайсьці ў каго-небудзь спытаць, што, можа, здарылася, але ў гэтую хвіліну над касьцёлам на ўсю моц зазванілі званы. Адначасова зьлева, на дальнім канцы вуліцы, усчаўся беспарадкавы шум, і прастору паміж дамамі захлынуў бурлівы натоўп. Здалёк было відаць, як пакаяльнікі й паломнікі, зьбіўшыся ў адну кучу й абляпіўшы з усіх бакоў насілы, з радасным віскам і безупынным ляскатаньнем пэтардаў, набліжаюцца па вузкай вуліцы. У некалькі сэкундаў яны запоўнілі яе да краёў і хваляю пакацілі да мэры ў неапісальным вэрхале, у якім перамяшаліся самыя розныя ўзросты й размаітыя колеры скуры й адзеньня, што ўтваралі цяпер адну стракатую масу, ашчэраную безьліччу разяўленых у крыку ратоў, шырока расплюшчаных і вырачаных вачэй і дзідамі сьвечак, чыё полымя раставала ў пякучым мроіве дня. Але калі яны параўняліся з мэрыяй і натоўп пад бальконам згусьціўся настолькі, што, здавалася, пачаў ужо лезьці на сьцены, д'Ара ўбачыў, што кока ў ім няма.

У адзіным парываньні, нічога не патлумачыўшы й не перапрасіўшы, ён кінуўся праз залу, зьляцеў па прыступках і апынуўся на вуліцы ў грукаце званоў і пэтардаў. Тут ён адразу быў вымушаны ўступіць у барацьбу зь вясёлым, бурлівым натоўпам, у якім пераблыталіся паломнікі са сьвечкамі ў руках і зацюканыя, заштурханыя з усіх бакоў пакаяльнікі. Тым ня менш ён неадольна й з такім напорам, усёй сваёю вагой пракладаў сабе шлях у гэтым людзкім прыліве, што калі раптам, на канцы вуліцы, апынуўся на волі, ззаду натоўпу, дык ажно захістаўся й ледзь ня ўпаў. Прытуліўшыся да пякучай сьцяны, ён крыху пачакаў, каб перавесьці дыханьне. І ў гэтую ж хвіліну на вуліцу вывернуў гурт мужчын. Першыя йшлі, павярнуўшыся задам, і д'Ара ўбачыў, што ўсе яны абступаюць кока.

Выгляд у таго быў ўяна зморана. Ён спыняўся, потым, згорбіўшыся пад цяжарам вялізнага каменя, дробным трушком недалужнага грузчыка або рыкшы, пляскаючы па зямлі ступакам, трошкі прабягаў наперад, і калі прыпыняўся зноў, пакаяльнікі ў запэцканых пылам і расплаўленым воскам стыхарах пачыналі яго падбадзёрваць. Зьлева ад кока моўчкі то бег, то йшоў яго брат. Д'Ара аддзяляла ад іх зусім малая аддегласьць, але яму падалося, што яны, каб прайсьці яе, патрацілі цэлую вечнасьць. Нарэшце, амаль параўняўшыся зь ім, кок знoўку спыніўся й абвёў вакол згаслым позіркам. Ён убачыў д'Ара і, хоць, здаецца, яго не пазнаў, раптам увесь зьнерухомеў, павярнуўшыся да яго тварам. Яго пашарэлае аблічча заліваў ліпкі й брудны пот, у барадзе віселі пацёкі сьліны, і вусны склейвала бурая, ссохлая пена. Ён пастараўся ўсьміхнуцца. Але ўсё яго цела дрыжала, прыдушанае пакутлівай ношай, і толькі ў плячах мускулы, нібы ў курчы, зьвіліся ў нерухомы клубок. Брат, пазнаўшы д'Ара, сказаў: «Ён ужо аднойчы падаў». І ў гэтую хвіліну нямаведама адкуль узяўся Сакрат, які зашаптаў інжэнэру на вуха: «Надта танцаваў, пане д'Ара, усю ноч. Вельмі стомлены».

Працяг на старонцы 14

Ліст са скрыжаваньня ў Мэнільмантане

Мэва Марон



Калі глядзець уніз з нашага кутку на сёмым паверсе, вуліца налева вядзе паўз піцэрыю на Père Lachaise, вуліца направа — паўз кітайскі рэстаран вельмі прыблізна ў бок Sacré Coeur, які мігціць над стрэхамі на небакраі. Супрацьлеглы ад нас рог вуліцы, паміж Вялікім Кітайскім Мурам і Пахіленай Пізанскай Вежай, выглядае нечаканым аазісам (або пусткаю, залежна ад вашага гледзішча): вузенькія сходы падымаюцца ў штосьці, што здаецца праз дрэвы (акацыі?) брукаваным дворыкам (глухі завулак, паводле карты), дзе нават будзёнымі ранкамі амаль не відно знакаў жыцьця — нос чырвонага аўта, прыпаркаванага там, дзе двор хаваецца за рог дома, тыл якога мы бачым, раз-пораз крадзецца кот...

Я не магу пэўна сказаць каторая гадзіна. Мой новы гадзіньнік зь Менску, як здаецца, працуе, а швэйцарскі ня вытрываў апошняга пераходу на летні час; дык або сьняданьне спазьняецца, або яны зноў памянялі час. І вось, я сяджу тут зь «Імшою» Рабэра Марто цудоўнай верасьнёўскай нядзельнай раніцай. Варта б сказаць нешта пра самога Марто, ён здаецца мне запозьненым успамінам з майго апошняга побыту тут (кніга выйшла ў пазамінулым верасьні, аднак напоўна пасьля рэфэрэндуму ЭЭС); адная у гэтую няпэўную часіну (як кажуць паэты), падрыхтаваўшы хатнюю заданьне для сёньняшніх пошукаў (а надвор'е выглядае добрым), я магу ўцячы ад часу — да таго ж сёньня нядзеля, а кніга завецца «Імша».

Пачынаецца яна з «Сарокі» Манэ, якую я ведала толькі ў перакладзе чалавека з Канады, у чыім «Выгнаньні» былі зьмешчаныя пераклады Іманта Зіедоніса: «Сарока дзяўбла сьнег і плявала аранжава / на пруты брамы з чорнай акацыі, яна сядзела наўзбоч, / навідавоку сярод чорных яблыняў. Зьзяньне дзіўнае / нібы нейкая мігатлівая морская лямпа, якая трымае / сваё сьвятло, патанае ўдзень у каралавай сьвецені, абарваны грэбень пэрлямутру, які то стрымвае, / то рассыпае чырвань і шэрасьць на сядзібу, / што туліцца да попельна-цьмянага неба...» І гэтак далей да канца санэту, першага з чатырох соцень ці каля таго, поўных кірляў, варонаў, малінавак, крумкачоў і г.д. і г.д. І дрэваў. І кожны з датай і месцам, сапраўдны часаслоў. Парыжскі малітоўнік, трэбнік...

Падарожжа сюды ў чацьвер зводзіцца да двух назоваў, Шорам і Эшфард. Усяго толькі назовы, на станцыйных плятформах, больш там нічога й не было відаць — нібы яны ўсплылі з туману. А я тым часам з натугаю спрабую выдабыць з памяці францускія словы, заржавелыя за год, — замест іх выходзяць ірляндзкія, нават цэлыя сказы, а не асобныя словы, якія напрошваюцца падчас гульні ў скрэбл, калі «ня лезуць» ангельскія: *ceo* (туман), *caoi* (шлях), *cnó* (арэх), *croí* (сэрца)... Або радкі, як гэты Шона О Рырдана «*Is mise peaca an Tiarna / á nochtadh aige i bhfaoistin*» (Я — грэх Госпада, / які ён мусіць прызнаць на споведзі)...

Шорам, каля Сэвноўксу, гэта месца, дзе Сэмюэл Палмэр стварыў у сваіх летуценных гравюрах сьвет, формы якога, дрэвы й пагоркі, растуць нібы грыбы (цяпер якраз пара — у мяне Грыбы ня йдуць з галавы!). Я ніколі не заўважала гэтага назову раней, я нават ніколі ня ведала, дзе гэты Шорам. Сьвет Сэмюэла Палмэра жыве на тых бурых пласьцінах пад засеньню (калі вам пашанцавала й яны не схаваныя яшчэ далей ад сьвятла) у Оксфардзкім музэі — або на паштовачных рэпрадукцыях, арыгіналы такія маленькія, што яны выдатна пасуюць для паштовак — любое месца, ня горш за Шорам, магло для каго іншага выглядаць так, як ён яго ўбачыў — аднак назоў застаецца, хутчэй у няпэўным сьвятле 1830-х, чым сёньня праз туман...

Другі назоў — Эшфард. Які я бачыла й раней. У 1943 у Эшфардзе памерла жанчына. У гэтым Эшфардзе ці якім іншым? Эшфард, Кент або Эшфард, Мідлсэкс? Ці гэта было ў Мідлсэкскім шпіталі? Мне часьцей даводзіцца праміналь той другі Эшфард, і я чамусь і заўсёды ў думках зьвязвала яе з гэтай больш экзатычнай мясьцінай. Экзатычнай толькі з майго гледзішча: бо цяжка нават сказаць, каторы з Эшфардаў больш нудны й нецікавы. Яе імя было Сімон Вэй. Угодкі неяк прамінулі ў маўчаньні. Яна нямодна сур'ёзная — не, не сур'ёзная, а *заклапочаная* — рэчамі, якія сёньня здаюцца састарэлымі, узяць хоць бы яе палкую прыхільнасьць да *ўвагі як формы малітвы і непрынцыпае ўяўленьня, «падманнай замены»* (аднак тое, што яна называла ўяўленьнем, Коўлрыдж называў фантазіяй у *супрацьлегласьць* сапраўднаму ўяўленьню!).

«Бачыць сьвет так, быццам бы цябе там няма / каб брудзіць яго», як тое, да чаго імкнулася Фэдра ў Расіна: «Et la mort à mes yeux ravissant la clarté / rend au jour qu'ils souillaient toute sa pureté». Яна шмат для мяне значыла. Значыць і цяпер, але йнакш: цяпер яна прабралася мне пад скуру, я нават не заўважыла гэтай адмысловай жнівеньскай даты... Не было лавіны публікацыяў празь пяцьдзесят гадоў пасьля яе сьмерці (бо ж зьняты абмежаваньні аўтарскага права): яна памерла маладая, і яе нататнікі былі апублікаваныя пасьмяротна. Цікава, што сёньня пра яе думаюць у Францыі? Мне ў Парыжы так ніколі й не ўдалося знайсьці 4-ты том яе нататнікаў...

Чалавек, чый занятак — правяраць білеты, хоча быць паштаром: гэтак кажа ён сам. Ён заахвочвае пасажыраў (амэрыканцаў) аддаць яму свае паштоўкі, ён нават сам купіць маркі — незвычайна паслужлівы! Але мае думкі займае двубой паміж маімі двума назовамі, спрэчка паміж сузіраньнем і міласэрнасьцю. Я пачуваюся значна больш рэлігійнаю сярод некаторых краявідаў, чым у большасьці цэркваў, і ўсё больш неахвотнаю да раздаваньня *дапамогі* налева й направа. Я адчуваю жах, калі людзі *падыходзяць* да мяне не як да мяне, а як да некага, *да любога*, да *аб'екту*. У Лёндане вы ўжо ня здолееце спытацца дарогі, бо вас прыймуць за жабрака або зьбіральніка дапамогі: дапамога сюды, дапамога туды, дапамога як хвароба, што прыносіць больш шкоды, чым дабра — *aids* ("дапамагае"), як сказаў легкадумна адзін мой сябар дзесяць гадоў таму...

І што б вы ні рабілі, спадзеючыся дапамагчы, выходзіць на нішто, калі толькі гэта ня робіцца *канкрэтна й пэрсанальна*: вы ўстанеце няйначай перад Богам, што б вы ні рабілі, ніякіх правілаў паводзінаў ня хопіць, каб вам памагчы... Сімон Вэй дала сабе памерці, каб месьц чыстыя рукі: але ці не хаваецца за яе імкненьнем да чысьціні сярэднявечная апантанасьць катаванай чалавечай плоцьцю?

Францускі цягнік выехаў позна — ці я дарма памяняла гадзіньнік? — і едзе занадта хутка, каб можна было пасьпець прачытаць назовы на цёмнабура-чырвоных плятформах. Апрача аднае станцыі, назоў якое напісаны на сьцяне будынку, што стаіць тварам да ходу цягніка, а не паралельна з рэйкамі, як іншыя. Я толькі пасьпела ўхапіць: Pecquegny? Picquigny?

Пагаварыўшы зь сябрам з Заграбу пра тое, як там ідуць справы (цікава, людзі забываюцца, што яны за 30 міляў ад фронту!), мы падымаемся з станцыі мэтро St Sulpice. І я завязваю наступны вузельчык на насоўцы: тут сьлед, які трэба прасачыць. Афіша «Зімовае Казкі». У перакладзе Іва Бонфуа? А побач: Яго. «О, цнота! Фігавы лісток! Мы ў нас самых ўсю нашу існасьць носім, і наша цела — нібы плодны сад, а наша воля ў садзе тым садоўнік; калі ж мы садзім крапіву з салатай, ісоп заводзім, а цім'ян зрываем...» З сэрыі «*l'esprit libre*», што рэкламуе падарожныя крэдыткі, на іншых прыпынках — «Лісьце Травы» й «Мая Багема» Рэмбо.

Чаму St Sulpice? Таму што ён робіць непатрэбным роздум: дзе пачаць, што рабіць спачатку? Выхад чамусьці ня там, дзе мне здавалася, раней я выходзіла тут толькі таму, каб пайсьці ў другі бок — ва ўкраінскае выдавецтва: царква ўжо відна ў канцы вуліцы, Rue du Vieux Colombier, але на момант ахопленая панікай, я не магу зразумець, зь якога боку мы глядзім на царкву. Але й гэтак ясна, у які бок ісьці, каб трапіць у знаёмыя мясьціны, і так мы выходзім на Rue Madame, я ведаю з «Фальшываманэтчыкаў», што яна йдзе з поўначы на поўдзень і ледзь не датыкаецца Люксэмбурскага Саду, ведаю таксама ад Жака Рэда, майго апошняга гіда ў Парыжы, што на рагу ёсьць *tabac* (і праўда!), які ён зьвязвае з Цынгрыяй, бачачы, што ня мае грошай на марку, бо лісты падаражэлі да 2 франкаў...

Ну вось, мы выбраліся зь лябірынту, які я сама збудавала. Аднак што мяне напраўду зьбянтэжыла, дык гэта чорная дзяўчына, якая сьпявала канты там унізе: было так дзіўна чуць нешта рэлігійнае каля такое масыўнае царквы, выкінутае на бераг цяперашчыны, што я ўжо прамінула яе, калі зразумела, што яна хацела грошай, як тыя людзі ўчора з арабскімі малітвамі над павозкаю з баклажанамі й фігамі. А побач францускія здпаведнікі ангельскіх футбольных хуліганаў (або лепш сказаць вісусаў — нашто ж ужываць ірляндзкае слова для чыста ангельскае зьявы?) крычалі, заглушаючы яе голас: адчувалася, што яна зайшла занадта далёка, занадта небясьпечна сябе выставіла...

І жывыя рэклямы: адна з назовамі фірмаў парфумы й *haute couture* уздоўж хрыбта (Klein, Kookai, Max Mara...), яшчэ адна з кляймом ВІЧ-пазытыў; усё адзеньне *натуральна* шэрае й бурае, «модна / утульна ў сваёй скуры»... і партрэты Эрвэ Гібэра (1955-1991, той самы дзень нараджэньня, што і ў мяне), які сказаў (у сваёй кнізе «Да сябра, які не ўратаваў мне жыцьцё» — Мішэля Фуко), што «AIDS — не хвароба, AIDS проста адчыняе клетку са зьверам унутры вас, выпускае яго на вашыя лёгкія з пнэўмацыстознымі *грыбамі*, за якімі звычайна даглядае імунная сыстэма».

Але ёсьць на гэтым скрыжаваньні, дзе мы п'ем каву, і іншая прысутнасьць. «Зімовая Казка» ў францускім перакладзе Іва Бонфуа, які пачынае нават не адну, а цэлыя дзьве свае кнігі цытатамі зь яе: «Ты знаўся з тым, што адмірае, я — з тым, што пачынае жыць» і «І прамаўляла іхная бязмоўнасьць, і мовай поўнілася іх пастава; яны глядзелі, быццам бы пачуўшы, што сьвет быў зьнішчаны або ўратаваны». Уся яго творчасьць — гэта разважні над *сапраўдным месцам*, *прысутнасьцю*, *скрыжаваньнем*, *парогам*, павабны краявід на заднім пляне карціны, скажам, П'ера дэля Францэска — або больш позьняга пэйзажу Констэбла, *іншага* ангельскага мастака края- і небавідаў, «Дэдэм, бачаны з Лэнгэму»..., чыя «дзівосна пасрэбраная паверхня, нібы лісьцё й вада былі абсыпаныя драбнюткімі кропелькамі ртуці», як непрыхільна выказаўся іншы францускі пісьменьнік, ператвараецца ў праводнае сузор'е, што можа паказацца «ў мглістым люстэрку адзінаццатай гадзіны, / нібы рука, што мые акно даждажом, / колькі простых лічбаў, простых знакаў / што зьзяюць па-за словамі, неразгадальнымі / у нерухомасьці памяці...»

Rue Madame праведзе нас у Люксэмбург міма расейскай букіністычнай кнігарні (з рэклямай грузінскага рэстарана побач зь ёю), дзе гаспадыняю жанчына з прозьвішчам Хмялюк і дзе я аднойчы знайшла адну ўкраінскую кнігу (Зуеўскага, які выкладае ў Канадзе й перакладу Малярмэ) і нават купіла яе, хоць яна была дарагая, тым часам як у іншай расейскай кнігарні, бліжэй да ракі, я ўзяла з паліцы том перапіскі Лесі Украінкі, і ў мяне папрасілі за яе грошай утрая болей, чым было пазначана на вокладцы — я выйшла абураная й таму да сёньня ня ведаю, ці тыя некалькі тамоў Максіма Танка, што стаялі на недасяжнай верхняй паліцы былі ў арыгінале ці ў расейскім перакладзе... Але цяпер я

КАМЕНЬ, ЯКІ РАСЬЦЕ

Працяг са старонкі 13

Няроўным трушком кок зрабіў яшчэ адну кароткую перабежку, але не як той, хто хоча прасунуцца трошкі наперад, а нібыта ўцякаючы ад цяжару, які душыў яго, нібыта спадзеючыся ў руху знайсьці палёгку. Сам ня ведаючы як, д'Ара апынуўся справа ад кока. Ён паклаў яму на сьпіну руку, якая зрабілася раптам бязважкай, і пайшоў побач, дробна й хутка перастаўляючы свае цяжкія ногі. На другім канцы вуліцы насілы з Хрыстом ужо зьніклі, і натоўп, які запоўніў, відаць, усю касьцельную плошчу, здаецца, болей не рухаўся. Кок, якога зьлева й справа супраўваджалі брат і д'Ара, яшчэ некалькі сэкунд трухаў наперад. Неўзабаве яго аддзялала ўсяго пара дзесяткаў мэтраў ад мэры, каля якой, чакаючы, калі ён пройдзе, стаяла купка цікаўных. Але не дайшоўшы, ён зноў спыніўся. Рука ў д'Ара пацяжэла. «Давай, кок, — сказаў ён, — яшчэ зусім трошкі». Але цела ў кока дрыжала, з рота зноў пацякла сьліна, і з усіх пораў струменямі ліў пот. Ён уцягнуў паветра, жадаючы ўздыхнуць як мага глыбей, і спыніўся на месцы. Потым рушыў зноў, ступіў крокі тры, захістаўся. І раптам камень сасьлізнуў яму на плячо, садраў скуру й паляцеў долу, наперад, а кок, страціўшы раўнавагу, паваліўся набок. Тыя, што йшлі сьпераду, падбадзёрваючы яго, з крыкам адскочылі, і адзін тут жа, хуценька, падняў коркавую пракладку, а астатнія кінуліся да каменя, каб зноў ускласьці яго на кока.

Схіліўшыся да яго, д'Ара рукою абцёр яму запэцканае ў крыві й пыле плячо, але небарака ляжаў нерухома, уткнуўшыся тварам у зямлю, і задыхаўся. Ён ужо нічога ня чуў, не варушыўся. І толькі прагна разяўляў рот пры кожным удыху, нібыта гэты ўдых быў апошні. Тады д'Ара абхапіў яго рукамі за торс і адным рыўком, лёгка, падняў, быццам гэта было дзіцё. Ён прыцісьнуў яго да сябе, не даючы зноў упасьці, і, схіліўшыся з вышыні свайго немалога росту, нешта казаў яму ў твар, нібыта жадаючы ўдыхнуць у яго сілу. І нарэшце кок, сьцякаючы крывёй, перапэцканы гразьзю, адарваўся ад інжынэра й разгублена пачаў азірацца. Хістаючыся, ён зноў рушыў да каменя, які астатнія ўжо крыху прыўзьнялі. Але раптам спыніўся; ён глядзеў на камень пустымі вачыма й трос галавой. Потым бязвольна апусьціў уздоўж цела рукі й зірнуў на д'Ара. Па яго змардаваным твары ціха цяклі вялікія сьлёзы. Ён нешта хацеў сказаць, ён казаў, але ў яго вуснах ледзьве складаліся рэдкія словы. «Я паабяцаў»,— сказаў ён. І потым зноўку прамовіў: «Ах, капітан! Ах! Капітан!» Ягоны голас патануў у сьлязах. Тады з-за сьпіны ў яго ўзьнік брат, ён моцна абняў кока, і той, плачучы, пераможаны, прытуліўся да брата, закінуўшы галаў.

Д'Ара глядзеў на яго й не знаходзіў патрэбных словаў. Але раптам ён зірнуў на натоўп, які зноўку азваўся крыкам на другім канцы вуліцы. Тады, нечакана, ён вырваў коркавую пракладку з рук, якія яе трымалі, падышоў да каменя й, знакам паказаўшы астатнім яго прыўзьняць, амаль без намаганьня ўсклаў глыбіну на сваю галаву. Крыху згорбіўшыся пад яе цяжарам, угнуўшы плечы й крыху сапучы, ён стаяў, пазіраючы сабе пад ногі й чуючы кокавы ўсхліпы. Потым ён зрушыў зь месца, неаслабнай, магутнай ступою прайшоў усю адлегласьць, што аддзяляла яго ад натоўпу, і рашуча ўрэзаўся ў яго заднія шэрагі, якія адразу расступіліся перад ім. Пад шалёны грукат званоў і ляскат пэтардаў ён выйшаў на плошчу паміж двух жываплотаў людзей, якія нечакана аціхлі й глядзелі на яго са зьдзіўленьнем. Але ён не замаруджваў хады, упарта пасоўваючыся наперад, і натоўп разыходзіўся, адкрываючы яму

ў грыбную пару

праміняю сп-ню Хмялюк, хоць кнігарня й адчыненая: сёньня мяне больш цікавіць «L'Arrière-Pays» Бонфуа. Не, сярод букіністычных няма, толькі люксусовае перавыданьне за 200 франкаў: давядзецца скарыстаць капіравальны апарат!

Затое цэлыя дзьве паліцы Эрвэ Гібэра за поўцаны і (што дзіўна) цэлая гара «Гісторыі О» Палін Рэаж, клясыкі садамазахізму, паводле маёй энцыкляпэдыі — але пасьля «Літамышльскага могільніку» Карла Піча я па горла сытая пісягамі на адлупцаваных азадках, дзякуй! Я спыняюся каля Аранжэрэі (мой гадзіньнік спыніўся; я слаба яго накруціла) у Люксэмбургу, пры восеньскай выставе яблыкаў і йгрушаў — усе яблыкі тут завуцца вельмі прыблізна *reinette*, ангельская мова можа пахваліцца большай разнастайнасьцю... Яблыкі й ігрушы ў Аранжэрэі. Бонфуа цытуе Рэмбо (rainbow Рэмбо, як кажуць) пра «край, дзе плоць ёсьць плод, які яшчэ вісіць на дрэве».

Чамусьці мне не захацелася заставацца ў Аранжэрэі зь яе параю зморшчаных грыбоў: плады на рынку, ня так па-мастацку ўпарадкаваныя, мусяць быць больш *рэальныя*... Дык — уніз, у бок Rue St André-des-Arts, дзе латкі з баравікамі, сто франкаў за кіляграм... А тады — галерэі ўздоўж Rue de la Seine (у бок ракі, ня ўгору, міма кнігарні «des femmes»), проста разглядаю вітрыны (ужо сьцямнела): асабліва адну, зь ня большымі за паштовую марку мініятурамі катоў і гэтак далей...

На другі дзень, у суботу, ідзе дождж. Цэлы дзень. Стоячы пад аркай у канцы Rue de la Seine, што выходзіць да ракі — нечакана зручнае сховішча, усяго за колькі крокаў ад галерэі зь мініятурамі — я спрабую скласьці разам кавалкі мазаікі. Бонфуа пра Аранжэрэю: «ноч, або памяць пра ноч, напаўняе яе няўлоўным пахам ахвярнае крыві». Аранжэрэя як вынаходка сямнаццатага стагодзьдзя, а значыць сучасьніца Расіна. Маленькая кніжачка Рэда з назовам «Будзьма шчырыя» (вы ўгадалі: я хавалася ў бібліятэцы Пампіду да падманнага супыну дажджу!), пра тое, як пісаць лісты й купляць маркі: наколькі гэта асабістая справа, якіх вясёлкавых эфэктаў можна дасягнуць, залежна ад камбінацыі, нават самымі звычайнымі маркамі, як важна адкуль пасылаць ліст, як купляеш новую сэрыю марак, даўно ўжо кінуўшы пісаць лісты — усё тое, што сказала б і я сама.

Бібліятэка ў Бабуры, між іншым, мае аддзелы, пазначаныя як «беларускі» і «ўкраінскі», але найбліжэйшае, да чаго я магу дабрацца ў першым зь іх, перш чым патанаю ў некалькіх шматтамовых выданьнях выбраных твораў Малышкі, — гэта расейскія пераклады Адамовіча й Броўкі. І ўсё адно беларускай мове пашанцавала больш, чым сучаснай ірляндзкай, якая нават не пазначана як арыгінальная мова. Я думаю пра тое, як Брэндан Біан, п'яны, піша свой верш у арабскай кнайпе на Rue Saint André-des-Arts «былому жаўнеру, расейцу, п'янаму», думаю пра «Лямант пасьля балю» Шона О Эгерты дзесяцьма гадамі пазьней (у Дзень Сьвятога Патрыка, 1958), пра спрэчку ў гатэльным нумары, што гучыць амаль як наша, тыя самыя праблемы з асьвятленьнем (яны ўставілі сьвечку ў бутэльку), пра «дзіўны маленькі востраў зялёных палёў, чые людзі / паўсюль так добра ведаюць, хто яны такія...» (Во, зноў пра тое ж! Комплексы, комплексы! Быццам нейкая жменька вершаў нешта мяняе...)

Альбанскія кнігі, дваццаць ці каля таго толькі аднаго Кадарэ (усе перакладзеныя), цэлы сэзон армянскіх фільмаў... Бедная Ірляндыя! Усяго некалькі кніг паэзіі тысячагадовае даўнасьці. Няма нават Дэры О'Салівана, былога капуцына, які выкладае ў Сарбоне і аднаго разу (згодна з задняй вокладкай яго кнігі «Дзе твой юда [дзьвярное вочка]?») прачытаў лекцыю ў Бабуры; у яго ёсьць верш з назовам «Champignons de Paris», пра тое, як выходзіш з мэтро дажджлівым днём, каб паесьці грыбоў у кнайпе, і бачыш, як цэлы натоўп зьбірае грыбы, жоўтыя сяброўчыны боты-"ўэлінгтоны" (па-ірляндзку гэта гучыць больш нэўтральна, без нагадкі пра пераможца пад Ватэрлоо) пад яе парасонам...

Далей Рэда піша пра мастака, што зваўся Доналд Эванс, які *маляваў маркі:* уяўныя маркі *ўяўных краінаў* (ён, прыкладам, мог выдаць сэрыю зь ілюстрацыямі да «Пяшчотных Гузікаў» Гертруды Стайн), уяўных краінаў з *рэальнымі назовамі* — «як Гленвэй у Ірляндыі». Эванс «узьняў рэальнае да ўзроўню ўяўнага». Мушу прызнацца, што я ні разу ня чула пра Гленвэй, я не знайшла яго ў Паказальніку геаграфічных назоваў, выдадзеным аўтарам «Маленькіх Яблычкаў» з майго перадапошняга эсэ; але, як ні дзіўна, ён ёсьць у кнізе для турыстаў — «амэрыканскі маёнтак з рададэндранамі й азаліямі, які наведваюць гомасэксуалы, у Донэгале». Як дзіўна! Я ведаю донэгальскія краявіды з камянямі, што тырчаць зь зямлі, я неяк нават залазіла на гару, што разьмешчаная нібыта ў гэтым маёнтку. «З рададэндранамі»?! Не, ня можа быць... Мяжа між рэальным і ўяўным мігціць і зьнікае...

Залева амаль мінула. Ці я пазьнюся? Гуд транспарту не дае мне пачуць, ці йдзе мой гадзіньнік. Я пакідаю схованку пад аркай і выходжу на Pont des Arts, дашчаны мост для пешых, пáра, што складала мне кампанію пад аркай, кінулася наўздагон — і апошняя чарада буйных кропляў вымачыла нас траіх да ніткі, але гэта чамусьці падобна на жарт, бо відавочна больш сёньня дажджу ня будзе... Цэлы дзень, цэлы ўчорашні дзень, я чакала *знаку* — і цяпер бачу, што гэта й ёсьць увесь знак, што я здолею атрымаць: змокнуць і плюнуць на гэта. Карціна зь відам Rue Lepic, ціхага кутку Манмартру, упершыню пабачаная ў кнізе «Ані і Манмартр» чалавека, які зваўся Шварц з Мэцу, якую я чытала ў дзяцінстве: там, здаецца, і жыве Бонфуа — а на карціне ранішняя вада цячэ па Rue d'Orchamps (а далей па Rue Berthe, у канцы якой мора? — так гэта выглядае...) Знак ласкі. Хросная вада. Шчодры паток вады, шчодрая ласка. Мы на слушнай дарозе.

І вось я каля вакна нядзельнай раніцай, Нехта захутаны шоргае ўнізе па бруку нашага глухога завулку з сабакам. А сьняданьня ўсё яшчэ няма — пакуль яго не прынясуць, я не магу нават выйсьці на каву! Я выявіла, што Рэда згадвае гэтае месца (амаль што) у нечаканай сувязі: аазіс насупраць — гэта адна зь ліній закінутае чыгункі, якая то тут, то там падае знакі сваёй прысутнасьці ў тунэлях падземкі, а «яе глеба жывіць Бог ведае якія грыбы».

Я зусім заблыталася ў дрэвах і птушках Марто. Як бываюць людзі, што могуць назваць ягады толькі па-фінску або грыбы на якой-небудзь славянскай мове, гэтак і я ніколі ня мела справаў з птушкамі па-француску. Я пазнаю два гатункі чаек, *mouette* і *goéland*, другое зь іх на вялікае дзіва кельцкае слова, валійскае *gwylan*, ірляндзкае *faoileán* (гучаць яны значна падобней, чым пішуцца!) і мяне зносіць удалеч настальгія...

Я хачу пачаць Парыж з другога боку, каб скончыць пад абед у Квакераў на Манпарнасе — узяўшы адпраўным пунктам іншы намёк Рэда. Як зьбіраньне грыбоў. Ідзеш на пах ад аднаго да другога. І пасьля доўгага нічога — раптам цэлая сям'я ў гнілым падлеску... *Café au lait, croissant* — ну, нарэшце!

Гадзіньнік пры выхадзе з мэтро паказаў час на гадзіну адрозны ад майго. Нарэшце ясна, дзе мы ёсьць! Толькі што скончылася імша ў адной з цэркваў Рэда, St Lambert de Vaugirard: я не магла прапусьціць вуліцы Жэрбэра Орыяка, якая выходзіць якраз ад яе. Тады йдзе няведамая тэрыторыя паміж двума арыентырамі: кнігарня «25-я гадзіна» на скрыжаваньні з баравікамі больш чым удвая таньнейшымі, чым у цэнтры, на рагу насупраць, а на другім — *parfumerie* «Капрыс». Я спазьнілася да Квакераў, аднак там адчынена: я мушу зайсьці.

Апошні нумар славутага часапісу, які рэдагуе Рэда (ён піша таксама пра джаз), NRF (Nouvelle Revue Francaise) пачынаецца перакладам яго намесьніцы Дамінік Оры (alias Палін Рэаж, як кажа мая энцыкляпэдыя: на фатаграфіі яна павернутая сьпінаю, а на плячы той самы кот!): «Невядомы твор Осіяна». *Осіяна*?! Осіяна, гэтага прымальнага твару Ірляндыі ў духу «Кельцкага Сутоньня»? Рамантычны болмат для ангельцаў? Сапраўдная паэзія фэніяў сьціслая й дасьціпная, як Гацье, але напісаная ў гэтак званыя (гавораць самі за сябе!) «цёмныя часы»...

Ці ўсё гэта толькі жарт з ангельцаў? Накшталт самога Осіяна/МакФэрсана? Я чытаю колькі радкоў, пасьпешліва адкладаю, хапаю адзін з зборнікаў «казак-мрояў» Бонфуа, *Rue Traversière*, які мне варта было купіць учора (рэч з 25-ае гадзіны!), а разам зь ім ахапак каталёгаў — чалавек пры касе даволі гаваркі. Гібэр, Дэлёз пра Мазоха, з выдавецтва *Minuit*, Поўнач! Новая біяграфія Жэнэ...

Ладная гутарка ў Квакераў, good crack, як кажуць у Паўночнай Ірляндыі, як ні дзіўна, за гэтым ангельскім словам не хаваецца прывід ірляндзкага; яно хутчэй шкоцкае, чым кельцкае — «оживленная беседа» на агульнадаступнай, пераважна з амэрыканкамі, што прыехалі або жывуць у Парыжы. Мне падабаюцца амэрыканцы, мушу прызнацца, хоць, ведама ж, я супраць амэрыканізацыі: у параўнаньні з Парыжам, Лёндан здаецца такой ціхай затокаю, бо мова там занадта блізкая да іхнае — вось Ахілесава пята Эўропы (тым часам як Ірляндыя, што ляжыць якраз *паміж* адным і другім, мае, мабыць, больш прасторы для манэўру...)

А дзень коціцца далей, у мяне ўжо амаль не стае часу згуляць маю апошнюю карту: ад выставы ў Gare d'Orsay, дзе людзі стаяць чаргою, каб паглядзець карціну Сэра з жанчынай, што павярнулася сьпінай, праз дзівосныя выгіны *Rue du Bac* міма Notre Dame des Fleurs? Notre Dame des Champs? да фантану, што ў канцы праспэкту, які вядзе зь Люксэмбургу да абсэрваторыі — лінія, падказаная «Фальшываманэтчыкамі»...

Вельмі вузкая (вельмі старая?) вуліца, з простымі й значна шырэйшымі вуліцамі на скрыжаваньнях: чароўныя сьветлавыя эфэкты на скрыжаваньнях, або калі паглядзець угору, пачуцьцё такое, нібы я ўсплываю ў вузкім канале каб ухапіць глыток паветра, галава круціцца ў дурманлівай зьмене гледзішчаў...

Пасьля ўніз па праспэкце да Люксэмбургу, якраз пасьпяваю ўвайсьці, перш чым паліцыянты зачыняюць яго на ноч (мой гадзіньнік у парадку!), няма ўжо часу затрымацца пры апошнім сьвятле на дрэвах на ўсходзе (разьвітальны падарунак ад Рэда), калі я даходжу да Аранжэрэі, ужо чуюцца іхныя сьвісткі...

На Rue Garancière, якую Рэда рэкамэндуе, каб падыйсьці з тылу да St Sulpice (хоць Servandoni спачатку выглядае больш прывабна), нейкі чалавек без штаноў мыецца пад кранам, а другі (у штанах) бяжыць за аўтам (якое на яго не зважае) з цацачным мядзьведзікам...

Вось і ўсё, што я мусіла адрабіць. Цяпер паспрабую закругліцца. З думкамі, што прыйшлі пасьля.

Томік «La Pésanteur et la Grace» Сімон Вэй быў надрукаваны (на паперы, што ўжо пацямнела, асабліва з краёў) у 1950-м на Rue Garancière.

«Notre Dame des Fleurs» (ня Champs) Жана Жэнэ была напісаная (як кажуць усе) на бурых папяровых мяхох у турме ў 1943-м.

Notre Dame des Champs (ня Fleurs) мае тэатар, які я прамінула, не заўважыўшы, і які (паводле рэцэнзіі чалавека з французскім прозьвішчам, які відавочна яе не чытаў) ставіць п'есу пра Сімон Вэй — пра асобу (больш сьмешна), а не пра містыка.

Ня думаю, што мне захацелася б паглядзець гэтую п'есу. Такая жанчына, як Сімон, або такі хлопец, як Рэмбо, пакідаюць па сабе выключна суворы й патрабавальны масыў творчасьці — і мы засяроджваемся на *іх*, як Дэрэк Джарман на Вітгенштэйне, калі гэта *апошняе, пра што б ім хацелася думаць*, тое, ад чаго яны ўсё сваё жыцьцё імкнуліся ўцячы... — яны самі.

«Notre Dame des Fleurs» (за гэтыя гады я ўсё ж здабыла сабе асобнік гэтае кнігі) згадвае спуск па Rue Lepic, міма бакаў са сьмецьцем, на сьвітаньні. Гэта барокавая экстраваганца, вельмі далёкая ад Расіна — але барока (у Англіі, Цэнтральнай Эўропе і ў іншых краінах) і Расін — сучасьнікі, а Сімонін улюбёнец Джордж Хэрбэрт выглядае зусім іншым паэтам, разьмешчаным гістарычна паміж Данам і Крэшо.

Бонфуа ў сваёй раньняй п'есе «Суд Божы» з кнігі, што я купіла ў «25-й гадзіне», выказвае захапленьне й жах да аскетычнай расінаўскай чысьціні: «Ён бачыў амаль голую Аранжэрэю, якая сталася ягоным домам як нешта дакладнае й неабходнае. Ён бачыў яе, пазбаўленую выпадковых рысаў, як ідэнтычную з самой Ідэяй, чые абстрактныя фразы заўсёды незаўважна гучалі або шапталіся яму ўвушшу».

Прыгледзеўшыся, я бачу скрыжаваньні паўсюль, яны разгортваюцца болей і болей, як множаныя фракталы (яна кажа, выдыгаючы перад модным словам: ці мала было ўжываць яго гадамі!). Як прыемна купацца ў нечай літаратуры! Вершы, апанаваныя абстракцыяй, якой яны імкнуцца супраціўляцца, аскетычная чысьціня, адлюстраваная ў сакрамэнтальнай візіі жыцьця навыварат... Жэнэ, ахоплены роспаччу ў духу Асіянавай мэлянхоліі, супакоены «сярод капяжу з мокрага вецьця й трухленьня мёртвае лістоты». Як (ці наважуся гэта сказаць?) позьнія вершы Арсеньневай, чыя прырода ведае ўваскрослага Хрыста, калі хібіць чалавечы зрок...

шлях да касьцёла. Цяжкая ноша пачынала ўжо раструшчваць яму карак і галаву, але ён глядзеў увесь час на касьцёл і насілы зь фігурай Хрыста, які нібыта чакаў яго на цьвінтары. З кожным крокам ён набліжаўся да гэтай фігуры і ўжо мінуў сярэдзіну плошчы, калі раптам рэзка, сам ня ведаючы чаму, павярнуў улева й, пакінуўшы касьцёл убаку, рушыў у іншым напрамку, прымушаючы паломнікаў, штурхаючыся, зноў расступацца. Ён чуў, як ззаду нехта бяжыць, бачыў, як наперадзе разяўляюцца ў крыку раты. Але ён не разумеў, што ўсе яны крычалі. І толькі адно партугальскае слова, якое паўтаралася з усіх бакоў, здалося яму вельмі знаёмым. У гэтую хвіліну перад ім раптам узьнік Сакрат, які спалохана закаціў вочы й, нешта хутка залапатаўшы, пачаў паказваць назад, на касьцёл, што застаўся ў яго за сьпінай. «Да касьцёла! Да касьцёла!» — менавіта гэта крычаў Сакрат разам з усім натоўпам. Але д'Ара не спыняў імклівай хады. Урэшце Сакрат адступіў, камічна ускінуўшы рукі да неба, і натоўп паступова аціх. Калі неўзабаве д'Ара апынуўся на вуліцы, па якой аднойчы праходзіў з кокам і якая, як ён цяпер ведаў, вяла да барачных кварталаў, з плошчы да яго далятала толькі цьмянае водгульле.

Ён адчуваў цяпер, як ад пакутлівай каменнай ношы ў яго расколваецца чэрап, і яму даводзілася прыкладаць усю сілу сваіх вялікіх рук, каб хоць трошкі яе палегчыць. Але калі ён уступіў на першыя вуліцы, якія на сьлізкім адхоне спускаліся да ракі, яго плечы ўжо цалкам здранцьвелі. Ён спыніўся й прыслухаўся. Ён быў адзін. Тады, паправіўшы камень на коркавай пракладцы, ён асьцярожнай, але яшчэ цьвёрдай ступою рушыў далей да баракаў. Калі ён да іх дайшоў, дыханьне ў яго пачало ўжо рабіцца няроўным, рукі, падтрымліваючы камень, дрыжалі. Ён паскорыў хаду, дайшоў нарэшце да невялічкага пляцу, на якім стаяла кокава хата, пабег да яе, ударам нагі адчыніў дзьверы й адным рухам скінуў камень на сярэдзіну пакоя, дзе яшчэ чырванела цяпельца. І тады, разам выпрастаўшыся на ўвесь свой нечакана вялізны рост і поўнымі глыткамі ўдыхаючы гэты знаёмы яму беспрасьветны водар галечы й попелу, ён адчуў, як у ім падымаецца хваля цьмянай і задушлівай радасьці, якой ён не знаходзіў імя.

Калі ў барак вярнуліся яго жыхары, яны ўбачылі, што д'Ара, заплюшчыўшы вочы, стаіць у глыбіні пакоя, абапершыся сьпінаю аб сьцяну. Па цэнтры, там, дзе звычайна гарэў агонь, цяпер ляжаў камень, напалову прысыпаны попелам і зямлёю. Усе скупіліся на парозе, не ўваходзячы ўсярэдзіну, і моўчкі глядзелі на інжэнэра, нібыта чакаючы адказу на зададзенае імі пытаньне. Але ён маўчаў. Тады старэйшы брат падвёў кока да каменя, і той сеў на зямлю. Брат таксама сеў побач і знакам паклікаў астатніх. Спачатку да іх далучылася старая кабета, а потым і маладая — тая, якую ён бачыў на танцах апошняю ноччу. Але цяпер ніхто не глядзеў на д'Ара. Усе моўчкі сядзелі на кукішках вакол каменя. Скрозь цяжкое паветра да іх далятаў толькі пошум ракі. Стоячы ў прыцемку, д'Ара слухаў, заплюшчыўшы вочы, і водгульле вод напаўняла яго няўцямным шчасьцем. Ён стаяў, не расплюшчваючы павек, і радаваўся сваёй сіле. Ён ізноў радаваўся жыцьцю, якое брала новы пачатак. Старэйшы брат адсунуўся трошкі ад кока, крыху павярнуў да д'Ара галаву й, ня гледзячы на яго, паказаў на вольнае месца: «Сядай побач з намі».

Пераклаў з францускае Зьміцер Колас

Асноўныя публікацыі «НН» у нумарох 11-20

Усяго за гэты час (красавік 1993 — люты 1994) адноўленая «НН» надрукавала каля 170 арыгінальных твораў і допісаў. Да 87-мі нашых аўтараў у гэтых нумарох далучыліся яшчэ 38 (без уліку псэўдонімаў і крыптонімаў):

Гэта Адамовіч Антон, Анісава Клаўдзія, Антонаў Андрэй, Аркуш Алесь, Бартосік Зьміцер, Баршчэўскі Лявон, Брушко Сяргей, Будрайць Язэп, Бушлякоў Юрась, Варатнікова А., Васілеўскі Юрка, Васючэнка Пятро, Верабей Кастусь, Вітушка Сяржук, Георгіева-Козарава Вэнэта, Даўніс Вайдас, Жамойцін Янка, Жураўлёў Павал, Зайка Віталь, Калнін Валянцін, Касьцюшка Аўген, Качаткова Паўліна, Колас Георгі, Літвін Аляксей, Лугавы Яўген, Люкевіч Уладзімер, Мемус Алесь, Пятровіч Барыс, Раманава Ларыса, Рамук Вітаўт, Роўда Марыя, Рыбчонак Сяргей, Санька Сяргей, Сёмуха Алеся, Тарасэвіч Лявон, Хацкевіч Алег, Церашковіч Павал, Шукелойць Антон

ГІСТОРЫЯ, УСПАМІНЫ, АРХІЎ

Абрамчык Мікола
— Лёнданская лекцыя (13)
Дзярновіч Алег
— Ордэн Сьвятой Брыгіты (14)
— Апошнія дні гісторыяграфіі (15)
Калнін Валянцін
— Вучнёўскі сшытак (18)
Літвін Аляксей
— Беларуская Самаахова (13)
Рыбчонак Сяргей
— Радавод Міцкевіча (17)
Сагановіч Генадзь
— Сьмерць палявога гетмана (13)
— «Патрыятычная гісторыяграфія» (14)
— Фрагмэнт ненапісанай кнігі (15)

АНТАЛЁГІЯ, ВАЖНЕЙШЫЯ ПЕРАДРУКІ

— Вэрсэты Ластоўскага (17)

ГУТАРКІ Ў РЭДАКЦЫІ

Лявон Тарасэвіч. Паміж культуровасьцю й мастацтвам (15)

Язэп Будрайць. Чалавек, які ходзіць па вуліцы (16)

А.Адамовіч пра В.Ластоўскага (17)

С.Шупа — Ф.Жюжо. Француcкі погляд на Эўропу зь Вільні (20)

ПРОЗА, ЭСЭ, НАТАТКІ

[...]
— Шляхціц Завальня. Прадмова да 4-га беларускага выданьня (14)
— Краіна-восень (15)
[...]
— Лаўка ў старым садзе (17)
Аблажэй Алег
— Фрагмэнты месяцовае ночы (11)
— Дваццаць збаноў (13)
Арлоў Уладзімер
— Мой сябра Вова Цымэрман (14)
— Няхай жывуць гановэрскія вароны (16)
Бабкоў Ігар
— «Менская опэра» (18)
Бартосік Зьміцер
— У глыбокім тыле патэнцыяльнага суседа (15)
— 10 гадоў наперад (19)
Варатнікова А.
— Заходні альбом (18)
Глёбус Адам
— Жахі (11)
— Трохкутнік (12)
— Наважыўся, а не зрабіў (15)
— Гісторыя ката (16)
Качаткова Паўліна
— Лясное (20)
Кватоўскі Севярын
— Дасканалыя Моманты Рэчаіснасьці (19)
Невядомы Аўтар
— Вахцёр (11)
Паўлоўскі Сяргей
— Чужы (17)
— Чорнае й белае (18)
Пхоў С.
— У цішыні начы (13)
Пятровіч Барыс
— Шызы паўзмрок (18)
Роўда Марыя
— Вырві гэта зь мяне (17)
Рэшткові Тодар
— Паліталёгія ў рытме сьцёбу (19)
С.Ш.
— Аб крывічох (19)
Сіюль Антон
— Забыты юбілей. Рэканкіста (11)
— 1863 (12)
— Круглая дата (13)
— Сны (15)
— Пра ідэалы (16)
— Камагена (17)
Шыдлоўскі Сяргей
— Пакахаць, паланіць, забіць... (19)

ВЕРШЫ

Аркуш Алесь
— Разьвітаньне з Танталам; Табе; *** На душы супакой, восень зьвіла кубло... Мой пакой; У гасьцёх (19)
Бабкоў Ігар
— *** Вера паэтаў, птушкай сьляпою сядае на рукі... (15)
— *** Ноч быццам кубак здрады (18)
З.К.
— Санэт № 16 (13)
— Санэт № 17 (14)
— Санэт № 21 (19)
Ніцка Хведар
— *** Гадзіньнік спыніўся. У хісткім сутоньні... *** Бязмоўная пустка. Як сьветла й бяздонна... ***. Ну вось і адзін я ў бэтонных квадратах... Вятрак (12)
— *** Пустэльня навокал... (14)
— Пята; *** Я змантачыў усё абы дзе... На Золку; *** Праз шквал неразьбярыхі... *** Калі жыцьцё нашчэнт зглее... Патоп (16)
— Гравюра; Досьвед (18)
Раманава Ларыса
— Вершы 1990-га году (13)
Т.С.
— *** Ня намі закладзены гэты маркотны парадак... (12)
Сапач Таццяна
— *** Мы крочым праз вострыя брамы... (16)
Сільнова Людка
— Трыптых (18)
Хацкевіч Алег
— Песьня герояў Слуцкага збройнага чыну; Беларускі вальс; Ля помніка генэралісімусу Сувораву; Птушка шчасьця (11)

ПЕРАКЛАДЫ

Бадлер Шарль
— Да чытача (з франц. Алег Мінкін і Севярын Кватоўскі) (20)
Бжэхва Ян
— Помста (з поль. Алег Мінкін) (12)
Борхес Хорхэ Луіс
— Наш бедны індывідуалізм (з гішп. SS) (12)
— Дзевяць дантаўскіх эсэ (з гішп. SS) (15)
Віян Барыс
— Сюрпрыз-вечарынка ў Лебіля (з франц. SS) (16)
Галчынскі К.І.
— Віленскія элегіі (з поль. Алег Мінкін) (19)
Гётэ Ёган Вольфганг
— Пакліканьне бусла (зь ням. В.С.) (16)
Данта Аліг'еры
— Боская камэдыя (зь італ. Алег Мінкін і С.Шупа) (15)
Джойс Джэймс
— Арабія (з анг. Сяргей Шупа) (18)
Камэндант Тадэвуш
— Alien (17)
Камю Альбэр
— Камень, які расьце (з франц. Зьміцер Колас) (20)
Карпіновіч Аўром
— Дзівосная тэорыя Прэнцыка-шаўца (зь ідыш Віталь Зайка) (19)
Кёно Раймон
— Вершы (з франц. Зьміцер Колас) (20)
Мілаш Оскар
— Фрагмэнты (з франц. Сяргей Шупа) (20)
Павіч Міларад
— Хазарскі слоўнік (з сэрбскахарв. Х.З.) (13)
По Эдгар Алан
— Сэрца падказвае (з анг. Юрась Бушлякоў) (11)
— Чорны кот (з анг. Юрась Бушлякоў) (15)
Пэтрарка Францэска
— Санэт CCCLII (зь італ. Лявон Баршчэўскі) (18)
Растоўскі Роланд
— Малы віленскі апакаліпсіс (зь літ. U2) (15)
Рыч Вера
— Рэцэпт цуда (18)
Страцієў Станіслаў
— Загадкавая славянская душа (З баўг. Вэнэта Георгіева-Козарава) (11)
Стус Васіль
— *** Зноў згадка: вечар, вецер і туга... (з укр. Алег Мінкін) (14)
Хэрбэрт Зьбігнеў
— Каля брамы даліны (з поль. Алег Мінкін) (17)
Эко Умбэрто
— На жаль, мусім вярнуць вам ваш рукапіс... (зь італ. АА) (13)
Шульц Бруна
— Вуліца Кракадзілаў (з поль. Юз.) (14)

РЭЦЭНЗІІ

А.Д.
— *(Г.Галенчанка. Францыск Скарына...)* (11)
— *(Я.Юхо. Кароткі нарыс гісторыі і права Беларусі)* (11)
— *(І.Грыгаровіч. Беларуская іерархія)* (12)
— *(Беларускі гістарычны часопіс)* (13)
— *(Грамадзкі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі)* (13)
— *(Б.Манак. Насельніцтва Беларусі...)* (13)
— *(Б.Гурскі. Як збудаваныя і чым багатыя нетры Беларусі; Природная среда в Республике Беларусь...)* (13)
— *(Беларуская мінуўшчына)* (14)
— *(А.Цітоў. Пячаткі старажытнай Беларусі)* (14)
— Рэквіем па Белрэстаўрацыі (19)
А-к
— *(С.Астравец. Янычары)* (12)
— *(Д.Бічэль-Загнетава. Божа мой, Божа)* (12)
Аглядальнік
— Чаканьне Лады *(А.Антончык. Чаканьне Лады)* (11)
— *(Анталёгія бел. паэзіі)* (12)
— Энігма *(М.Танк. Выбраныя творы)* (13)
— Пасьля бунту *(С.Адамовіч. Зямля Ханаан; А.Аркуш. Крылы ператворацца ў карэньні; Ю.Гумянюк. Водар цела)* (14)
— Аптымістычная загадка *(Czesław Miłosz. Szukanie ojczyzny)* (16)
— Антонім *(Калосьсе)* (18)
— Жыцьцё прэзыдэнта *(Р.Жук-Грышкевіч. Жыцьцё Вінцэнта Жук-Грышкевіча)* (19)
Адольф
— Некаторыя вартасьці вершаў былога вартаўніка *(І.Бабкоў. Solus Rex)* (20)
Антон
— Кароль Разанаў *(Белы замак на гары)* (16)
Архіварыюс
— *(Л.Карповіч, Л.Казыра. Англа-беларускі слоўнік...)* (12)
— *(С.Суднік. Кароткі расейска-бел. вайсковы слоўнік; А.Стасевіч, С.Варыўцкі. Кароткі расейска-бел. фізыялягічны слоўнік; А.Глушко, А.Стасевіч, А.Бокун. Расейска-бел. хімічны слоўнік)* (14)
— *(У.Радкевіч, Л.Вардамацкі, А.Ляшко. Біялягічная тэрміналёгія і намэнклятура)* (14)
— На дзьвюх мовах *(Курапаты)* (20)
Бронскі М.
— Эўрапейцы *(Richard Hill. «We Europeans»)* (з поль.) (16)
Грэчыц Ян
— *(История Европы)* (15)
— *(Русские. Этносоциологические очерки)* (15)
— *(дэ Мабли Габриель Бонно. Об изучении истории)* (15)
— Кніжка з мапай *(М.Спиридонов. Закрепощение крестьянства Беларуси...)* (17)
— Героіка *(S.Ekdahl. Jono Dlugošo «Prūsų vėliavos»...)*; (18)
— Усяго 200 гадоў пасьля падзелаў *(Славяноведение)* (18)
— Яшчэ ня ўсё крыніцазнаўства *(Тэзісы міжнар. навукова-тэарэтычнай канфэрэнцыі)* (20)
— Кніга скарбаў *(Archäologische Schätze aus Litauen)* (20)
— Кніжка мараў *(О.Субтельний. Україна: історія)* (20)
Гудбай Алесь
— Пляц няволі *(Н.Гілевіч. Выбар; С.Законьнікаў. Беларускае сэрца)* (20)
— «Але лотас паўстаў як сьцяна...» *(А.Тулупава. Я чакаю цябе; Л.Паўлікава. Купаньне ў росах)* (20)
Жамойцін Янка
— В.Іваноўскі ў люстэрку гісторыі *(J.Turonek. Wacław Iwanowski i odrodzenie Białorusi)* (16)
Зьніклы
— Нулявая катэгорыя *(Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь)* (18)
І.Б.
— «Упаўшыя на зямлю Бачаць хворае неба» *(Мае песьні табе дару; М.Лукша. Замова; Я.Чыквін. Кругавая Чара; Кєракс Беларускі; Н.Артымовіч. Сэзон у белых пэдзажах)* (17)
Крыт.
— Сымболіка грэху (19)
— Жаданьне перакуліць аўтамабіль (19)
Люкевіч Уладзімер
— Пра Беларусь *(J.Darski. Białoruś)* (20)
Мілаш Чэслаў
— Нацыяналізм і балты *(A.Lieven. Baltic Revolution...)* (з поль.) (18)
Нацыяналіст
— Праект другога выданьня *(А.Кулагін. Адраджэньне готыкі)* (15)
— Межы *(А.Кушнярэвіч. Культавае дойлідзтва Беларусі...)* (19)
Нацыяналіст
— Беларускае адраджэньне паводле Джойса *(Д.Джойс. Уліс)* (18)
П.В.
— Пра тое, як я чытаў прозу Дранька-Майсюка *(Л.Дранько-Майсюк. Пра тое як я...)* (11)
С.Д.
— *(В.Быкаў. Сцюжа)* (11)
Стывэн Д.
— Жыцьцё бяз паўзаў *(А.Казлоў. І тады я памёр)* (18)



— Мой сябра Луі Арагон *(З францускай і бэльгійскай паэзіі; Эсхіл. Прыкуты праметэй; Сафокл. Антыгона; С.Вальеха. Чорныя геральды)* (18)
— Сьмерць караля (І) *(І.Багдановіч. Вялікдзень)* (19)
— Сьмерць караля (ІІ) *(Калідор: вершы паэтаў)* (19)
— Галасы з пустога пакою *(С.Алексіевіч. Зачараваны сьмерцю)* (20)
Фр.Эн.
— Жыцьцё ad marginem *(В.Казько. Выратуй і памілуй нас, чорны бусел)* (17)
— Дыскурс самоты *(А.Кірвель. Човен Харона)* (19)
Фундамэнталіст
— Апошняя савецкая энцыклапэдыя *(Архітэктура Беларусі)* (16)
— Савецкія інсэкты *(J.Augustauskas. In the World of Insects)* (17)
Школьнік
— Фразіалагічаскій славар *(І.Лепешаў. Фразэалягічны слоўнік беларускай мовы)* (20)
Эстэт
— Івейскі алтар *(W.Łoziński. Sztuka Lwowska...)* (19)

АРТЫКУЛЫ Й ТЭЗЫСЫ

Александравічус Эгідыюс
— За нашу і вашу волю... (зь літ.) (11)
Васілеўскі Юрка
— Іда Чырвань. З жыцьця літаратурнага пэрсанажа (20)
Даўніс Вайдотас
— Месца онталягічнай праверкі. Тры своасьці Вільні (зь літ.) (12)
Дзярновіч Алег
— Да сымболю Менску (18)
Кебік Алесь
— Матэматыка Цьвікевіча (14)
— Людзьмі звацца (16)
Колас Георгі
— Рудабельскі генатып (19)
Коцур Міхал
— Матрыманіяльная поза (з поль. А.С.) (14)
Марон Мэва
— Паштоўка з Ўінчэстэру (14)
— Ад апэльсінаў да маленькіх яблычкаў: амаль нечытэльныя нататкі ў аўтобусе на Чэплізод (16)
— З затокі Марлоў, травень 1959 (18)
— Ліст са скрыжаваньня ў Мэнільмантане ў грыбную пару (20)
Мілаш Чэслаў і Венцлава Томас
— Жалігоўскі й здані мінуўшчыны (з поль.) (14)

На моўным фроньце: Корнуэл. Шатляндыя. Брэтань (з анг. BKZ) (17)

Паўлоўскі Сяргей
— Беларускі парадак (12)
С.П.
— У пошуках страчанага імя. 2 (11)
Санька Сяргей
— «Балцкая тэма» (14)
Сіюль Антон
— Стары хрост (14)
— Таемнае памкненьне (18)
Сэр Пітэр
— Братняя магіла (з анг. BKZ) (12)
Францішак Эн.
— Багушэвіч і бяздомнасьць (17)
Церашковіч Павал
— «Чужыя» і «свае» ў этнічных стэрэатыпах (11)
— Паўднёва-заходні сэпаратызм (16)

ВІЛЕНСКІ КЛЮБ

Пасад. Гутарка ў рэдакцыі віленскага часопіса «Krantai» (12)

Тры эсэ пра Зарэчча (Зь літ. BKZ) (19)

АПЫТАНЬНІ

Алесь Ас.
— «Я хацеў бы зьнікнуць бясьсьледна...» (18)

Стракзінае вока (17)

ДОПІСЫ, ПАВЕДАМЛЕНЬНІ, РЭФЛЕКСІІ

А.Б.
— Астралёгія Драздовіча (20)
Анісава Клаўдзія (19)
Верабей Кастусь (20)
Жук-Грышкевіч Раіса (19)
Касьцюшка Аўген
— Пра падарожжа ў Смаленск (14)
Кватоўскі Севярын
— Пра Б. (17)
Ларыса Т.
— Пра Бога (17)
«НН»
— Ад Рэдакцыі (19)
Наваўленец (20)
Прускі Алесь
— Ода радасьці (20)
Прысутны
— Угодкі Ластоўскага ў Вільні (17)
Рамук Вітаўт
— Ялінка ў Чыкага (19)
Рэдакцыя
— Напад на супрацоўніка «НН» (19)
Тутэйшы чытач
— Што беларускага чытаюць у Літве? (11)
Шыдлоўскі Сяргей
— Адраджэньне й канкіста (11)
— Пра экумэнізм (17)
Яновіч Сакрат
— Пра «Нашу Ніву» (15)

ТАПАГРАФІІ

Вітушка Сяргей
— Пававерка (11)
— Гаспадар зь вёскі Юшкі (12)
— Што сьпявалі ў Адамчуках? (14)
— Якая ўласьць — такая й масьць (16)
—Ваўчыныя сьцежкі (20)

«ВОСЬ СЫМБАЛЬ ТВОЙ, ЗАБЫТЫ КРАЮ РОДНЫ!»

Саподзька Тытус
— Lacerta apythana (13)
H.S.
— Несапраўдны кніжны скарпіён (14)
— Pelecanus onocrotalus (19)

ДЗЁНЬНІК ПРЫВАТНАГА ЧАЛАВЕКА (11-20)

ІЛЮСТРАЦЫІ

Адамчык Алена. Здымкі (11-20)
Брушко Сяргей. Здымкі (12)
Глёбус Адам. Малюнкі (18)
Жураўлёў Павал. Здымкі (20)
Кляшчук Анатоль. Здымкі (11-14)
Крыштаповіч Алесь. Здымкі (19)
Лугавы Яўген. Малюнкі (18)
Паўлоўскі Сяргей. Здымкі (19)
Прускі Алесь. Здымкі (19)
Раманюк Дэніс. Малюнкі (11, 12, 17-20)
Харэўскі Сяргей. Малюнкі (11-19)

НАША НІВА №2(20) Беларуская газэта. Заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991. Рэдактар Сяргей Дубавец. Выдавец Павал Жук. Адрасы для допісаў: 2041 Вільня а/с 2082 і 220182, Менск а/с 71. Падпісны індэкс у Літве: 67233, на Беларусі: 63125. Рэдакцыя (Вільня, Жыгімонта 12/2): Алег Мінкін (адк. сакратар), Сяргей Шупа (літ. рэдактар), Сяргей Харэўскі (маст. рэдактар). Менскае бюро (Менск, Іванаўская 56): Алег Дзярновіч (загадчык), Ігар Бабкоў (дыскурс). Рэдакцыйная Рада: Уладзімер Арлоў, Сяргей Астраўцоў, Адам Глёбус, Лявон Луцкевіч, Генадзь Сагановіч, Алесь Чобат. Афсэтны друк. Фармат А3. Агульны наклад 20 тыс. Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом Друку» (220041 Менск, праспэкт Ф.Скарыны, 79) Замова 285

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12